СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе і I квартал 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	10120	30360	60720
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9570	28710	57420
63858 (ведамасны)	16170	48510	97020
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	14740	44220	88440

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

26 ЛІСТАПАДА 2008 г.
СЕРАДА
№ 223
(26336)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

АБВАЛУ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ НЕ БУДЗЕ

Прэзідэнт краіны ўчора на пасяджэнні з актывам Віцебскай вобласці шчыра падзякаваў экс-губернатара Уладзіміра Андрэйчанку за тое, што ён кіраваў рэгіёнам амаль што 14 гадоў. «За гэты час заваяваў высокі аўтарытэт і давер людзей», — адзначыў Прэзідэнт.

Што датычыцца прызначэння на гэтую высокую пасаду Аляксандра Косінца, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ён выбраў менавіта яго кандыдатуру са спісу ў паўтара дзясяткаў прэтэндэнтаў, улічваючы цэлы рад фактараў. Аляксандр Косінец добра ведае Віцебскую вобласць — тут нарадзіўся і вырас, атрымаў адукацыю, вопыт прафесійнай і кіраўніцкай дзейнасці. Добра ведае людзей, усе плюсы і мінусы рэгіёна. Некалькі гадоў быў упаўнаважаным прадстаўніком кіраўніка дзяржавы ў рэгіёне. Таму без доўгіх раскачак на азнаямленне з рэальнай сітуацыяй зможа ўзяцца за справу. Па-другое, ён прайшоў добрую школу рэспубліканскага ўзроўню кіравання, працуючы намеснікам прэм'ер-міністра. Гэта значыць, не будзе «зашораны» месніцтвам, адарванасцю ад агульнарэспубліканскіх праблем і задач.

«І па-трэцяе, прама скажу, мне імпануе стыль работы Аляксандра Мікалаевіча», — сказаў Прэзідэнт. — «Валявы, жорсткі, патрабавальны, нацэлены на вынік».

Аляксандр Лукашэнка акрэсліў недахопы і недапрацоўкі, што тармозяць развіццё рэгіёна. У прыватнасці, у вобласці не выконваюцца эканамічныя паказчыкі па экспарце паслуг, абмежаванні імпарту, па вытворчасці прамысловай прадукцыі прадпрыемствамі рэспубліканскага падпарадкавання. Не дасягнуты прагнозны паказчык па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Таму галоўная задача — бяспрэчнае выкананне ўсіх прагнозных паказчыкаў гэтага пяцігоддзя.

Са стратамі ў цэлым па вобласці спрацавалі 80 суб'ектаў гаспадарання. У тым ліку 50 прамысловых прадпрыемстваў, альбо 18,4 працэнта ад агульнай колькасці...

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Віцебшчыне трэба дабівацца большай дынамікі і эфектыўнасці работы ў такіх галінах, як нафтахімія, энергетыка, машынабудаванне, камунікацыі, інтэлектуальныя паслугі. Слаба выкарыстоўваюцца ўнікальныя прыродныя магчымасці рэгіёна для развіцця турызму.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў цэнтры ўвагі павінны быць людзі. «Мы павінны забяспечыць дастойныя сацыяльныя стандарты ва ўсіх сферах для жыхароў як горада, так і вёскі», — падкрэсліў ён. — «Новыя тэхналогіі, сучасныя вытворчасці — гэта добра, але за імі трэба бачыць чалавека. Настаў час болей энергічна займацца ўсім, што звязана з жыццём, бытам, культурай і дабрабытам нашых людзей».

Аляксандр Лукашэнка спыніўся і на кадравым пытанні: «Кіраўніцтву вобласці неабходна болей настойліва ўплываць на паляпшэнне якаснага складу кадраў. У гар(рай)выканкамах, пасялковых і сельскіх выканаўчых камітэтах амаль што 20 працэнтаў работнікаў не маюць вышэйшай адукацыі».

«У органах улады не павінна быць хабарнікаў, махінатараў і іншых перараджэнцаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў факты карумпаванасці, учыненне злачынстваў службовымі асобамі Віцебскай вобласці. «Самая агідная з'ява — гэта карупцыя сярод тых службовых асобаў, якія абавязаны змагацца з гэтым злом і спыняць яго», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі дадаў, што кіраўнік павінен служыць узорам паводзінаў як на вытворчасці, так і ў быце. «Тым не менш распіццё спіртных напояў і знаходжанне ў нецвярозым стане — яшчэ нярэдкія сярод кіраўніцкага корпуса», — канстатаваў беларускі лідар. Ён нагадаў, што сёлета за 9 месяцаў за такія парушэнні ў Віцебскай вобласці звольнены 20 кіраўнікоў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць выправіць справы ў ільнаводстве. На Віцебшчыне вырошчваецца амаль трэць рэспубліканскага аб'ёму лёну. А вынікі? Дрэнныя нават сёлета, з добрымі ўмовамі надвор'я. Прэзідэнт упэўнены, што рэгіён павінен мець накіраваную малочна-мясную спецыялізацыю. Слаба развіта жывёлагадоўля мясных парод буйной рагатай жывёлы. Застаецца нізкай удойнасць статку ў параўнанні з сярэднім паказчыкам па краіне.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, «на жаль, сёння эфектыўнасць гаспадарчай дзейнасці АПК вобласці вельмі нізкая». У сярэднім на гаспадарку прыпадае Br7 млрд даўгоў, пры гэтым сярэднямесячная выручка ад рэалізацыі прадукцыі складае толькі каля Br320 млн.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў рэалізацыі Віцебскай абласной праграмы адраджэння і развіцця вёскі не ўсё добра: са 148 заданняў не выканана 25. Найбольш істотнае адставанне ў вытворчасці раслінаводчай прадукцыі.

«Звяртаю ўвагу на такую перспектыўную для вашага рэгіёна культуру, як рапс, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Ваша задача — давесці гадавую валавую вытворчасць насення рапсу да 160 тыс. тон да канца гэтага пяцігоддзя». Прэзідэнт таксама адзначыў нізкую эфектыўнасць выканання праграмы развіцця вытворчасці плодаагароднінных кансерваў. Вытворчыя магутнасці па іх выпуску ў вобласці загружаны толькі на 33 працэнты.

«Я ўжо не раз гаварыў, што самае галоўнае ў рэалізацыі праграмы адраджэння і развіцця вёскі не знешні бляск вёсак, а высокаэфектыўная вытворчасць, укараненне найноўшых тэхналогій, самаакупнасць і самафінансаванне», — рэзюмаваў беларускі лідар.

«Вобласць не павінна замыкацца толькі на валаўтваральных гігантах. Устойлівае паступальнае развіццё залежыць і ад работы малых і сярэдніх прадпрыемстваў», — сказаў Прэзідэнт.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Дзевяцікласніца Марыя ДРОЗД — лепшы нападаючы мінскай гімназіі № 25 — працягвае футбольныя трэніроўкі ў любое надвор'е.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пасля пісьма

«І ні страхі цяпер, ні каровы»

Пад такім загалоўкам у нумары за 5 лістапада быў змешчаны ліст сп. Фенчука з п. Мірны Баранавіцкага раёна. У ім наш пастаянны падпісчык паведамляў аб тым, што ў доме, дзе жыве (прычым не толькі яго сям'я!) каторы год працякае дах. З просьбай яго адрамантаваць кватэраздымшчыкі не раз звярталіся ў розныя інстанцыі, нешта рабіць спрабавалі і самі, але далей абяцанняў справы не пайшлі...

У раённым выканаўчым камітэце (як паведаміў рэдакцыі намеснік старшыні сп. Грыцкевіч) публікацыя «Звязды» разгледжана. Дом знаходзіцца на балансе сельгаспрадпрыемства ЗАТ «Шчара-Агра». У выніку працяглай эксплуатацыі (дом пабудаваны ў 1977 годзе) у дахавым крыцці яго ўтварыліся трэшчыны, страха часткова разбурана і вільгаць трапляе ў кватэры верхняга паверха.

Бягучы рамонт даху не раз праводзіўся, але праблемы гэта не вырашыла...

На пачатку лістапада 2008 года спецыялізаваная арганізацыя выканала абследаванне даху і прыйшла да высновы, што ён патрабуе капітальнага рамонту. Каштарысны кошт работ 56 941 000 рублёў, прычым выканаць іх можна толькі пры плюсавых тэмпературах.

Кіраўніцтвам ЗАТ «Шчара-Агра» прынята рашэнне ў тэрмін да 01.01. 2009 года выканаць бягучы рамонт даху, а да 01.08.2009 года — капітальны з пункта заменай мяккага дахавага пакрыцця і сцяжкі.

Трэба спадзявацца, што гэтыя абяцанні будуць выкананы.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
28 лістапада 2008 г. у 16.00
у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу першая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТРЫ ГАДЫ ЗА ПАДБУХТОРВАННЕ ДА ДАЧЫ ХАБАРУ

У момант атрымання хабару начальнік штаба грамадзянскай абароны і надзвычайных сітуацый Мінскага завода Кастрычніцкай рэвалюцыі быў затрыманы на месцы злачынства аператыўнай групай упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Мінску і Мінскай вобласці.

Віна падазронай асобы была поўнасцю даказана падчас следства. Начальнік штаба падбухторваў заснавальніка сталічнай камерцыйнай структуры да дачы хабару службовым асобам завода ў памеры 2,5 тысячы долараў за станоўчае вырашэнне пытання аб арэндзе памяшкання на тэрыторыі прадпрыемства. На самай жа справе начальнік штаба не толькі не збіраўся садзейнічаць гэтаму працэсу, але і не меў магчымасці вырашыць такое пытанне. Проста планаваў авалодаць грашовымі сродкамі шляхам злоўжывання даверам. Суд Ленінскага раёна г. Мінска прызнаў віну памянёнай асобы ў падбухторванні да дачы хабару і авалоданні маёмасцю шляхам падману і прызначыў пакаранне ў выглядзе трох гадоў абмежавання волі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«АМНІСТЫЯ» НА ЎВАХОДНЫЯ ЗВАНКІ ДЛЯ ЗАБЫЎЛІВЫХ КЛІЕНТАЎ

Крок насустрач сваім кліентам зрабіў «Белтэлекам». Для таго, каб абаненты заставаліся на сувязі, нават калі забыліся ўнесці своечасова плату за стацыянарны тэлефон, прынята рашэнне прапускаць да абанентаў уваходныя званкі яшчэ на працягу 30 дзён з дня ўтварэння запазычанасці. Раней, нагадаем, пры ўзнікненні запазычанасці адключалася адначасова і ўваходная, і зыходная сувязь. А праз месяц, у выпадку непагашэння запазычанасці, абанент пазбаўляўся тэлефоннага нумара.

Новы падыход будзе дзейнічаць са снежня гэтага года. На практыцы гэта будзе выглядаць наступным чынам. Апошні дзень аплаты стацыянарнай сувязі за лістапад — 25 снежня. Калі 25 снежня плата не паступае, аўтаматычна ўтвараецца запазычанасць за тэлефон. У абанента адключаецца зыходная сувязь (ён не зможа патэлефанаваць са свайго тэлефона), але яму пакідаюць магчымасць прымаць званкі. Калі праз 30 дзён, гэта значыць да 24 студзеня, аплата за тэлефон па-ранейшаму не будзе ўнесена, абанента пазбавяць тэлефоннага нумара.

У тых жа выпадках, калі ўладальнік стацыянарнага тэлефона вымушаны выехаць са свайго населенага пункта на працяглы час, ён можа ўнесці авансавы плацеж у памеры штомесячнай абаненцкай платы на тую колькасць месяцаў, якую ён плануе адсутнічаць.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«НАПРАЦАВАЎ» НА 353 МЛН?..

Пракуратурай Гомельскай вобласці па матэрыялах управління па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі УУС узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да 37-гадовага мясцовага жыхара.

Падазроны, які займае адказную пасаду на вытворчым камбінаце РУП «Гомельтранснафта «Дружба», як мяркуецца, у сакавіку гэтага года сваімі дзеяннямі нанёс значны ўрон прадпрыемству: яго сума ацэньваецца ў 353 мільёны 400 тысяч рублёў.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

ПРАЙШОЎ СКРОЗЬ СЦЯНУ

Бо зламыснік яе праламаў. У будынку магазіна вёскі Стараселле Рагачоўскага раёна, дзе забраў розных тавараў на два мільёны рублёў. І ніхто яму не перашкодзіў: ні вартаўніка там няма, ні ахоўнай сігналізацыі.

Калі не з'ем, дык пакусаю — паводле такога, відаць, прынцыпу дзейнічаў нейкі хуліган у Петрыкаве. Красці дэкаратыўную жалезабетонную агароджу ў цэнтры горада ён не адважыўся, а вось разбіць яе — калі ласка. У выніку 10 ніжніх і восем верхніх секцый той агароджы аказаліся пашкоджанымі. Шкоднік будзе знойдзены, заявілі ў міліцыі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Попыт на дарагую зямлю ў сталіцы мінімальны

Сёння Мінскі гарадскі цэнтр нерухомасці запланаваў правесці адкрыты аўкцыён па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць у элітным мікраране сталіцы, але... таргі не адбыліся.

На аўкцыён выстаўляліся два зямельныя ўчасткі, размешчаныя ў раёне малапавярховай забудовы ў межах праспекта Пераможцаў — праезду Дразды — р. Свіслач для будаўніцтва аднакватэрных (блакавых) жылых дамоў. Зямельныя ўчасткі плошчай каля 9 сотак мелі першапачатковы кошт больш за 500 млн рублёў кожны.

Спецыяліст сталічнага цэнтра нерухомасці паведаміў карэспандэнту, што аўкцыён не адбыўся ў сувязі з тым, што на таргі была пададзена толькі адна заяўка. Эксперт цэнтра тлумачыць мінімальную актыўнасць патэнцыяльных пакупнікоў прэстыжных зямельных участкаў тым, што багатыя кліенты ў час разгортвання хвалі сусветнага фінансавага крызісу вырашылі крыху пачакаць, калі дарагая зямельная нерухомасць патаннее. Магчыма, што ў айчынных доларавых мільянераў сёння проста няма дастатковай колькасці свабодных грашовых сродкаў, а пазычыць іх цяпер стала праблемай. Камерцыйныя банкі ў апошні месяц пачалі прапанаваць крэдыты пад набыццё прыватнай нерухомасці толькі ў невялікіх аб'ёмах.

Нагадаю, што яшчэ летам адзін падобны зямельны ўчастак у Драздах быў прададзены ў прыватную ўласнасць фізічнай асобе амаль за 500 тысяч долараў, калі першапачатковы кошт зямлі быў перавышаны ў разы.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УГА ЧАВЕС ЗАЯВІЎ ПРА МАГЧЫМАСЦЬ НОВАГА РЭФЕРЭНДУМУ АБ ПАДАЎЖЭННІ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ПАЎНАМОЦТВАЎ

Сацыялістычная партыя Венесуэлы разгледзіць магчымасць арганізацыі рэферэндуму па пытанні аб тым, каб дазволіць прэзідэнту займаць свой пост неабмежаваную колькасць разоў. З такой заявай 25 лістапада выступіў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес.

Чавес ужо прапаноўваў павялічыць тэрмін паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы з шасці да сямі гадоў і адмяніць абмежаванні на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў. Адпаведныя канстытуцыйныя папраўкі былі вынесеныя на рэферэндум 2 снежня 2007 года, аднак тады грамадзяне Венесуэлы іх не падтрымалі.

АПУБЛІКАВАНЫЯ ДЗВЕ НОВЫЯ ФАТАГРАФІІ КІМ ЧЭН ІРА

Афіцыйныя СМІ Паўночнай Карэі апублікавалі дзве новыя фатаграфіі лідара дзяржавы Кім Чэн Іра. Публікацыя суправаджалася паведамленнямі аб тым, што кіраўнік КНДР, якога шматлікія эксперты лічаць цяжка хворым або памерлым, наведаў два заводы.

Дакладнай даты візіту карэйскія СМІ не прыводзяць, аднак паведамляюць, што Кім Чэн Ір аданіў поспехі, якіх прадпрыемствы дасягнулі па стане на канец кастрычніка 2008 года. На фота кіраўнік КНДР апрануты ў паліто і цёмныя акуляры.

Чуткі пра хваробу або смерць паўночнакарэйскага лідара з'явіліся ў сусветных СМІ пасля таго, як ён перастаў з'яўляцца на публіцы ў жніўні 2008 года. Увосень кіраўнік Паўночнай Карэі не наведаў нават урачыстасці з нагоды найважнейшых дзяржаўных святаў — дзён заснавання камуністычнай партыі краіны і самой КНДР.

ЗША ЛІЧАЦЬ, ШТО УКРАІНА ГАТОВАЯ ЎСТУПІЦЬ У НАТА УЖО ЦЯПЕР

З пункта гледжання Вашынгтона, Украіна ўжо цяпер гатовая далучыцца да альянсу, заявіў пасол ЗША ва Украіне Вільям Тэйлар. У сувязі з гэтым прадастаўленне краіне Плана дзеянняў па атрыманні членства ў НАТА «неактуальнае», цытуюць дыпламата інфармагенцтвы.

У БРАЗІЛІІ НЕБЫВАЛЫЯ ЛІЎНІ ВЫКЛІКАЛІ ПАВОДКІ І АПОЎЗНІ: 65 ЗАГІНУЛЫХ

У Бразіліі расце колькасць загінулых і пацярпелых у выніку праліўных дажджоў, якія не спыняюцца вось ужо 50 дзён.

Яны выклікалі на поўдні краіны паводкі і апоўзні, і менавіта з абвалам зямлі звязана большасць выпадкаў смерці людзей. Паводле апошніх афіцыйных звестак, у пацярпелым штаце Санта-Катарына загінулі 65 чалавек, 43 тысячы пазбавіліся жылля. Усяго падчас стыхіі пацярпелі 1,5 мільёна жыхароў. У штаце абвешчана надзвычайнае становішча.

Біяграфія КОСІНЦА Аляксандра Мікалаевіча

Фота БЕЛТА.

Косінец Аляксандр Мікалаевіч нарадзіўся ў 1959 годзе ў в. Роскі Сялец Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1982 годзе скончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, у 2007 — магістратуру эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць».

З 1980 па 1994 год працаваў у Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце: клінічным ардынатарам, асістэнтам, дацэнтам кафедры шпітальнай хірургіі. У 1995—1997 гадах узначальваў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Інфекцыя і хірургія». У 1997—2005 гадах — рэктар Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта.

Да назначэння ўказам № 642 ад 24 лістапада 2008 года старшынёй Віцебскага аблвыканкама займаў пасаду намесніка прэм'ер-міністра Беларусі.

А.М. Косінец — вядомы вучоны, практыкуючы хірург. Вызначаецца вялікай патрабавальнасцю, высокімі дзелавымі якасцямі.

ДЭПУТАТЫ ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА САВЕТА ЗАЦВЕРДЗІЛІ АЛЯКСАНДРА КОСІНЦА НА ПАСАДЗЕ СТАРШЫНІ АБЛВЫКАНКАМА

Дэпутаты Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў зацвердзілі кандыдатуру Аляксандра Косінца на пасаду старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Як адзначыў, прадстаўляючы гэту кандыдатуру, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей, Аляксандр Косінец добра вядомы ў вобласці, ведае яе кадравы і вытворчы патэнцыял. «Гэта сталы кіраўнік, працаўнік і прагматык», — сказаў ён. У Аляксандра Косінца вялікі вопыт кіраўніцкай работы, ён мае свой пункт гледжання і ўмее яго адстойваць, ён забяспечыць пераемнасць у кіраўніцтве вобласці і ўнясе новае ў работу, упэўнены Уладзімір Макей.

Выступаючы перад дэпутатамі абласавета, Аляксандр Косінец вызначыў асноўныя задачы, якія стаяць перад выканаўчай вертыкаллю вобласці. На яго думку, неабходна перагледзець падыходы да арганізацыі дзейнасці аграпрамысловага комплексу, пераходзіць на спецыялізацыю па вырошчванні і вытворчасці сельгаспрадукцыі, паскорыць тэхнічнае пераазнашчэнне гэтай галіны. «Неабходна адрадзіць былую славу прамысловасці Віцебскай вобласці», — адзначыў Аляксандр Косінец.

Ён занепакоены выкананнем у рэгіёне праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Далейшая яе рэалізацыя ў многім будзе залежаць ад вырашэння сацыяльных праблем, а для гэтага неабходна забяспечыць рост заработнай платы, павялічыць будаўніцтва жылля.

БЕЛТА.

Тавараабарот Беларусі і Масквы ў 2009 годзе можа павялічыцца на 20 працэнтаў

Аб гэтым паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі па выніках пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Масквы.

Ён адзначыў, што для гэтага ёсць неабходныя перадумовы, распрацаваны канкрэтныя меры па выкананні намечаных задач. Акрамя таго, бакі ўжо прыйшлі да сумесных інавацыйных праектаў у розных сферах.

Прэм'ер-міністр Беларусі таксама адзначыў, што ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу важна «не страціць узаемныя тавараныя патокі і забяспечыць іх грашовымі патокамі, выбудаваць давер плацяжоў».

Тавараабарот Рэспублікі Беларусь з Масквой у студзені—верасні 2008 года склаў $4344,3 млн і павялічыўся ў параўнанні з адпаведным перыядам 2007 года на 43,5 працэнта, у тым ліку экспарт беларускіх тавараў у Маскву — $2283,7 млн (на 17,9 працэнта больш), імпарт з Масквы — $2060,6 млн (на 89 працэнтаў больш). Сальда знешняга гандлю склалася дадатнае ў памеры $223,1 млн.

БЕЛТА.

Мінсувязі заклікае ўказваць поўны фармат набору нумара ў СМІ і даведніках

У сувязі з ростам колькасці абанентаў сетак сотавай рухомай электрасувязі аператары электрасувязі пачалі выкарыстоўваць новыя занальныя коды 033 і 044. «У мэтах змяншэння колькасці «лжывых» званкоў па прычыне памылкавага набору нумара Мінсувязі звяртае ўвагу на абавязковае ўказанне поўнага фармату набору нумара пры абмене нумарамі тэлефонаў з сябрамі і калегамі, а таксама пры размяшчэнні нумароў тэлефонаў у сродках масавай інфармацыі, даведніках», — праінфармавалі там.

У міністэрстве патлумачылі, што поўны фармат набору нумара — гэта нумар тэлефона з указаннем занальнага кода. Так, для абанентаў РУП «Белтэлекам» у Мінску — 8 017XXXXXXX, дзе 017 — занальны код Мінска (кожны горад і раён у рэспубліцы мае свой код), XXXXXXX — нумар абанента; для абанентаў ІП «Вэлкам» — 8 029XXXXXXX або 8 044XXXXXXX; СТАА «МТС» — 8 029XXXXXXX або 8 033XXXXXXX; ТАА СП «БелСел» — 8 029XXXXXXX; для абанентаў ЗАТ «БеСТ» — 8 025XXXXXXX.

Кар. БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

082233

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.11.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 153,00
1 еўра	2 767,36
1 латвійскі лат	3 902,84
1 літоўскі літ	801,49
1 чэшская крона	108,92
1 польскі злоты	719,04
1 расійскі рубель	78,60
1 украінская грыўня	323,76

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	27,3913
10 UAH	35,2416
1000 BYR	12,7877
EUR	41,5020

Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.11.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Арэнда жылля

ПАТАННЕННЕ ПРАГНАЗАВАЛАСЯ, АЛЕ НЕ АДБЫЛОСЯ

Днямі мне патэлефанавала сяброўка са сталіцы Украіны і падзялілася сваёй праблемай аб тым, як быццам бы на пустым месцы істотна знізіўся даход яе сям'і. А справа датычыцца патаннення жыллёвай арэнды...

У свой час Кацярына атрымала ў спадчыну невялікую аднапакаёвую кватэру ў спальным мікраране Кіева. Яшчэ тры месяцы таму яна здавала яе менеджару фінансавай кампаніі за 420 долараў. Потым сусветны фінансавы крызіс гэту кантору «з'еў», і сяброўка пачала здаваць памяшканне ў арэнду будаўнікам з Малдовы, але... Фінансаванне камерцыйнага будаўніцтва значна скарацілася, і гастарбайтары былі вымушаны шукаць працу ўжо ў іншым горадзе. Цяпер Кацярына здае сваю кватэру іншагароднім студэнтам ужо за 320 долараў.

ГАСПАДАРЫ ЖЫЛЛЯ ЗАВАГАЛІСЯ, АЛЕ ВЫСТАЯЛІ

Для жыллёва-эканамічных тэндэнцый міждзяржаўныя межы — не заўсёды перашкода. Менавіта так меркавалі мінскія рыэлтары, але памыляліся. Сапраўды, яшчэ месяц таму, калі долар пачаў умацоўвацца, гаспадары «лішніх» кватэр спачатку занервавaліся і нават крыху знізілі цэннікі арэнды, але... Паводле інфармацыі **начальніка аддзела арэнды жылля агенцтва «Час пік» Сяргея КАДОЛЫ**, сёння нават самыя слабенькія па якасці аднапакаёвыя кватэры гаспадары жылля здаюць за 250 долараў плюс квартплата. Тут трэба адзначыць, што такое адносна танное жыллё або абавязкова патрабуе касметычнага рамонту, або за яго патрабуюць перадаплату за 3—6 месяцаў. Сярэдні кошт аднапакаёвак у спальных раёнах складае 300 долараў, а вось стандартныя кватэры недалёка ад лініі метро здаюцца ўжо за 320—350 долараў. Не вельмі прывабныя двухпакаёвыя кватэры ў новабудоўлях Фрунзенскага раёна без мэблі ці ў Заводскім раёне і Шабанах магчыма яшчэ адшукаць за 300 долараў плюс квартплата. Сярэдні кошт стандартных двухпакаёвак у спальных раёнах сталіцы складае 350 долараў плюс камуналка. Побач з метро такія кватэры прапануюцца ўжо не танней чым за 400 долараў і абавязкова аплата камунальных паслуг. Цяпер цэннік арэнды трохпакаёвых кватэр пачынаецца з 400 долараў плюс квартплата, але сустракаюцца выключэнні. У зусім новых мікраранах, дзе амаль не існуе сацыяльнай інфраструктуры, вялікія па плошчы трохпакаёвыя кватэры карыстаюцца мінімальным попытам, бо квартплата прасторнага жылля ўжо істотна б'е па кішэні. Такія трохпакаёўкі прапануюцца кватарантам часам і за 350 долараў плюс аплата камунальных паслуг.

СТАБІЛІЗАЦЫЯ ПРАЦЯГНЕЦЦА МІНІМУМ ДА НОВАГА ГОДА

Рынак арэнды прыватнага жылля цяпер знаходзіцца ў стадыі раўнавагі попыту і прапанавання. У агенцтвах — каля 10 рэальных па кошце варыянтаў кватэр усіх якасных катэгорый. Невялікая колькасць прапаноў толькі па трохпакаёвых кватэрах, але і попыт на такое жыллё сёння мінімальны.

Сяргей Кадол адзначыў, што прыкметай апошняга часу стала тэндэнцыя, калі вялікія па плошчы двухпакаёвыя ці трохпакаёвыя кватэры пачалі здымаць адразу некалькі сем'яў. Другой «фішкай» здачы ў арэнду кватэр напрыканцы лістапада стала тое, што ўладальнікі «лішніх» квадратных метраў пачалі патрабаваць абавязковую перадаплату за 2—3 месяцы. Гэта робіцца для таго, каб не атрымалася так, што кватэра здымаецца вясёлай кампаніяй выключна для святкавання Новага года, пасля якога фіктыўным кватарантам яна ўжо не патрэбная. Такія выпадкі не аднойчы сустракаліся летась. Сёлета ўласнікі кватэр на гэту вуду ўжо не трапяць.

Эксперты сталічнага рынку арэнды жылля былі ўпэўненыя, што эмацыянальны ціск з боку сусветнага фінансавага крызісу хутка паўплывае на цэннікі элітнага і арэнднага жылля. Аднак сапраўды элітнага жылля ў Мінску сёння не хапае, і яно было не вельмі дарагім у параўнанні з іншымі сталіцамі суседніх еўрапейскіх дзяржаў. Сёння **ў цэнтры сталіцы** аднапакаёвая кватэра з сучаснай мэблярай каштуе мінімум 450 долараў плюс квартплата, цэннік двухпакаёўкі пачынаецца з 500 долараў, а трохпакаёвая кватэра пасля еўрарамонту з усёй неабходнай бытавой тэхнікай прапануецца не танней чым за 700—800 долараў.

Сапраўды ў апошні месяц спецыялісты агенцтваў нерухомасці прымаюць здымаць прадпрымальнікі і спецыялісты фірмаў з Расіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі, работнікі з Украіны і Кітая. Улічваючы факт стабільнага попыту з боку гастарбайтараў, гаспадары стандартных і якасных кватэр будуць трымаць цэннік арэнды на сённяшнім узроўні і надалей. Сяргей Кадол упэўнены, што мінімум да лютага арэнднае жыллё ў Мінску не патаннее.

Сяргей КУРКАЧ.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Уга Чавеса з перамогай Адзінай сацыялістычнай партыі на выбарах у Венесуэле

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса з пераканаўчай перамогай Адзінай сацыялістычнай партыі на рэгіянальных выбарах у Венесуэле. Уга Чавес з'яўляецца лідарам названай партыі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НАЙДЖЭЛ ДЭВІС: ВЫНІКІ ФОРУМУ ПЕРАЎЗЫШЛІ ЎСЕ ЧАКАННІ

Учора ў рамках міжнароднай практычнай канферэнцыі па прыцягненні інвестыцый ва ўмовах развіцця глабальнага фінансавага і эканамічнага крызісу, якая адбылася ў Мінску, пасол Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў нашай краіне Найджэл Гулд Дэвіс даў сваю ацэнку папярэднім вынікам Беларускага інвестыцыйнага форуму ў Лондане.

Ён павіншаваў усіх прысутных з паспяховым правядзеннем першага такога форуму ў Вялікабрытаніі. Форум стаў выдатнай магчымасцю прадэманстраваць сябе як цікавага, адказнага і перспектыўнага патэнцыяльнага партнёра, з якім варта мець справу шырокаму колу міжнародных інвестараў. Па словах пасла, вынікі форуму пераўзышлі ўсе чаканні. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі больш чым 40 краін. Напярэдадні адкрыцця форуму адна з самых уплывовых эканамічных газет свету лонданская «Файнэншл Таймс» прысвяціла Беларусі чатыры свае старонкі. У цэлым Найджэл Дэвіс выказаў задаволенасць тым, што Беларусь выбрала месцам правядзення свайго форуму менавіта Лондан.

У многім дзякуючы паспяховай рабоце ў сталіцы Вялікабрытаніі, на думку пасла, Беларусь сёння, нягледзячы на цяперашнюю складаную эканамічную і фінансавую сітуацыю ў свеце, адчувае на сабе ўвагу сур'ёзных і перспектыўных інвестараў. А гэта якраз тое, што трэба вітаць, сказаў Найджэл Дэвіс. Ён, у прыватнасці, высока ацаніў ход і змест перамоў прэм'ер-міністра Сяргея Сідоркава ў Лондане з патэнцыяльнымі партнёрамі, работу іншых членаў беларускай дэлегацыі ў парламенце і на іншых важных сустрэчах. Правядзенне Беларускага інвестыцыйнага форуму ў Лондане, на погляд пасла, гэта толькі пачатак шырокага прасоўвання эканамічных інтарэсаў нашай краіны за мяжой.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Урад і Нацбанк Беларусі растлумачылі імпарцёрам парадак атрымання дазволу на авансавыя плацяжы

Урад і Нацыянальны банк Беларусі растлумачылі парадак правядзення плацяжоў па знешнегандлёвых дагаворах, якія прадугледжваюць імпарт тавараў. Адпаведны дакумент размешчаны на сайце Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У растлумачэнні сказана, што рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя дзяржарганізацыі, падпарадкаваныя ўраду, павінны разглядаць на падставе зваротаў падпарадкаваных (уваходзячых у склад) імпарцёраў патрэбнасць у правядзенні авансавых плацяжоў (папярэдняй аплаты) па імпарту, аказваць метадалагічную дапамогу і садзейнічанне ў перазаключэнні знешнегандлёвых дагавораў, забяспечваць заключэнне новых знешнеэканамічных дагавораў на ўмовах правядзення плацяжоў па факту пастаўкі тавараў, перадачы ахоўнай інфармацыі, выключных правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, выканання работ, аказання паслуг. Папярэдняя аплата камандзіровачных расходаў ажыццяўляецца без прадастаўлення хадайніцтваў і атрымання дазволу Нацыянальнага банка на правядзенне адпаведных плацяжоў.

БЕЛТА.

ВАЙНА Ў ФАРБАХ

Адным з аўтараў знакамітага сатырычнага ваеннага выдання «Раздавім фашысцкую гадзіну» быў гамяльчанін Віталь Букаты. Яго карыкатуры, вершы і дзённікі зараз можна пабачыць у новай экспазіцыі Гомельскага палаца-паркавага ансамбля.

Вайна, аказваецца — гэта не толькі адступленні і наступленні, паражэнні і перамогі. Не толькі слёзы, гора, адчай і нянавісць. Не толькі пералічэнне аперацый і ўзнагарод, атрыманых за мужнасць. Гэта яшчэ і мастацтва. У гэтым пераконвае выстава пад назвай «Творчасць, апаленая вайной», прысвечаная 65-годдзю вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Менавіта на вайне людзі знаходзілі хвілінкі, каб свае думкі зарыфмаваць у радкі, каб зрабіць партрэтныя замалёўкі сяброў, якія засталіся, магчыма, апошнімі выявамі людзей. Подпісы пад малюнкамі вельмі лаканічныя: «Оля», «Міша». Але ж, магчыма, хтосьці пазнае знаёмыя рысы сваіх родзічаў — удзельнікаў партызанскага атрада, што ўваходзіў у склад брыгады «Большавік». На выставе прадстаўлены творы самадзейных мастакоў — П. Гвоздзева, К. Лебедзева, В. Аксамітава, а таксама сапраўдныя дакументы часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Малюнак К.І. ЛЕБЕДЗЕВА «Вызваленне Гомеля Чырвонай Арміяй».

Загадчыца аддзела па зборы музейных матэрыялаў і экспазіцыйнай дзейнасці дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палаца-паркавы ансамбль» Ганна Кузьміч расказвае, што ў фондах знайшліся і акварэлі, зробленыя нямецкімі ваеннапалоннымі, якія пасля вайны працавалі на аднаўленні будынкаў. Між іншым, Гомель у канцы лістапада 1943 г., пасля вызвалення, быў разбураны на 80 працэнтаў. Заставаўся цэлым адзін знакаміты «Дом камуны». Астатнія будынкі, у тым ліку помнікі архітэктуры другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзяў, былі часткова або поўнасцю разбураныя. У межах мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 65-й гадавіны вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пройдуць цырымоніі перапахавання астанкаў невядомага салдата на Навабеліцкіх брацкіх могілках, адкрыцё мемарыяльнай дошкі на будынку школы № 16...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Не забыць баявыя справы «Слаўнага»

Незвычайны ўрок правялі для вучняў ваенна-патрыятычных класаў сярэдняй школы № 3 абласнога цэнтра супрацоўнікі ўпраўлення КДБ Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці. Гэта, як паведаміла нам прэс-група, быў урок мужнасці, прысвечаны атраду спецыяльнага прызначэння НКУС «Слаўны».

Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны (у тым ліку былы баец «Слаўнага» Аляксей Піманаў), ветэраны органаў дзяржаўнай бяспекі, вучні вышэйпамянёнай школы і школы вёскі Курганне наведалі месцы баявых дзеянняў спецатрада і месцы пахавання яго байцоў, якія загінулі ў Рагачоўскім раёне. Атрад быў сфарміраваны ў лютым 1942 года ў Маскве, яго ўзначаліў старшы лейтэнант (а потым капітан, маёр) дзяржбяспекі Анатоль Шастакоў. У яго запісаліся добраахвотнікі, вядомыя спартсмены краіны...

У лютым таго ж года спецатрад на лыжах выйшаў у тыл ворага і за 30 месяцаў, 15 з якіх ён знаходзіўся на Браншчыне і 15 — на тэрыторыі Гомельскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей (дарэчы, у Беларусі ён падпарадкоўваўся ўжо НКДБ БССР) яго байцы разграмілі 23 гарнізоны ворага, учынілі 85 дыверсій на чыгунцы і шашы, іншых аб'ектах, знішчылі некалькі тысяч фашыстаў... У баях з карнікамі і пры выкананні баявых заданняў загінула 80 дэсантнікаў «Слаўнага». Пахаваныя часткі іх знаходзяцца ў вёсках Каменка Рыскаўская і Перахоп на Рагачоўшчыне. Ветэраны і школьнікі на ўроку мужнасці ўсклалі вянкі да іх магіл.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НАЦЭЛІЎСЯ НА ДЗЕСЯЦЬ МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ?

Вестка аб тым, што ў чарговай латарэі «Гамяльчанка» галоўным выйгрышам з'яўляецца дзесяць мільёнаў рублёў, не давала спакою 22-гадоваму жыхару горада Хойнікі, які ўжо зведаў раней лаву падсудных. Былі, апроч таго, у яго намеры і на больш буйны выйгрыш па латарэі «Суперлато». Адным словам, замахнуўся хлопец на многае, спадзеючыся на халяву. Таму не купіў білет, а ўкраў яго са століка распаўсюджвальніка РУП «Нацыянальныя спартыўныя латарэі». Аператыўнікі хутка ўстанавілі асобу зламысніка.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЦЫГАРЭТ НЯМА І МАШЫНУ ЗАБРАЛІ

На прапускным пункце «Пясчанка» Брэсцкай мытні праходзіла праверку аўтамашына жыхаркі г. Мінска.

Супрацоўнікі мытнага кантролю вырашылі «абмацаць» «Додж Караван» і знайшлі тайнік, у якім была схаваная партыя імпартных цыгарэт.

І засталася жанчына без цыгарэт і аўтамашыны — канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: АБВАЛУ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ НЕ БУДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў рэгіёне ў першым паўгоддзі гэтага года з 306 запланаваных праектаў з аб'ёмам капіталаўкладанняў Br255 млрд не пачалася рэалізацыя практычна па кожным трэцім з іх. «Трывожыць тое, што ў шэрагу малых гарадоў рэгіёна зніжаюцца аб'ёмы вытворчасці прамысловай прадукцыі спажывецкіх тавараў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што эканоміка малых гарадоў (гэты статус у Віцебскай вобласці маюць 40 населеных пунктаў) павінна стаць прыярытэтам у рабоце кадраў Віцебшчыны на бліжэйшыя гады.

Паводле слоў Прэзідэнта, арганізацый з узроўнем заработнай платы, ніжэйшым за $200, у малых і сярэдніх гарадах быць не павінна.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным больш актыўна ўкараняць эканамічныя метады кіравання, стымуляваць прыток інвестыцый, скарачаць расходы і зніжаць сабекошт прадукцыі, пашыраць рынкі збыту тавараў і паслуг.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што самая галоўная задача — безумоўнае выкананне ўсіх прадгнозных паказчыкаў гэтага пяцігоддзя. Таму неабходна працаваць больш эфектыўна і мэтанакіравана.

«Скажу адкрыта — зрабіць гэта будзе няпроста. Асабліва з улікам сітуацыі, што складваецца ў свеце. Час патрабуе ад кожнага найбольшай адказнасці, энергічнасці і настойлівасці ў дасягненні пастаўленых мэтаў. Ад гэтага залежыць дабрабыт як канкрэтных працоўных калектываў, так і ўсёй краіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што перавага мадэлі развіцця Беларусі дае магчымасць у значнай ступені нейтралізаваць негатыўны ўплыў сусветнага фінансавага крызісу на эканоміку. «Аднак мы не можам адгарадзіцца «жалезнай заслонай» ад гэтых з'яў і павінны ўлічваць іх у сваёй рабоце», — сказаў ён.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу абвалу беларускага рубля не будзе.

«Што датычыцца беларускага рубля, то сітуацыя абсалютна стрымальная. Сёння важна падтрымаць курс беларускага рубля. Яго абвалу не будзе, усё — у зададзеных параметрах, у тым ліку і гадавая дэвальвацыя», — падкрэсліў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў краіне назапашаны пэўныя рэзервы, да таго ж вялікі давер насельніцтва да банкаўскай сістэмы.

Прэзідэнт таксама сказаў, што МВФ пазітыўна ацэньвае працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі. Пры гэтым дзяржава прыслухоўваецца да ўсіх заўваг МВФ.

«Мы зробім усё, што датычыцца людзей, і ў першую чаргу будзем арыентавацца на іх», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Пошук лідараў і вылучэнне таленавітых людзей на кіруючыя пасады павінна быць прыярытэтам дзяржаўнай кадравай палітыкі.

Паводле слоў Прэзідэнта, вострымі застаюцца праблемы забеспячэння вёскі кваліфікаванымі работнікамі. Нават сярод галоўных спецыялістаў толькі 58 працэнтаў маюць вышэйшую адукацыю. Шмат маладых спецыялістаў выбывае з сельгасвытворчасці пасля абавязковых тэрмінаў адпрацоўкі. «Гэта патрабуе больш уважлівых адносінаў да іх умоў працы і быту, штодзённых патрэб, забеспячэння жыллём», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на тое, што, нягледзячы на рост забяспечанасці ўрачэбнымі кадрамі, многія штатныя адзінкі замяшчаюцца за кошт сумяшчальніцтва. «Размова не ідзе аб жорсткіх мерах па забароне «падпрацоўкі» ўрачоў на іншых пасадах або аб адмове ад вопытных работнікаў, у якіх узрост вышэйшы за пенсійны. Неабходны прадуманыя абнаўленні складу кадраў у мэтах аказання якаснай медыцынскай дапамогі насельніцтву», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным лібералізаваць усе сферы жыцця.

«Мы павінны разняволіць чалавека, лібералізаваць наша жыццё, зрабіць яго больш свабодным для чалавека, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта вельмі важна ў складаны сітуацыі». Так, пры сур'ёзных праблемах у эканоміцы (у сярэдзіне 1990-х і ў час дэфолту ў Расіі ў 1998 годзе) прымаліся такія рашэнні, якія рабілі эканамічныя адносіны больш свабоднымі, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, неабходна забяспечыць прастор у эканоміцы, «каб людзі маглі больш аператыўна і свабодна дзейнічаць, каб іх нічога не скоўвала».

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што сваёй галоўнай задачай ён лічыць забеспячэнне правоў чалавека. «Абараняць правы людзей на дастойную зарплату, на тое, каб свабодна жыць і гаварыць тое, што чалавек думае, — вось галоўная задача Прэзідэнта. Аб гэтым усе мы павінны памятаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што за ўсімі размовамі аб эканамічных паказчыках нельга пра гэта забываць. «У вырашэнні гэтых пытанняў мы, я сказаў бы, папарадзе ўсяго свету. Але ў нас яшчэ столькі недахопаў, якія закранаюць жыццё людзей, што аб гэтым проста цяжка гаварыць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў выканання ўсіх дзяржпраграм у поўным аб'ёме.

Кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным перагледзець усе праграмы і мерапрыемствы, якія намячаліся раней, з улікам дынамічнага развіцця краіны. Паводле яго слоў, сёння «неабходна «падціснуцца» і за тыя грошы, што ёсць, выканаць усё, што было запланавана».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго насцярожвае дзейнасць прадпрыемстваў, якія больш купляюць, чым прадаюць. «Калі сёння мы эканомім валюту і складана завезці імпарт, асабліва не крытычны, то гэта на руку: мы сваё пакладзём на прылавак», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Трэба рабіць усё, што мы можам зрабіць, унутры краіны», — дадаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што сур'ёзная сітуацыя, якая склалася ў свеце, у меншай ступені закранула Беларусь з пункту гледжання фінансавых гульняў на біржы. Але ў той жа час сёння вельмі цяжка экспартаарыентаваным прадпрыемствам, складана рэалізоўваць прадукцыю, таму што попыт у свеце ўпаў. Нягледзячы на ўсё гэта, галоўная задача — захаваць прадпрыемствы і рабочыя месцы, не дапусціўшы той сітуацыі, якая была пасля развалу СССР.

Паводле слоў Прэзідэнта, з'явіліся прагнозы, што будучы год будзе складаны, але для многіх дзяржаў ён стане часам уздыму, выхаду з крызісу. «Будзем спадзявацца, што мы не адстанем у гэтых адносінах, таму што ў нас ёсць вялікі вопыт дзеянняў у складаных сітуацыях», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле паведамленняў Аляксандра ПУКШАНСКАГА і БЕЛТА.

ПАЗІТЫЎНЫЯ ЗМЯНЕННІ Ў АДНОСІНАХ БЕЛАРУСІ І ЕС

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначае пэўныя пазітыўныя змяненні ў адносінах Беларусі і ЕС, якія адбываюцца апошнім часам. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў у інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Франс-Прэс».

«Я, перш за ўсё, хачу сказаць, што наша знешняя палітыка аптымальная на сённяшні дзень. Гэта шматвектарная знешняя палітыка. Яна выходзіць з месцарасмяшчэння нашай краіны. Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы немагчыма праводзіць аднавектарную палітыку, накіраваную толькі на ўсход, на захад, на поўнач або на поўдзень. Але, тым не менш, мы не ставім нейкія глабальныя перад сабой задачы. Мы не збіраемся вырашаць нейкія суперстратэгічныя пытанні планетарнага характару і не маем на гэта рэсурсаў. Мы дакладна ведаем і ўяўляем сваё месца ў гэтым узаемазалежным свеце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт растлумачыў, што перш за ўсё гэта нармальныя адносіны з нашымі суседзямі, Расійскай Федэрацыяй, у сілу таго, што беларусы і расіяне практычна адзін народ. «І высокатэхналагічны Захад зусім побач», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы, што амаль палавіна знешняга гандлю Беларусі прыпадае на краіны Еўрасаюза.

«Мы ж не прэтэндуем на вырашэнне нейкіх глабальных пытанняў. Нам трэба забяспечыць палітычнымі метадамі наш эканамічны складальнік. У сілу гэтага мы павінны размаўляць з Еўропай, мы павінны весці дыялог з Расійскай Федэрацыяй, паколькі мы жылі ў адной дзяржаве», — сказаў ён.

«Мы не з'яўляемся іншаземцамі ў Расіі, яны ў нас таксама не іншаземцы. Таму ў гэтых адносінах, выходзячы з нашай гісторыі, мы будуем нашы адносіны з Расійскай Федэрацыяй, вельмі цесныя, але не супраць некага, не ва ўрон камусьці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Але паколькі ўсё ж другім крылом мы абапіраемся на Еўрапейскі саюз, мы хацелі б мець адпаведны дыялог і з Еўропай. Апошнім часам мы бачым некаторыя парасткі гэтага дрэва, і гэта нас радуе», — сказаў ён.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Расія мае вялікія энергарэсурсы, у ЕС — свой рэсурс, перш за ўсё, тэхналагічны. «А ў нас рэсурс якраз той, што мы з'яўляемся мостам паміж імі, і гэта немалы рэсурс для любой дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Таму мы хацелі б, выкарыстоўваючы гэты рэсурс, адыгрываць адпаведную ролю і адпаведна несці адказнасць за свае функцыі тут пры пастаўках энерганосьбітаў з Расіі ў Еўропу, пры пастаўцы грузаў з Еўрапейскага саюза ў Расію і наадварот. І я не думаю, што Еўрапейскі саюз або Расія могуць прад'явіць нам у гэтай частцы нейкія прэтэнзіі. Мы ў гэтым плане вельмі рухомыя, таму што гэта мае для нас значэнне. Гэта не толькі наш імідж, гэта і вялікая эканоміка», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Вы думаеце, што мы не можам весці такую знешнюю палітыку, нармальна размаўляючы і з Расіяй, і з Еўрапейскім саюзам? Я вам скажу, што мы нават абавязаны гэта зрабіць. Таму што Еўропе тут неспакойная краіна не патрэбна», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў: «Чвэрць прыроднага газу і трэць нафты ідзе праз Беларусь у Еўропу. Таму мы не можам сябе паводзіць інакш. І Еўропа павінна быць зацікаўлена ў тым, каб тут была стабільнасць, і каб мы мелі абавязкова добрыя адносіны з Расіяй. Таксама і Расія павінна быць зацікаўлена, каб у Беларусі з Еўропай былі добрыя адносіны, і з Амерыкай — таксама. Мы так і робім».

Гаворачы аб супрацоўніцтве з Расіяй у галіне ППА, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «Расія просіць нас падпісаць дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне ППА». «Гэта супрацоўніцтва заключаецца ў тым, што Расія хацела б разлічваць на заходнім напрамку на войскі ППА Беларусі. Яны дастаткова магутныя, і «Іскандэры». Але мы не вельмі б узмацнілі нашу проціпаветраную абарону і іншыя ўзброеныя сілы, абсалютна», — адзначыў Прэзідэнт.

«Што датычыцца «Іскандэраў», я не гаварыў аб тым, што гэта адказ Беларусі ў інтарэсах Расіі супраць Амерыкі ў сувязі з ПРА. У нас ёсць праграма ўзбраення, а дакладней пераўзбраення нашай арміі. Яна зацверджана некалькі гадоў таму. І там чорным па беламу было запісана, што мы будзем мадэрнізаваць у тым ліку і ракетны складальнік, мяняючы некаторыя комплексы на «Іскандэры». Таму мы даўно запланавалі закупіць гэтыя сучасныя комплексы. Але пакуль што ў нас гэта не праглядаецца ў бліжэйшай перспектыве», — растлумачыў ён.

«Што вы за гэты «Іскандэр» так учапіліся? Што гэта ўжо за праблема для Еўропы, «Іскандэр»? Што гэта за такая небяспечная зброя «Іскандэр»? Нічога ў гэтым асаблівага няма. Я яшчэ раз хачу падкрэсліць: дарма Еўропа пераўзвае наконт гэтага», — сказаў ён.

Адказваючы на пытанне аб уплыве сусветнага фінансавага крызісу на эканоміку Беларусі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Гэты эканамічны крызіс многаму навучыў, асабліва еўрапейцаў. І еўрапейцы ўсё больш і больш гавораць аб нашай мадэлі эканамічнага развіцця, беларускай мадэлі».

БЕЛТА.

ГЕНДАРНЫ БАЛАНС

Парламенцкі дзённік

Сітуацыя з раўнапраўем палоў у Беларусі, на думку дэпутата Алега Вялічкі, паляпшаецца

Учора, у Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю гвалту супраць жанчын, гэта тэма абмяркоўвалася і ў сценах беларускага парламента. Старшы саветнік па гендарных пытаннях пры Генеральным Сакратары АБСЕ Джаміля Сефтаўі ініцыявала сустрэчу са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Алегам Вялічкам.

— Пытанні, якія вы хацелі б абмеркаваць, таксама важныя для нас, — падкрэсліў старшыня камісіі. — Гэта пытанні гендарнай роўнасці, гвалту ў сям'і, гандлю людзьмі. Мы цэнім у гэтым плане намаганні вашай арганізацыі, гатовыя ўзаемадзейнічаць па пашырэнні нашых кантактаў. Нам важны ваш вопыт, мы яго і выкарыстоўваем у нашым заканадаўстве, у нашай рабоце.

Сітуацыя з гендарнай роўнасцю ў краіне, на думку Алега Вялічкі, пастаянна паляпшаецца: «Існуе Нацыянальны Савет па гендарнай палітыцы пры ўрадзе. У нас быў Нацыянальны план дзеянняў па паляпшэнні стану жанчын на 2006—2008 гады, які, мы лічым, даволі паспяхова выкананы». Алег Вялічка таксама нагадаў, што дэпутатамі быў прыняты законапраект, які прапісвае, у прыватнасці, і мерапрыемствы па прафілактыцы гвалту ў сям'і. Палітык адзначыў, што маштабы праблемы ў краіне ўстанавіць цяжка, «такія злачынствы здзяйсняюцца за зачыненымі дзвярыма». Пэўная статыстыка ўсё ж вядзецца. Паводле інфармацыі, якой валодае дэпутат, у Беларусі сёлета пацярпела 44 970 жанчын (ад усіх відаў злачынстваў, пры гэтым на бытавой глебе — 1830).

Джаміля Сефтаўі запрасіла беларускі бок узяць актыўны ўдзел у сімпозіуме, які мае адбыцца налета ў Вене. «Хацелася б, каб намаганні нашай арганізацыі і Беларусі кансалідаваліся, і мы сапраўды змаглі б сумесна выпрацаваць найбольш эфектыўныя падыходы ў барацьбе з гвалтам у дачыненні да жанчын».

Ала МАЧАЛАВА.

ЦЮБІНГ І ЗОРБІНГ

У Магілёве чакаюць маразоў, каб адкрыць слаламную трасу ў Пячэрскім лесапарку. Сёлета траса павялічылася: яе даўжыня цяпер складае 250 метраў. Гарадское прадпрыемства бытавых паслуг «Пракат» закупляе горныя лыжы і сноўборды: на інвентар выдаткавана 200 мільёнаў рублёў.

— Мы плануем далей развіваць аздараўленча-забаўляльны комплекс «Пячэрск», — расказала дырэктар прадпрыемства «Пракат» Валянціна Асколкіна. — Мы зрабілі 12 бізнэс-планаў і атрымалі на іх ажыццяўленне пазыку з гарадскога бюджэту.

У Пячэрску зробяць яшчэ некалькі схілаў: навучальны, дзіцячы, для цюбінгу (гэта калі з'язджаеш з гары ў нечым накшталт кола з дном). Верагодна, што ў аматараў зімовых забаў з'явіцца магчымасць асвоіць зорбінг — спуск з гары ў сферы.

Ілона ІВАНОВА.

Спорт-тайм

«ДЫНАМА» ПАЧАЛО З ПЕРАМОГІ

У чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі мінскае «Дынама» перарвала бяспройгрышную серыю, якая дасягнула чатырох матчаў. 24 лістапада ў сталічным Палацы спорту каманда Васіля Спірыдонава выйграла ў челябінскага «Трактара» з лікам 3:2. Шайбы закінулі: у гаспадароў — Дзямагін (у большасці), Антонаў (у большасці), Кукушкін, у гасцей — Кваша (у большасці), Нікалішын. Такім чынам, дынамаўцы ўзялі рэванш за паражэнне на пляцоўцы саперніка 17 лістапада (2:5). Пасля гэтай перамогі «Дынама» перамясцілася з 23-га на 22-е месца ў агульнай табліцы КХЛ. Наступны паядынак мінскі клуб правядзе дома 27 лістапада супраць «Салавата Юлаева» з Уфы.

«НЁМАН» ПЕРАЙГРАЎ «ШЫННІК»

На Адкрытым чэмпіянаце беларусі па хакеі з шайбай 24 лістапада адбыўся адзін матч: гродзенскі «Нёман» выйграў у бабруйскага «Шынніка» з лікам 2:0. Вось вынікі папярэдніх гульняў: 21 лістапада — «Юнацтва» — «Хімік-СКА» — 2:3 (у авертайме) (другое запар паражэнне мінчан), «Рыга-2000» — «Металург» — 1:2 (у авертайме), «Хімвалакно» — «Віцебск» — 2:3, «Латгале» — «Нёман» — 0:3. 23 лістапада — «Юнацтва» — «Віцебск»— 4:2, «Латгале» — «Металург» — 2:4. «Юнацтва» як і раней лідзіруе — 64 ачкі, у «Гомеля» — 57, «Металурга» — 52, «Хімвалакна» — 49, «Віцебска» — 46, «Хіміка-СКА» — 42, «Кераміна» — 40, «Металургса» — 38, «Нёмана» — 35, «Шынніка» — 27, «Рыгі-2000» — 23, «Агрэ» — 17, «Латгале» — 13, «Брэста» — 13.

ГУРЭНКА Ў МІНСКІМ «ДЫНАМА»

36-гадовы беларускі футбаліст Сяргей Гурэнка пераходзіць з маскоўскага «Лакаматыва» ў мінскае «Дынама», паведаміла расійская газета «Савецкі спорт». «Усе нюансы майго вяртання на радзіму былі ўзгодненыя яшчэ тры месяцы таму. Выходзіць трэба своечасова: важна не перасядзець. Адчуваю, што нічога даць камандзе я ўжо не магу — я сябе вычарпаў», — сказаў С. Гурэнка. Футбаліст выступаў за гродзенскі «Нёман» (1989—1995), маскоўскі «Лакаматыў» (1995—1999, 2003—2008), італьянскую «Рому» (1999—2001), іспанскую «Сарагосу» (2001), італьянскія «Парму» (2001—2002) і «П'ячэнцу» (2002—2003). У складзе беларускай зборнай абаронца правёў 80 матчаў — лепшы паказчык сярод усіх гульцоў, якія прыцягваліся ў нацыянальную зборную.

Абзац

■ **Уручэнне абласной прэміі імя Уладзіміра Караткевіча аднавілася ў Віцебску пасля чатырохгадовага перапынку. Узнагароджанне лаўрэатаў прэміі традыцыйна праходзіць 26 лістапада, у дзень нараджэння вядомага беларускага пісьменніка. Сёлета лаўрэатамі гэтай прэміі ў намінацыі «Проза» сталі Фёдар Палачанін за кнігу «Голас сумлення», Генадзь Пацюенка за «Выбух душы» і Барыс Беляжэнка, які напісаў «Сны і дарогі» і «Чароўны млын». У намінацыі «Паэзія» адзначана аўтар зборнікаў вершаў «Жменька лета» і «Апошняя квадра» Надзея Салодкая. Намінацыя «За прапаганду жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча» засталася сёлета без лаўрэатаў з-за адсутнасці дастойных прэтэндэнтаў, адзначылі ва ўпраўленні.**

■ Для сталіцы Італіі Рыма сапраўдным бедствам сталі вялізныя чароды шпакоў. У старажытным горадзе з-за маленькіх птушак апусцелі вулічныя кафэ, яны пужаюць маленькіх дзяцей і нават становяцца прычынай экстраннай пасадкі самалётаў. Мэр горада лічыць, што знайшоў гуманны спосаб высялення птушак у сельскую мясцовасць. Пры падтрымцы ўрада горада на дрэвах будуць устаноўленыя мегафоны, што ўзнаўляюць трывожныя крыкі шпакоў. Лічыцца, што гэта прымусіць птушак пакінуць горад.

■ **У Ніжнім Ноўгарадзе з царквы Успення Божай Маці скрадзены каўчэг з мошчамі святых вялікамучанікаў. Крадзеж адбыўся 22 лістапада, скрадзеныя мошчы вялікамучаніцы Варвары, свяціцеляў Інакенція і Філарэта, мітрапалітаў Маскоўскіх. Як адзначаюць праваахоўнікі, крадзяжы ў храмах — не адзінкавыя, але гісторыя з мошчамі — зусім асаблівая сітуацыя. Каму могуць спатрэбіцца часцінкі праху, як можна скарыстаць іх далей? Вырашаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.**

Поўны абзац

■ Выкладчык старшых класаў з Каліфорніі Том Фарбер вырашыў прадаваць рэкламную плошчу на бланках школьных кантрольных работ. Такім чынам настаўнік папаўняе недахоп сродкаў, што выдзяляе мясцовы бюджэт на закуп тавараў, необходных для навучання. У сувязі з фінансавым крызісам быў перагледжаны мясцовы бюджэт у бок змяншэння расходнай часткі. Настаўнік прапанаваў бацькам вучняў заплаціць за тое, каб назва іх фірмы была надрукаваная на лістах з тэставымі заданнямі. У першы ж дзень удалося сабраць такім чынам 270 долараў. Некаторыя з бацькоў, якія купілі рэкламную плошчу, напачатку аддалі перавагу цытатам з кніг замест назвы сваіх кампаній, але ў хуткім часе на бланках кантрольных пачалі з'яўляцца надпісы з пералікам спонсараў.

■ **У Індыі ў школьную праграму будзе ўключана дысцыпліна, прысвечаная вывучэнню магіі і чарадзейства. Займацца па гэтым прадмеце будуць вучні пачатковай школы. Новы прадмет уводзіцца ў вучэбны план для таго, каб выкараніць распаўсюджаныя сярод індзійцаў забабоны і пазбегнуць забойстваў, звязаных з так званым паляваннем на ведзьмаў. З 2003 года ў Індыі было забіта каля 750 чалавек, якіх падазравалі ў сувязях з нячыстай сілай і ўменнем насылаць псоту на людзей, жывёл і расліны. Хоць спецыялісты лічаць, што дапамагчы ў гэтай сітуацыі можа не столькі асвета, колькі павышэнне выхаванасці і культуры.**

■ Дар'я Жукава, сяброўка бізнэсмена Рамана Абрамовіча, стала ўладальніцай участка на Месяцы. Участак плошчай у сто акраў (каля 40 гектараў) выдатна бачны з Зямлі з дапамогай нават не вельмі моцнага тэлескопа. Такі падарунак 25-гадовая бізнэс-лэдзі атрымала ад свайго жаніха. Участкамі на Месяцы валодаюць ужо больш за тры мільёны зямлянаў, сярод якіх такія расійскія знакамітасці, як Аляксандр Разенбаўм, Лайма Вайкуле, Юрый Гальцаў і іншыя. Купленай зямлёй можна распараджацца як і любой іншай уласнасцю: дарыць, прадаваць, перадаваць у спадыну.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

СПАДЗЯВАЛАСЯ БАБУЛЯ НА СВІНАК

Маўляў, не можа таго быць, каб яны не выручылі яе. Адну меркавалася пусціць на розныя там далікатэсы да Новага года ці Калядаў, а другую — прадаць. Таму і ўходжвала пенсіянерка з вёскі Аляксандраўка Буда-Кашалёўскага раёна за імі з вялікім стараннем. І не ведала, што на яе гадаванак ужо ў некага апетыт разгаръўся. І свінкі ноччу знікалі з яе незамкнёнага хляўка. Нават сігналу ніякага бабулі не падалі, не рохкнулі.

«Па-свінячы» паступіў невядомы і ў дачыненні да жыхаркі вёскі Гардуны, што ў Добрушскім раёне. І ў яе нехта ўкраў свінню. А вось у Жлобінскім раёне кагосьці пацягнула на вітаміны, і ён апусцошыў хлявок жыхаркі вёскі Прыбудак, у якім знаходзілася 13 пудоў капусты. У Мазырскім раёне нейкі ліхадзей нацэліўся не на сённяшні дзень, а на перспектыву. Таму, відаць, перад самым пачаткам маразоў скраў у жыхара Козенак 150 саджанцаў яблынь.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАГІНУЎ БУДАЎНІК

У Бярозе пры ўзвядзенні шматпавярховага дома па вул. Паўночнай з 5-га паверха зваліўся будаўнік, жыхар Белаазёрска. Праз гадзіну 35-гадовы рабочы памёр у бальніцы ад цяжкіх траўмаў.

А ЗІМЫ ЯШЧЭ І НЕ БЫЛО

Бяздомная вырашыла пераначаваць на бульвары Штакераў, што ў Баранавічах. Нягледзячы на тое, што мароз трымаўся ў межах 1-2 °С, 64-гадовая жанчына адмарозіла ногі і р

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 лістапада 2008 г. № 45 (148)

КАТЭДЖ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛІСТА

Чым гаспадарцы прывабіць патрэбныя кадры?

Падчас рэфармавання большасць стратных сельгаспрадпрыемстваў атрымалі інвестараў. Як правіла, гэта ўстойлівыя арганізацыі — прамысловыя, гандлёвыя, банкаўскія структуры. У выніку значных укладанняў (у асобных выпадках выдаткі новых гаспадароў склалі дзясяткі мільёнаў долараў) удалося належным чынам наладзіць вытворчасць, аднавіць сацыяльную сферу. Але шэраг гаспадарак такую дапамогу не атрымалі і ўвесь час спадзяваліся выключна на ўласныя магчымасці.

Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Багданаўскі» сярэдні па памерах — плошча палеткаў складае 4,5 тысячы гектараў. Гаспадарцы неабходна было такім чынам арганізаваць справу, каб вытворчасць прыносіла стабільны прыбытак. Як ні дзіўна, удалося пратрымацца нават у самыя складаныя гады. Зямля тут нядрэнная, даволі ўрадлівая, таму пры жаданні можна атрымліваць добрыя ўраджаі. Што, дарэчы, яскрава пацвердзіў гэты год. У СВК «Багданаўскі» сёлета сабралі рэкордны ўраджай — 6,9 тысячы тон збожжа, а ад рэалізацыі збожжа ўдалося атрымаць нядрэнныя грошы. Падчас жніва добра зарабілі механізатары — выходзіла па 2,5-3 мільёны рублёў. Праца, зразумела, вельмі цяжкая, аднак у такім разе людзі дакладна ведаюць, чаго вартыя намаганні.

— Тэхнікі ў нас дастаткова, таму нагрузка на камбайн невысокая, — заўважае старшыня СВК «Багданаўскі» Анатоль Валюкевіч.

Дарэчы, адна з асноўных крыніц дабрабыту «Багданаўскага» — вырошчванне і продаж насення. Гэты накірунак тут развіваецца даволі паспяхова і прыносіць стабільны даход. Але, напэўна, было б няправільна рабіць стаўку толькі на яго.

Жыць па сродках

Большая частка грашовай выручкі ад рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі прыпадае на жывёлагадоўлю. Гэта традыцыйная «раскладка» для шэрагу сельгаспрадпрыемстваў. Не з'яўляецца тут выключэннем і СВК «Багданаўскі». Паколькі попыт на малочную прадукцыю ўвесь час павялічваецца, то неабходна і вартая прапанова — узнікае надзённая патрэба ў павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці.

Цяпер у СВК даволі вялікі статак — звыш 600 кароў. З пачатку года выручка ад рэалізацыі малака склала каля 900 мільёнаў рублёў — лічба больш чым на 300 млн перавышае аднаведны леташні паказчык. Як заўважае Анатоль Валюкевіч, неабходна ўкладваць грошы толькі ў накірунку, здольныя прыносіць даход не толькі сёння, але і ў перспектыве. Зразумела, калі прыходзіцца спадзявацца толькі на свае сілы, то памылак быць не павінна. Паколькі кожны з работнікаў зарабляе грошы менавіта на сябе. І чым лепшы вынік, тым больш грошай у кішэні. Кожны вясковец добра гэта разумее.

Напэўна, такі псіхалагічны настрой пэўным чынам вызначае канчатковы вынік. Калі працоўны калектыў як адзіная каманда, то ўсё лепш атрымліваецца. Ужо колькі разоў пераконваўся ў справядлівасці такога сцвярджэння. У «Багданаўскім», бясспрэчна, яшчэ не ўсё так проста, здараецца, што «кульгае» і дысцыпліна, аднак, як адзначае старшыня, людзі пачалі больш старанна ставіцца да сваіх абавязкаў. Можна нават сказаць, што вяскоўцы зноў прывучаюцца працаваць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АКТУАЛЬНА

НАВОШТА ПАЖЫЛОМУ ІНТЭРНЭТ?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«У тэкставым рэдактары прадугледжана магчымасць аўтаматычнай нумарацыі старонак. Пры дапаўненні ці выдаленні лістоў нумарацыя аўтаматычна будзе змяняцца...» Галава схілілася над канспектам, рука старанна выводзіць новыя тэрміны і азначэнні. Гэта вам не жартачкі — у 73 гады асвоіць камп'ютар!

Леанід Іванавіч Кучынскі некалі служыў у ракетных войсках стратэгічнага прызначэння, потым працаваў на заводзе вылічальнай тэхнікі. Раней блізка пазнаёміцца з персанальным камп'ютарам не атрымалася, таму «прабел» у адукацыі ён запаўняе на пенсіі.

Гэта толькі маладым і вельмі эгацэнтрычным натурам даецца дзіўным жаданне сталых людзей авалодаць сучаснымі тэхналогіямі, стаць карыстальнікамі персанальнага камп'ютара і інтэрнэт-рэсурсаў. Насамрэч пенсіянерам камп'ютар бывае патрэбны нават больш, чым падлеткам. Для сталых людзей вялікае значэнне мае кантактаванне. Аднак з выхадам на пенсію большасць сацыяльных сувязяў страчваецца, чалавек пачынае адчуваць камунікатыўны голад. Свайгкія і сяброўскія «нітачкі» часта перарываюцца з-за вялікай геаграфічнай аддаленасці. Лепшае выйсце — інтэрнэт і электронная пошта. «У мяне сябры ў Мюнхене, родзічы ў Смаленску і Ленінградзе, — расказвае Леанід Іванавіч. — Сын жыве ў Маскве, ён даўно прапаноўваў: бацька, давай я набуду табе камп'ютар, будзем па электроннай пошце перапісвацца. Дык я і сам магу набыць, грошы ёсць. Вось толькі спачатку трэба навучыцца ім карыстацца».

Так Леанід Іванавіч стаў слухачом на курсах для пенсіянераў пры тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН) Фрунзенскага раёна горада Мінска. Безумоўна, не ўсё ў сталага чалавека атрымліваецца засвоіць з першага разу, аднак прагрэс відавочны. Тэма сённяшніх заняткаў — нумарацыя старонак дакументаў (пенсіянеры вучацца працаваць у тэкставым рэдактары). Быццам бы нічога складанага, але ў Леаніда Іванавіча нешта «не вытанцоўваецца». Ён уважліва вывучае канспект, потым пераводзіць позірк на манітор. Зноў у канспект, зноў на манітор, у канспект — на манітор... Настаўнік гатовы ў любы момант прыйсці на дапамогу, аднак вучань не спяшаецца яго клікаць. Пакуль я разважаю, ці карэктным будзе маё ўмяшанне ў творчы працэс, пенсіянер самастойна знаходзіць прычыну перашкод. «О-го! — радуецца ён. — Нарэшце зразумеў, у чым справа. Я дыскету яшчэ не ўставіў, а ўжо шукаю на ёй інфармацыю!»

У чарзе на камп'ютарныя курсы сёння стаіць каля сотні пажылых жыхароў раёна

— Увогуле, вучні ў нас старанныя, — расказвае выкладчык Марыя Чыжова, — бо зацікаўлены ў атрыманні ведаў. Я перад імі схіляю галаву: нягледзячы на сталы ўзрост, людзі зноў пайшлі вучыцца.

Марыя Міхайлаўна — прафесійны праграміст. Год таму сама выйшла на пенсію. Дома сядзець было сумна, і яна вырашыла выкладаць асновы камп'ютарнай граматы для пенсіянераў (між іншым, на грамадскіх пачатках). Зараз яна выпускае дзве свае першыя групы. Адзнак слухачам яна не выстаўляе, толькі некаторым задае хатняе заданне.

— Людзі розныя, — тлумачыць настаўніца. — Нехта схоплівае інфармацыю адразу і самастойна выконвае ўсе заданні, а з іншымі трэба пасядзець і некалькі разоў паўтарыць усе аперацыі. У нас на курсах займаецца вельмі сталая жанчына (ёй ужо 80 гадоў). На занятках яна не паспявае за астатнімі. Я пішу ёй план хатняй работы, дома яна ўсё выконвае і на наступны раз прыносіць падрыхтаванае заданне на дыскеце. Сёння я даю апошнюю новую тэму, на далейшых занятках мы будзем замацоўваць пройдзены матэрыял. Аднак ужо цяпер можна казаць, што з асноўнай задачай вучні справіліся — засвоілі азы валодання камп'ютарам, перасталі яго баяцца.

* * *

...Поспехамі сваіх навучэнцаў Марыя Міхайлаўна задаволеная, а вось тэхнічным абсталяваннем, на якім даводзіцца праводзіць вучобу, — не. «У нашым распараджэнні ўсяго чатыры камп'ютары, — тлумачыць настаўніца. — Аб'ём іх памяці вельмі сціплы, сістэмныя блокі разлічаныя толькі для запісу інфармацыі на дыскету, гэта значыць, што на дыск запісаць нічога нельга. Ёсць два прынтары, але ні адзін не працуе. На заняткі я прыносіла з дому «флэшку», дыск, паказвала, як яны выглядаюць, але папрацаваць з імі самастойна нашы наведвальнікі не могуць — саставалыя камп'ютары на гэта не разлічаны... І яшчэ вельмі шкада, што ў нас няма выхаду ў інтэрнэт. Я сама пенсіянерка і добра разумею, наколькі важна пенсіянерам навучыцца карыстацца электроннай поштай. У мяне сябры ў Штатах, сваякі ў Таліне, я не ўяўляю сабе іншага кантактавання з імі, як праз інтэрнэт».

З Марыяй Міхайлаўнай абсалютна згодны загадчык аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі ТЦСАН Фрунзенскага раёна Уладзімір Батура (менавіта пры гэтым аддзяленні два з паловай гады таму з'явіліся камп'ютарныя курсы для пенсіянераў): «Тэхніка ў нас страшэнна старая — «Пенціўмы» першага, максімум другога пакалення. Гэта не тое, што ўчарашні дзень, — мінулае стагоддзе! Сорамна навучаць людзей на такіх «трунах». Безумоўна, бабулі і дзядулі і гэтаму рады, але, насамрэч, так не павінна быць».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

ДАПАМАГАЦЬ ЛЮДЗЯМ, АЛЕ НЕ ПЛАДЗІЦЬ УТРЫМАНСТВА



На сесіі Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў прынята рашэнне аб распрацоўцы мерапрыемстваў па стварэнні жыллёва-камунальных участкаў у аграгарадках, каб была дакладная сістэма вырашэння ўсіх пытанняў у гэтай галіне. Разам з тым старшыня раённага Савета Святлана ПРЭДКА не лічыць правільным за бюджэтныя грошы ставіць агароджы ў вёсках пагалоўна ўсім.

— Я заўсёды кажу старшыням сельскіх Саветаў: «Не абяцайце таго, што не зможаце выканаць. Сумленна, аб'ектыўна патлумачце людзям сітуацыю і яны зразумеюць», — гаворыць Святлана Прэдка. — Колькі ні бываю на сельскіх сходах — не баюся крыкаў, выпадаў з боку асобных жыхароў, а спакойна адказваю пытаннямі: «А што вы зрабілі? Чаму нехта павінен гэта зрабіць за вас?». Бо даходзіць да абсурду: некаторыя дзеці жывуць у горадзе і, прыязджаючы ў вёску, не дапамагаюць бацькам па гаспадарцы, а падбухторваюць іх звяртацца ў органы ўлады.

Вось чаму мы стараемся вітаць тых людзей, якія не спадзяюцца на кагосьці, а самі ўпрыгожваюць свае прысядзібныя ўчасткі, вуліцы. Такіх гаспадароў у раёне шмат. Скажам, пераможцам агляду-конкурсу па добраўпарадкаванні населеных пунктаў Вярэйкаўскага сельскага Савета стала былы дырэктар школы, цяпер пенсіянерка Ядзвіга Альбінаўна Касабуцкая. У яе двары — больш за сто (!) найменняў кветак і зялёных насаджэнняў, ды яшчэ азярцо з рыбкамі. А на тэрыторыі Гнезнаўскага сельскага Савета прыклад паказвае сям'я Гуляй — намеснік дырэктара тутэйшага сельгаспрадпрыемства Яўген Аляксандравіч і сакратар сельсавета Людміла Міхайлаўна. Вось дзе сапраўды казачны куток!

Пераможцы конкурсу на лепшае добраўпарадкаванне асабістага падворка (чатыры па кожным сельскім і пасялковым Саветах), а таксама лепшыя дэпутаты, старасты былі нядаўна ўзнагароджаны на першым злёце сельскага актыву Ваўкавыскага раёна. Дарэчы, цяпер ужо ніхто не сумняваецца, як яшчэ некалькі гадоў таму, у неабходнасці інстытута старастаў. Як правіла, староста — гэта сапраўды аўтарытэтны, як кажуць, першы чалавек у вёсцы, які не толькі ведае надзённыя праблемы тутэйшых жыхароў, але і дабіваецца іх вырашэння, звяртаючыся ў сельвыканкам і да любога кіраўніка ў раёне. Да прыкладу, староста вёскі Кавалі Генрых Сцяпанавіч Нядзялёўскі людзям, якія не маюць дапамогі з боку сваякоў, уласным аўтамабілем і дровы прывязе, і збожжа са склада, і бульбу з поля. А староста вёсачкі Зарачаны Марыя Юльянаўна Радзюк паклапацілася аб адкрыцці дома сацыяльных паслуг. Такіх дамоў у нашым раёне ўжо 34. Яны ствараюцца ў аддаленых вёсках для таго, каб раз-два на месяц людзі маглі тут сабрацца, сустрэцца для абмеркавання хвалюючых пытанняў са старшынёй сельскага Савета, кіраўніком сельгаспрадпрыемства, а таксама атрымаць шэраг медыцынскіх, гандлёвых і бытавых паслуг.

— Якія абавязкі будуць у жыллёва-камунальных участкаў у аграгарадках?

— Старшыня сельвыканкама сёння нясе адказнасць практычна за ўсе камунальныя пытанні ў населеных пунктах, але пры гэтым не існуе дакладнай сістэмы іх вырашэння. Так, кацельні, аб'екты водазабеспячэння і водаадводу перадаюцца на баланс спецыялізаваных арганізацый. Але ж ёсць і іншыя праблемы — добраўпарадкаванне дарог, вуліц, газонаў, падтрыманне ў належным стане могілак, калодзежаў, міні-палігонаў для бытавых адходаў, знос старых дрэў, рамонт агароджаў... Паколькі няма камунальнай службы, то кожны кіраўнік сельвыканкама выкручваецца як можа. У прыватнасці, шмат дзе набылі газонакасілкі, з якімі працавалі ў тым ліку і беспрацоўныя па накіраванні службы занятасці. Здавалася б, такую ініцыятыву трэба толькі вітаць, але... З Мінфіна ў фінансавыя ўпраўленні аблвыканкамаў паступіла пісьмо, дзе сказана, што сельскія і пасялковыя Саветы не маюць права расходаваць грошы на закупку газонакасілак, мотакасілак, кустарэзаў, бензапілаў.

Калі так, то гэта яшчэ адзін аргумент на карысць стварэння жыллёва-камунальных участкаў пры сельскіх Саветах, якія б адказвалі за работу па ўсіх вышэйпамянёных і іншых «камунальных» накірунках. Адпаведны вопыт, дарэчы, ужо ёсць у Віцебскай вобласці.

Згодна з рашэннем сесіі раённага Савета дэпутатаў, на працягу гэтага года павінны быць распрацаваны мерапрыемствы па развіцці інфраструктуры жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў сельскай мясцовасці. Каб ужо з наступнага года распачаць арганізацыю жыллёва-камунальных участкаў у аграгарадках.

— Святлана Уладзіміраўна, ці ёсць упэўненасць, што гэтыя і іншыя рашэнні, якія прымаюцца дэпутатамі раённага, сельскіх і пасялковых Саветаў, будуць выкананы?

— А ў гэтым зацікаўлены не толькі прадстаўнічая, але і выканаўчая ўлада раёна. Пазіцыя старшыні райвыканкама Дзмітрыя Гольца заключаецца ў тым, каб кіраўнікі і спецыялісты раённых службаў не сядзелі ў кабінетах і займаліся статыстыкай, а непасрэдна на месцах вырашалі існуючыя праблемы. У гэтых мэтах у апошнія гады праводзіцца аналіз ўзаемадзення паміж раённымі структурамі і Саветамі пярвічнага ўзроўню. Па выніках года кожная служба дае ацэнку органу ўлады пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню. А старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў ацэньваюць работу раённых службаў. Становіцца зразумела, хто недапрацоўвае.

У цэлым узаемадзеянне структур райвыканкама з сельскімі і пасялковымі Саветамі нядрэннае. Праўда, многія вяскоўцы лічаць, што раней, калі спецыялісты землеўпарадкавальнай службы знаходзіўся непасрэдна ў сельсавеце, ён лепш валодаў сітуацыяй і можна было больш аператыўна вырашаць пытанні. Не ў лепшым стане бытавое абслугоўванне вяскоўцаў — шэраг паслуг саставалі і не карыстаюцца попытам. А вось запатрабаваныя паслугі прапануюцца далёка не заўсёды. Чаму б, напрыклад, не стварыць падраздзяленне з тэхнікай па апрацоўцы прысядзібных участкаў, распілоўцы дроў, аказанні транспартных паслуг, тым больш што людзі гатовыя за гэта плаціць, ды і плацяць цяпер прыватнікам? Многае тут залежыць ад жадання, ініцыятывы старшыні сельвыканкама і кіраўніцтва зацікаўленых службаў.

Акрамя таго, ёсць жа яшчэ і дэпутацкія камісіі. Некаторыя кажуць: «Падумаеш, камісія...». Але ў нас не бывае так, што пагаварылі і разышліся, задаволеныя адзін адным, некаторыя кіраўнікі нават крыўдзяцца на вельмі рэзкую пазіцыю дэпутатаў. Як гэта было падчас разгляду пытання аб стварэнні належных умоў для працы і абслугоўвання пакупнікоў на рынках Ваўкавыска. Прычым дэпутаты не абмежаваліся ацэнкамі адпаведных службаў, а самі пабывалі на рынках і ўбачылі шматлікія парушэнні. А затым адбылася прынцыповая размова на пасяджэнні двух пастаянных камісій раённага Савета дэпутатаў з канкрэтным рашэннем, ход выканання якога будзе разгледжаны ў першым квартале наступнага года.

Такім чынам, паўнамоцтваў і ў сесіі, і ў прэзідыума, і ў пастаянных камісій раённага Савета дэпутатаў хапае. Было б толькі жаданне і ўменне імі скарыстацца.

— Гэта датычыцца і Саветаў дэпутатаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню?

— Прэзідэнцкі Указ № 21 стварыў вельмі грунтоўную базу для павышэння аўтарытэту Саветаў пярвічнага ўзроўню і іх кіраўнікоў. І цяпер ужо не скажаш, што старшыня сельскага Савета — гэта быццам «дадатак» да кіраўніка сельгаспрадпрыемства. Яны і цяпер павінны цесна ўзаемадзейнічаць, але ў кожнага свае абавязкі.

За апошнія гады значна палепшылася матэрыяльная база сельвыканкамаў, яны забяспечаны транспартам, камп'ютарамі, аргтэхнікай, абноўлены адміністрацыйныя будынкі. А вось сістэма фарміравання бюджэту Савета пярвічнага ўзроўню, лічу, патрабуе ўдасканалення. Так, колькасць даходных крыніц павялічылася, аднак рэальна бюджэт не адпавядае тым задачам, якія трэба вырашаць на тэрыторыі сельсавета. Я згодна са старшынёй Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў Сцяпанам Абухоўскім, які ў адным з нядаўніх выпускаў «МС» выказаў прапанову, каб у распараджэнні сельскага Савета заставалася частка падаходнага падатку. З індывідуальным падыходам да кожнай тэрыторыі, згодна з умовамі, у якіх знаходзіцца той ці іншы Савет пярвічнага ўзроўню.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ТЭМА ДНЯ

ГЛЫБІНКА... БЕЗ ПЕРЫФЕРЫІ

Фота БЕЛТА.

На адным з аб'ектаў Асіповіцкага раёна.

Большасць маіх сённяшніх сяброў родам з «глыбінкі» — тых самых вёсак, пасёлкаў і невялікіх гарадкоў, якія не заўсёды пазначаны на геаграфічнай карце. Там яны ў свой час скончылі сярэднія навучальныя ўстановы. Адтуль, не доўга думаючы, з'ехалі ў сталіцу ці абласныя цэнтры, дзе і засталіся. Аб чым, шчыра кажучы, многія пашкадавалі — законы жыцця ў вялікіх гарадах не заўсёды літасцівыя ў дачыненні да чужакоў.

Але ж і вяртацца назад не было магчымасці — куды, напрыклад, уладкаваўся б на працу фізік-электроншчык ці інжынер-праграміст? На якія перспектывы ў сваіх «неперспектыўных» населеных пунктах маглі разлічваць менеджар па рэкламе ці маркетолаг?

Сёння ў малых і сярэдніх гарадах пражывае больш за 30 працэнтаў насельніцтва нашай краіны. Доўгі час на ўмовы жыцця ў гэтых населеных пунктах закрывалі вочы або падыходзілі да вырашэння праблем лакальна — латаючы прарэхі ў адным месцы і не звяртаючы ўвагі на аналагічныя ў іншых. У выніку мы апынуліся перад неабходнасцю тэрмінова «рэанімаваць» малыя і сярэднія гарады — для таго, каб іх адставанне не прывяло да сур'ёзнага тармажэння эканамічнага развіцця краіны ў цэлым. З гэтай мэтай летась была зацверджана Комплексная праграма развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў. Было вызначана 187 канкрэтных населеных пунктаў, якія мелі неабходнасць у дадатковай дзяржаўнай падтрымцы.

Прайшло больш за год. Тэрмін не надта вялікі, каб гаварыць пра маштабныя вынікі, але цалкам дастатковы для таго, каб абмеркаваць першыя зрухі. З работай Саветаў дэпутатаў Бабруйскага і Асіповіцкага раёнаў па рэалізацыі комплекснай праграмы развіцця малых і сярэдніх гарадоў днямі пазнаёміліся ўдзельнікі выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання.

— На прыкладах гэтых двух раёнаў мы хацелі б паглядзець, як уплываюць органы мясцовага самакіравання на ход рэалізацыі дзяржпраграмы, асабліва яе якаснага боку: ці прадугледжваецца стварэнне новых працоўных месцаў і арганізацыя той ці іншай вытворчасці, ці ўлічваюцца пры гэтым інтарэсы і патрэбы людзей, якія пражываюць на дадзеных тэрыторыях, — падкрэсліў, адкрываючы семінар, **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Барыс БАТУРА**.

Часам, заўважыў ён, у некаторых населеных пунктах у людзей практычна няма выбару месца працы, ім нічога не могуць прапанаваць, акрамя сельскагаспадарчай вытворчасці. Ферма, мехдвор, збожжаток — вось і ўся «занятасць». На першапачатковым этапе гэта, магчыма, і нядрэнна, заўважыў Барыс Батура. Але ж павінна адбывацца і далейшае развіццё. Галоўная мэта дзяржпраграмы заключаецца ў тым, каб наблізіць якасць пражывання ў малых гарадах да ўзроўню такіх населеных пунктаў, як, напрыклад, Бабруйск. Значыць, ужо сёння неабходна так будаваць работу на месцах, каб максімальна задавальняць патрэбы насельніцтва.

Пасля ліквідацыі шклозавода ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна на першы план выйшла пытанне занятасці насельніцтва. Пачаўся адток працоўнай сілы ў Расію... Акрамя таго, уся інфраструктура, якая раней падтрымлівалася намаганнямі прадпрыемства, прыйшла ў заняпад. Пасёлак знаходзіўся ў крытычным стане, дзяржаўныя інстанцыі захліснула хваля зваротаў грамадзян, пад кожным з якіх стаяла па 200—300 подпісаў.

Мясцовай уладзе, і ў першую чаргу Глушанскаму пасялковаму Савету давялося вырашаць, як хутчэй заняць насельніцтва з улікам яго невысокай кваліфікацыі. Быў створаны цэх па вытворчасці чыпсаў «Ініцыятыва-Плюс» — там атрымалі работу 25 чалавек, а таксама швейны цэх «Славянка-Глуша», дзе сёння заняты 35 работнікаў. Увогуле, уключэнне пасёлка ў дзяржпраграму развіцця малых і сярэдніх гарадоў дазволіла пяці створаным прыватным прадпрыемствам скарыстацца льготнай сістэмай падаткаабкладання. Напрыклад, прыватнаму прадпрыемству па перапрацоўцы драўніны «Магнолія», якое працуе толькі па індывідуальных заказах — тут вырабляюць кампактныя домікі з зацыліндраванага бруса для прыхільнікаў загараднага жыцця. У залежнасці ад габарытаў самога будынка і складанасці праекта кошт доміка, прызначанага для пастаяннага жылля, вагаецца ў межах ад 10 да 20 млн рублёў. Будынак можна заказаць поўнасцю, а можна і па «дэталях» — камусьці неабходна толькі лесвіца, камусьці — дах ці дзверы. Заробак на прадпрыемстве, як расказала яго дырэктар Ірына Тур, залежыць ад класіфікацыі работніка і колькасці заказаў — мінімальны складае 500 тысяч рублёў. Занята на вытворчасці 20 чалавек.

Увогуле за апошнія гады пасёлак змяніўся амаль да непазнавальнасці — у лепшым сэнсе гэтага слова. Пачынаючы з 2000 года, у яго аднаўленне было ўкладзена каля 5 млрд рублёў. Сродкі пайшлі не толькі на праекты, звязаныя са стварэннем працоўных месцаў, але і на добраўпарадкаванне тэрыторыі, давядзенне да ладу інфраструктуры, завяршэнне даўгабуду... На сёння ў Глушанскім пассавеце налічваецца толькі 5 беспрацоўных.

Здавалася б, у большасці праблемы вырашаны. Але, разам з тым, заработная плата на некаторых прыватных прадпрыемствах вымушае чакаць лепшага. На той жа «Славянцы» яна складае сёння ўсяго 360 тысяч, што не можа лічыцца нармальнай сітуацыяй у прынцыпе і прэстыжнасці такому «працаўладкаванню» не надае. Значыць, размову трэба весці не толькі аб стварэнні новых працоўных месцаў (беспрацоўе ў Глушы практычна адсутнічае), але і аб удасканаленні і развіцці таго, што існуе. І патрабаваць гэтага ад кіраўнікоў прадпрыемстваў.

— Менавіта ў Глушы, а не ў Бабруйску заканадаўчая база прадастаўляе сёння льготы па выплаце падаткаў, — адзначыў Барыс Батура. — І гэтым трэба карыстацца. Праграма якраз і разлічана на тое, каб нават маленькія населеныя пункты самі зарабляслі сродкі на сваё жыццё, на сацыяльную сферу, на абслугоўванне. Але гэтага, на жаль, пакуль што не назіраецца, і да дасягнення жаданага выніку яшчэ далёка.

Сёння бюджэт пасёлка толькі на 20 працэнтаў фарміруецца за кошт уласных сродкаў, астатняя частка — датацыі з раённага бюджэту. Разам з тым шэраг магчымасцяў для працаўладкавання людзей, стварэння невялікіх прадпрыемстваў і павышэння даходаў мясцовага бюджэту застаюцца нявыкарыстанымі. Магчымымі варыянтамі папаўнення бюджэту могуць стаць, на думку Старшыні Савета Рэспублікі, больш актыўная нарыхтоўка дароў лесу, стварэнне калектыўных фермерскіх гаспадарак, развіццё турыстычных паслуг — хоць бы ў маштабах раёна. У любым выпадку неабходна выкарыстоўваць усе магчымасці, каб людзі не ад'язджалі на заробкі ў іншыя гарады і краіны.

Горадаўтваральным прадпрыемствам пасёлка Ялізава Асіповіцкага раёна з'яўляецца сумеснае беларуска-аўстрыйскае закрытае акцыянернае таварыства «Шклозавод «Ялізава», на якім працуюць сёння 680 чалавек. Яшчэ каля 400 задзейнічана на невялікіх прадпрыемствах, што забяспечваюць патрэбы асноўнай вытворчасці — там выпускаюць, напрыклад, спецыяльную плёнку для ўпакоўкі шкляной тары (якую раней завозілі з Яраслаўля), дэкараваную тару, выраблюць і рамантуюць запчасткі і дэталі для патрэбаў завадчан... Прадпрыемства, якое на пачатку 2002 года пракстычна ляжала на лапатках, дзякуючы інвестыцыям, укладзеным аўстрыйскай кампаніяй «Атэс», перажывае другое нараджэнне. Сёння гэта стабільная вытворчасць з сучаснай тэхналогіяй. Прадукцыя — а гэта 40 відаў шклотары, ад звычайных слоікаў для кансервавання да «вузкагорлых» бутэлек — пастаянна запатрабаваная ў Беларусі, на рынках Расіі і еўрапейскіх краін.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

НАВОШТА ПАЖЫЛОМУ ІНТЭРНЭТ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Калі толькі ўзнікла ідэя аб стварэнні камп'ютарных курсаў (два з паловай гады таму), старэнькія «Пенціўмы» тэрытарыяльны цэнтр выдзеліў са сваіх сціплых рэзерваў. Машыны ўжо тады былі не новымі, а сёння ім месца хіба што ў музеі. Пры тым, што попыт на камп'ютарны «ликбез» велізарны: у чарзе на курсы сёння стаіць каля сотні састарэлых жыхароў толькі з Фрунзенскага раёна (а ахвотнікаў запісацца значна больш!), якасць тэхнічнага забеспячэння вучэбнага працэсу кульгае на абедзве нагі. «Нам бы 5-6 машын паставіць, «Пенціўмаў» хоць бы трэцяга пакалення, — уздыхае загадчык аддзялення. — І інтэрнэт правесці. Мы б тады выйшлі на гасразлік». (Курсы «падпітваюцца» добраахвотнымі ўзносамі.)

Увогуле, забеспячэнне доступу ў інтэрнэт для Уладзіміра Батуры — балючая тэма. Многія пенсіянеры ходзяць на курсы спецыяльна для таго, каб навучыцца арыентавацца ў «сусветным павуцінні» і карыстацца электроннай поштай. Яны неаднаразова звярталіся да работнікаў аддзялення з просьбай забяспечыць выхад у інтэрнэт. «Мы вырашылі пайсці людзям насустрач, — прызнаўся Уладзімір Батура, — купілі за свае грошы інтэрнэт-картку, я прынёс з дому свой мадэм і мы правялі інтэрнэт. Нашы пенсіянеры былі задаволеныя і шчаслівыя. А потым пра гэта даведалася кіраўніцтва. Нас адчыталі за самадзейнасць, інтэрнэт «абрубілі». У верасні на камп'ютарныя курсы набралі чатыры новыя групы. Цяпер мы не можам прадаставіць выхад у інтэрнэт, аднак людзі звяртаюцца, просяць. Настаўнік вымушаны вадзіць іх у інтэрнэт-клубы і там вучыць працаваць у «сусветным павуцінні». Хоць рэальна мы ўсё гэта маглі б арганізаваць і ў нас, на месцы. Калі б на базе нашага аддзялення можна было стварыць інтэрнэт-клуб для пенсіянераў і тут жа навучаць іх камп'ютарнай грамаце, мы б змаглі выйсці на самаакупнасць. Паверце, ахвотных запісацца было б нямерана — сёння гэта вельмі запатрабаваны рэсурс. Камп'ютарная тэхніка акупіла б сябе ў першы ж год. Я гэта пытанне ўзнімаў неаднаразова, аднак падтрымкі пакуль не знайшоў».

Сама ідэя выдатная, але яна рэалізавана на прымітыўным узроўні.

Напачатку ў ролі настаўнікаў камп'ютарных курсаў выступалі самі работнікі аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі. «Праграма навучання самая простая і даступная, — расказвае Уладзімір Уладзіміравіч, — як уключыць і выключыць камп'ютар, як стварыць файл, што такое дыскета, што такое манітор, сістэмны блок, аперацыйная сістэма, тэкставы рэдактар... Гэта самы неабходны мінімум, якім валодае любы карыстальнік камп'ютара. На Захадзе, у прыватнасці ў краінах Еўропы, у галіне сацыяльнай абароны апошнім часам назіраецца цікавая тэндэнцыя: больш актыўныя пенсіянеры дапамагаюць астатнім. Магу сказаць, што гэтая тэндэнцыя паступова прыжываецца і ў нас. Пакуль што Марыя Міхайлаўна — адзіная настаўніца-пенсіянерка на камп'ютарных курсах. Аднак спадзяёмся, з часам іх будзе больш».

* * *

Сёння ахвотнікі запісацца на камп'ютарныя курсы для пенсіянераў тэлефануюць у ТЦСАН Фрунзенскага раёна з усяго горада (пакуль што такая слушная ідэя знайшла сваё ажыццяўленне толькі тут). Пашанцаваць можа толькі «фрунзенцам», астатніх цэнтр прымаць не мае права. Цяпер на чарзе на асваенне камп'ютарнай граматы стаіць каля 80 мясцовых пенсіянераў. Як бачым, попыт ёсць. Чаму ж аналагічных курсаў няма пры астаніх тэрытарыяльных цэнтрах горада? На думку Уладзіміра Батуры, усё залежыць ад кіраўніцтва падобных устаноў, ад іх жадання ўкараняць у сацыяльнай рабоце з насельніцтвам новыя інавацыйныя тэхналогіі, прапаноўваць людзям менавіта тое, што для іх цікава і патрэбна. «У некаторых цэнтрах ёсць адзін-два камп'ютары, за якімі людзі, калі хочуць, могуць займацца, самастойна, — гаворыць загадчык аддзялення, — але гэта несур'ёзна. Патрэбна праграма навучання, арганізацыя работы і — галоўнае — выкладчык. Сама ідэя камп'ютарных курсаў — выдатная, але пакуль што і ў нас яна рэалізавана на вельмі прымітыўным узроўні. Не хапае сучаснай камп'ютарнай тэхнікі, памяшканняў для заняткаў, выкладчыкаў, інтэрнэту. Праблем шмат, але здавацца мы не збіраемся...»

Інга МІНДАЛЁВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ГЛЫБІНКА... БЕЗ ПЕРЫФЕРЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Але проста так, само па сабе, нічога не прыходзіць і нічога не даецца. Тэхнічны кіраўнік прадпрыемства Аляксандр Жалабковіч расказаў, што паралельна з пераўзбраеннем вытворчасці давялося сур'ёзна брацца за навядзенне дысцыпліны. З людзей, якія не з'яўляліся жыхарамі пасёлка, была створана спецыяльная служба інспектараў (6 чалавек). Працуючы на прадпрыемстве кругласутачна (па зменах), работнікі новага падраздзялення поўнасцю закрылі праблему з п'янкамі і крадзяжамі.

Сёння за знаходжанне ў нецвярозым выглядзе на працоўнай пляцоўцы не штрафуюць — звальняюць адразу і без усялякіх папярэджанняў: высокамеханізаваная вытворчасць патрабуе ад работніка дакладнай рэакцыі і амаль што адточаных рухаў. А стабільныя і немаленькія заробкі (у сярэднім 950 тыс. рублёў) прымушаюць людзей трымацца за месца.

Дарэчы, працаздольнага насельніцтва на тэрыторыі Ялізаўскага пассавета налічваецца больш за 1600. З іх на шклозаводзе працуе каля 1100. Яшчэ каля 100 чалавек занята ў фермерскай гаспадарцы «Бярэзіна-Агра», дзе выпякаюць хлеб і хлебабулачныя вырабы. І прыкладна 200 чалавек абслугоўваюць сацыяльную сферу.

— А дзе ўладкаваліся астатнія? — пацікавіўся Барыс Батура ў прадстаўнікоў мясцовых органаў улады. — На якіх аб'ектах задзейнічаны яшчэ каля дзвюх сотняў ялізаўцаў?

Як высветлілася, частка мясцовага насельніцтва таксама выязджае ў пошуках заробкаў у іншыя гарады, шукае працу на расійскіх будпляцоўках. Таму, адзначыў пазней Барыс Батура, мясцовыя органы ўлады, як прадстаўнічыя, так і выканаўчыя, павінны больш цесна і ўзважана падыходзіць да праблем развіцця кожнага населенага пункта. Сёння дзяржава стварыла ўсе ўмовы, каб у вёсках і невялікіх гарадах Беларусі з'явіўся свой бізнэс. Засталося толькі прыцягнуць яго туды. Як прыцягнуць? Метадаў, лічыць Старшыня Савета Рэспублікі, шмат, уключаючы тлумачальную і індывідуальную работу з насельніцтвам і прадпрымальнікамі кожнай канкрэтнай тэрыторыі.

Адказваючы на пытанне «МС» аб тым, у якой ступені заканадаўчая база адлюстроўвае «болевыя кропкі» малых і сярэдніх гарадоў і ці маюць апошнія патрэбу ў дадатковай падтрымцы, Барыс Батура падкрэсліў:

— Думаю, той нарматыўнай базы, якая ў нас існуе, пакуль што дастаткова для забеспячэння нармальнага развіцця малых і сярэдніх гарадоў Беларусі. Аднак не выключана, што праз некаторы час, пры масавым развіцці дробнага прадпрымальніцтва, можа ўзнікнуць неабходнасць у дадатковым заканадаўчым рэгуляванні. Трэба дажыць спачатку да 2010 года і паглядзець, як будзе дзейнічаць сама праграма, якімі атрымаюцца канчатковыя вынікі. Толькі тады мы зможам вызначыцца, як дзейнічаць далей.

Падводзячы вынікі выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, Барыс Батура адзначыў, звяртаючыся ў першую чаргу да прадстаўнікоў мясцовых органаў улады:

— Дзяржава выканала сваю асноўную функцыю — стварыла ўмовы для з'яўлення новых прадпрыемстваў. Практычна не засталося ніводнага пытання, якое немагчыма было б вырашыць. Цяпер трэба дзейнічаць — памыляцца, але дзейнічаць, а не чакаць, што прыйдзе нейкі «ініцыятыўны чалавек». Не гаварыце «трэба стварыць інвестыцыйную прыцягальнасць» — яна ёсць ужо, яе дастаткова. Канкрэтныя вынікі, з'яўленне новых прадпрыемстваў будуць залежаць цяпер ад здольнасцяў, талентаў і смеласці мясцовай улады, ад таго, якія захады яна зможа прыняць у створаных для яе ўмовах. Час не чакае — кожнаму хочацца жыць у сапраўды квітнеючай Беларусі. А каб так было, трэба сур'ёзна працаваць.

Наталля КАРПЕНКА,
Мінск—Бабруйск—Асіповічы—Мінск.

ЦІХА ГАНДЛЯВАЎ...

Індывідуальны прадпрымальнік з в. Волька ціха прадаваў на рынку ў Івацэвічах тэкстыльныя і трыкатажныя вырабы. Яго павільёнчык не прыцягваў да сябе ўвагі, але калі сюды зазірнулі супрацоўнікі міліцыі і камітэта дзяржкантролю, то знайшлі тавару без дакументаў на 60 млн рублёў.

Сума для райцэнтра вялікая.

ЛЁГКАЙ ПАРЫ

Найлепш — калі ёсць свая лазня, падумалі жыхары Сцяпанкаўскага сельсавета, што ў Жабінкаўскім раёне, і пачалі пры сваіх хатах будаваць лазні.

Ужо 21 сям'я мыецца і парыцца дома. Лёгкай пары.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

50 МІЛЬЁНАЎ — НА ДВАІХ

Пракуратурай Любанскага раёна па матэрыялах аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі РАУС узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да 41-гадовага мінчаніна, інжынера аднаго з ААТ, і 69-гадовага індывідуальнага прадпрымальніка з вёскі Паперня Мінскага раёна.

Інжынер — былая адказная асоба РУП «Эксперыментальная база «Любанская» і прадпрымальнік падазраюцца ў тым, што з сакавіка 2006-га па снежань мінулага года выкралі 50 мільёнаў рублёў, якія належалі прадпрыемству.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

МЯСЦОВЫ ЧАС

МУЗЕЙ ЗБІРАЛІ ТАЛАКОЙ

Падчас камандзіровак па справах «МС» даводзілася чуць, як вяскоўцы праводзілі суботнікі на могілках, як разам падсыпалі дарогу, як талакой узводзілі мост, а ў Бярозаўскім раёне расказалі, як усёй грамадой стваралі... музей. Узначаліла работу бібліятэкар Лідзія Рудзьман, а жыхары вёскі Вайцяшын ёй актыўна дапамагалі.

Лідзія Іванаўна чвэрць веку працуе ў сельскай бібліятэцы. І калі ў акрузе стала чуваць, што дзе-нідзе бібліятэкі зачыняюць, перарабляюць іх у дамы сацыяльных паслуг, іншыя ўстановы, у Вайцяшыне сталі думаць, як умацаваць свой культурны аб'ект. Вёска Вайцяшын па цяперашніх мерках — сярэдні населены пункт, тут жыве 260 чалавек. А чытачоў значыцца ў спісе 335. Праўда, у зону абслугоўвання чытальні ўваходзіць яшчэ маленькая вёсачка Ярцавічы. Але чытачы прыязджаюць і з Беларазёрска, з іншых месцаў. Фонд багаты літаратурай па школьнай праграме, а ў гарадах, буйных населеных пунктах, здараецца, кніг не хапае на ўсіх вучняў. У акрузе людзі ведаюць Вайцяшынскую бібліятэку, таму зазіраюць сюды. З чаго можна зрабіць выснову: сельская бібліятэка запатрабавана. І неяк сама сабой выспела ідэя — не толькі арганізоўваць часовыя выставы, разавыя мерапрыемствы, але зрабіць пастаянную экспазіцыю, дзе адлюстраваць былое і сучаснае вёскі.

Спачатку, як заўсёды, было слова. Лідзія Іванаўна звярнулася да аднавяскоўцаў з просьбай, каб дапамаглі будучаму музею. «Не думала, не гадала, — кажа Лідзія Рудзьман, — што людзі так сур'ёзна паставяцца да гэтай справы. Я баялася, што грошай няма, але ніхто пра аплату нават не ўспамінаў. Неслі па 15-20 экспанатаў з хаты! Аказалася, на гарышчах, у шафах, куфрах захаваліся бабуліны строі, старадаўні посуд, процьма гаспадарчых рэчаў і іншыя вясковыя рарытэты. Невялікае неслі ў руках і кошыках, старадаўняе станкі і агрэгаты кацілі на цялежках.

Калі з'явілася першая партыя экспанатаў, стала зразумела, што новаму музею спатрэбіцца памяшканне. На прыбудову драўніну выдзеліў сельвыканкам, з рабочай сілай дапамагло мясцовае сельгаспрадпрыемства. Старшыня сельскага Савета Мікалай Марчук, які быў з самага пачатку самым актыўным прыхільнікам ідэі стварэння музея, вырашаў прынцыповыя пытанні падчас будаўніцтва і добраўпарадкавання. А ў дзень перад адкрыццём кіраўнік мясцовай улады дапамагаў жанчынам цэлы дзень: вешаў карціны, расстаўляў мэблю і экспанаты. Адным з самых шаноўных удзельнікаў таго адкрыцця быў ветэран Вялікай Айчыннай вайны Іван Міхайлавіч Кожух. Вялікі аптыміст па жыцці, актыўны ўдзельнік самадзейнасці пакінуў пасля сябе светлыя ўспаміны. Аднавяскоўцы ўзгадвалі, як Іван Міхайлавіч лячыўся ў Белаазёрскай бальніцы. Адведаць яго заўсёды заязджалі таварышы па самадзейным гуртку, дык ён прасіў, каб бралі з сабой гармонік. І тады для ўсіх хворых бальніцы даваўся імправізаваны канцэрт. Ветэран пайшоў з жыцця. Але ўсе яго ўзнагароды, паводле яго волі, захоўваюцца на пачэсным месцы ў музеі.

Даводзілася бачыць нямала музеяў у школах, дамах культуры, але часта яны становяцца, так бы мовіць, маларухомымі, запатрабаванымі ад выпадку да выпадку. Тут музей жывы, ён стаў часткай вясковага побыту. Самі вайцяшынцы ганарацца сваім музеем, вядуць сюды сваіх гасцей, прыязджых родзічаў. «Сталыя жанчыны прыйдуць іншы раз, — расказвае Лідзія Іванаўна, — паходзяць вакол старых ткацкіх станкоў і прасніц, паглядзяць на калыску і посуд часоў сваіх бацькоў і кажуць, што нібы пабывалі ў сваёй маладосці, дакрануліся да мінуўшчыны».

Вайцяшынскі музей складаецца з дзвюх залаў. У адной прадстаўлены быт і этнаграфія, у другой — гісторыя і сучаснасць сваёй вёскі. Дарэчы, этнаграфію можна вывучаць не толькі па старых экспанатах. Напрыклад, Марыя Максімаўна Сычык і сёння мае ткацкі станок і тчэ цудоўныя пакрывалы, палавікі. Тоесёе з яе вырабаў ёсць у музеі. Многія жанчыны з задавальненнем далі свае вышыванкі і іншыя творы (а майстрыхамі Вайцяшын вельмі багаты).

У гістарычнай зале сабраны ўспаміны, сведчанні, дакументы. У вайну ў тамтэйшых мясцінах дыслакаваўся партызанскі атрад з сямейным лагерам, а там працавала нават партызанская школа. Яшчэ ў вёсцы ёсць людзі, якія ў той школе вучыліся. Іх успаміны заўсёды выкарыстоўвае ў сваіх расказах экскурсавод-бібліятэкар Лідзія Рудзьман. Экскурсіі ў Вайцяшын едуць. Бярозаўскія турфірмы даўно ўключылі гэту кропку ў свае маршруты, і пакуль што нараканняў не выказвалі. А музею прысвоена званне «народны», што цалкам адлюстроўвае яго сутнасць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Бярозаўскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

МАБІЛЬНАЯ СУВЯЗЬ ТЭЛЕФОНУ НЕ ЗАМЕНА

За 9 месяцаў гэтага года колькасць абанентаў РУП «Белтэлекам» павялічылася на 100,6 тысячы. Такім чынам, агульная абанентская база кампаніі дасягнула 3,7 мільёна, з іх больш як 788 тысяч абанентаў падключаны на сельскіх тэлефонных станцыях.

— Мы прагназуем, што ў бліжэйшыя гады попыт на падключэнне стацыянарных тэлефонаў захаваецца па-ранейшаму высокім, — падзяліўся сваімі думкамі з журналістамі намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белтэлекам» па тэхнічных пытаннях Сяргей Сівадзедаў. — Нягледзячы на развіццё мабільнай сувязі і бесправадных тэхналогій перадачы даных, насельніцтва карыстаецца і будзе карыстацца хатнімі ці службовымі стацыянарнымі тэлефонамі і дадатковымі паслугамі, якія забяспечвае «Белтэлекам». Акрамя таго, абанентская лінія выкарыстоўваецца для высокахуткаснага доступу ў інтэрнэт і лічбавага інтэрактыўнага тэлебачання.

Пра высокі попыт на стацыянарныя тэлефоны сведчыць і той факт, што за 9 месяцаў 2007 года было падключана толькі крыху больш як 55 тысяч тэлефонных апаратаў — гэта амаль што ўдвая менш, чым сёлета. Такім чынам, патрэбы насельніцтва ў стацыянарнай тэлефоннай сувязі яшчэ цалкам не задаволеныя...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЯШЧЭ ПРАСЦЕЙ

Меры, накіраваныя на спрашчэнне адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца падатковымі органамі адносна юрыдычных асобаў і ІП, прадугледжаны пастановай Савета Міністраў № 1723, паведамілі ў Міністэрстве па падатках і зборах.

У прыватнасці, рэфармуемым у працэсе раздзяржаўлення і прыватызацыі юрыдычным асобам, якія адносяцца да рэспубліканскай уласнасці, не трэба будзе звяртацца ў падатковы орган за выдачай даведкі аб унясенні ў бюджэт грашовых сродкаў з называннем даты іх пералічэння, а таксама аб спагнанні з іх у бюджэт штрафаў і пені. Цяпер гэта даведка будзе прадастаўляцца непасрэдна тэрытарыяльным фондам Дзяржкаммаёмасці.

Таксама не трэба будзе браць даведку аб адсутнасці запазычанасці па плацяжах у бюджэт і пазабюджэтныя фонды для вырашэння пытання аб змяненні тэрмінаў фарміравання статутных фондаў прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі. Калі такое прадпрыемства звернецца з заявай аб змяненні тэрмінаў фарміравання статутнага фонду, пры неабходнасці МЗС можа само запрасіць у падатковых органаў неабходную інфармацыю. Юрыдычным асобам і ІП таксама не трэба будзе атрымліваць даведку аб адсутнасці запазычанасці па падатках і іншых плацяжах у бюджэт для вырашэння пытання прадастаўлення на конкурснай аснове права на наземнае эфірнае тэлерадыёвяшчанне.

Цяпер падатковыя органы ва ўсіх рэгіёнах могуць прадастаўляць інфармацыю з электроннага банка даных аб выкарыстаных і рэалізаваных бланках першасных уліковых дакументаў і кантрольных знакаў.

БЕЛТА.

КАТЭДЖ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛІСТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Цяпер у гаспадарцы правадзяць рэканструкцыю жывёлагадоўчых фермаў. Робіцца ўсё неабходнае для таго, каб стварыць сучасныя ўмовы вытворчасці, зменшыць да мінімуму долю ручной працы. Паляпшаюцца і бытавыя ўмовы — абуладкоўваюцца пакоі для адпачынку работнікаў. Магчыма, праз некалькі гадоў, калі цэнтральная сядзіба СВК набудзе статус аграгарадка, удасца ўзвесці сучасны маслочны комплекс з даільнай залай. Зразумела, такая даволі заманлівая перспектыва пакуль здаецца амаль немагчымай. Без пэўнай дапамогі дзяржавы гэты маштабны праект гаспадарка проста не «пацягне». А залазіць у даўгі, браць вялікія крэдыты на будаўніцтва — таксама не лепшы варыянт. Трэба жыць па сродках — такога правіла ў «Багданаўскім» заўсёды прытрымліваліся. Калі сёння не па сілах нешта зрабіць, то трэба прыкласці ўсе намаганні і зрабіць гэта заўтра. Гэтая жыццёвая стратэгія дазволіла СВК не толькі ўтрымацца ў цяжкія часы, але і паступальна нарошчваць аб'ёмы вытворчасці. Таму ў гаспадарцы імкнуцца выкарыстаць усе шанцы для развіцця «малочнага» накірунку, аднак не за кошт згортвання сацыяльных праграм.

Рамонт — за кошт гаспадаркі

Цяпер у СВК «Багданаўскі» працуюць 159 чалавек. Калектыў даволі малады — сярэдні ўзрост каля 40 гадоў. Але паміж катэгорыямі работнікаў гэты паказчык значна адрозніваецца. Напрыклад, узрост механізатараў пераважна да 30 гадоў, у большасці ж хлопцам ад 18 да 24 гадоў. Усе яны тутэйшыя жыхары, якія вырашылі звязаць сваю будучыню з роднай гаспадаркай. Чым удалося прывабіць патрэбныя кадры? Адказ відавочны — неблагімі заробкамі і жыллём.

Вяскоўцы паверылі ў перспектыву гаспадаркі і карпатліва працуюць над яе ўвасабленнем. Гэта зусім не высокія словы, паколькі людзі лічаць, што сельская гаспадарка цяпер — далёка не горшы выбар. Таму мясцовыя жыхары зусім не супраць, каб іх дзеці заставаліся працаваць у СВК. І застаюцца. Маладыя спецыялісты лічаць «Багданаўскі» даволі прывабным працоўным месцам. Сюды прыязджаюць і з іншых раёнаў — да прыкладу, нядаўна ўладкаваліся заатэхнік з ветурачом з Лагойшчыны.

Калі механізатарамі гаспадарка забяспечана поўнасцю, то па кадрах для жывёлагадоўлі ўзнікаюць вострыя пытанні. Адпаведныя працоўныя месцы ўкамплектаваныя работнікамі, якім ужо за 50 гадоў. Гэта значыць, пераважна людзьмі перадпенсійнага ці пенсійнага ўзросту. Прыцягнуць сюды неабходных спецыялістаў — сапраўдная праблема. Аднак, спадзяецца намеснік старшыні СВК «Багданаўскі» Наталля Грыб, магчыма, у бліжэйшай перспектыве сітуацыю ўсё ж удасца выправіць. Па-першае, паляпшаюцца ўмовы працы жывёлаводаў, павялічваюцца заробкі (памер аплаты напрамую залежыць ад канкрэтнага працоўнага выніку).

Таксама без усялякіх праблем можна вырашыць жыллёвае пытанне. Штогод гаспадарка ўзводзіць па пяць домікаў. А налета запланавана пабудаваць ужо дзесяць камфартабельных катэджаў. Атрымаць такі кожнаму за шчасце. Зразумела, жыллё абы-каму не дастаецца — нядаўна справіла ўлазіны шматдзетная сям'я, якая працуе ў гаспадарцы. Разам з уласна грашовымі выплатамі (дарэчы, даволі важкімі — па выніках дзевяці месяцаў сярэдні заробак у СВК склаў амаль 300 долараў) вяскоўцы таксама атрымліваюць «бонусы» сельгаспрадукцыяй, у прыватнасці, збожжам. У залежнасці ад працоўных вынікаў «набягае» ад 200 кілаграмаў да 1,5 тоны. Дарэчы, падчас правядзення палявых работ на прысядзібных участках пры неабходнасці сельгаспрадпрыемства людзям заўсёды дапамагае. Паколькі, як заўважыў Анатоль Валюкевіч, месцічы павінны адзін аднаму заўсёды прыходзіць на дапамогу. Мабыць таму ў гэтых мясцінах і атрымалася такая дзейсная цесная ўзаемасувязь паміж тутэйшым сельвыканкамам і гаспадаркай.

Са здзіўленнем даведаўся пра тое, што рамонт вяскоўцы робяць за кошт гаспадаркі. Трэба толькі прадаставіць чэкі — па ім вернуць адпаведную суму грошай. Асабліва да месца гэта было некалькі гадоў таму, калі вяскоўцам прыходзілася самастойна «даводзіць» дамы, паколькі тады будынкі ўзводзіліся ў межах пэўнай, адносна невялікай, сумы. Цяпер жа сярэдні кошт катэджаў, якія здаюцца ў эксплуатацыю для работнікаў «Багданаўскага», складае 160—180 мільёнаў рублёў. Гэтае жыллё поўнасцю адпавядае ўсім сучасным стандартам.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Валожынскі раён.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Капитальные строения (производственное здание и здание сарая) и право заключения договора аренды земельного участка
Продавец недвижимого имущества	РУПАД «Бреставтодор» г. Брест, ул. Воровского, 19, тел. 8(0162) 20 31 09
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, Ивановский район, Снитовский с/с, д. Снитово
Сведения о предмете аукциона	**Капитальное строение** (производственное здание) 1-этажное, 1979 г.п., общая площадь – 47,5 кв.м, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная. Полы дощатые, поверх ДСП. Имеется печное отопление, электроснабжение, в состав кап. строения входит также пристройка. **Капитальное строение** (сарай) 1-этажное, 1991 г.п., общая площадь – 36,3 кв.м, стены кирпичные, фундамент бетонный, крыша совмещенная. Земельный участок площадью 1,6538 га, срок аренды – 90 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	24 742 315
Сумма задатка, руб.	2 474 230
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 23 44 06, 20 87 85, www.brest-region.by*

Аукцион состоится **30 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:
- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;
- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107 , УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица.

4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае рассрочки), возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и расходы на подготовку и проведение аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 29 декабря 2008 года включительно.

ВЯРТАННЕ ЯКУБА КОЛАСА

Класікі і сучаснікі

З НАРОДНЫМ ПАЭТАМ БЕЛАРУСІ МЫ ПАЗНАЁМІМСЯ ЦЯПЕР УЖО БЕЗ «ЦЭНЗУРНЫХ КУПЮР»

Выйшлі першыя пяць тамоў найбольш поўнага Збору твораў Якуба Коласа ў 20 тамах. Іх прэзентацыя «Свайму часу і вечнасці» адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Збор твораў Якуба Коласа ў 20 тамах выдавецтва «Беларуская навука» — трэцяе пасмяротнае навукова каментаванае выданне літаратурнай спадчыны класіка беларускай літаратуры. Новае выданне адрозніваецца ад папярэдніх большай паўнатой уключаных у яго новых твораў, значна пашыранымі каментарыямі, багатым ілюстрацыйным матэрыялам, новым рашэннем некаторых тэксталагічных праблем.

«Байцы нябачнага фронту»

— так жартаўліва называюць сябе тэкстолагі, літаратуразнаўцы, музейшчыкі, якія працуюць над новым выданнем.

Малодшы сын Якуба Коласа Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч іх працу невыпадкова назваў тытанічнай.

Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Міхась Мушынскі тлумачыць:

— Прынцыповае адрозненне 20-томнага выдання ў тым, што яно значна большае не толькі дзякуючы новым уключаным творам: вершы, публіцыстыка... Яно новае і ў сэнсе сістэмнага паслядоўнага аднаўлення тэксту, які быў выкінуты, — цэнзурныя купюры, скарачэнні, зробленыя ў 1952 годзе ў 7-томніку, якія па волі лёсу заставаліся і ў 12-томніку (1960-я гады), і ў 14-томніку (1970-я гады).

Былі «скарочаны» крамольныя, на думку цэнзараў, абзацы, строфы, урыўкі або самі творы. Мы аднавілі і далі чытачу сапраўднага Коласа, пазбаўленага скажэнняў.

Ужо нават па выдадзеных пяці тамах можна меркаваць, наколькі Колас багацейшы як паэт; наколькі ён глыбейшы як празаік; наколькі ён мудрэйшы як публіцыст...

Тэкстолаг, загадчык аддзела Інстытута мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАНБ Тэрэза Голуб адзначыла, што Збор твораў рыхтаваўся Інстытутам пры актыўным удзеле і садзейнічанні Літаратурна-мемарыяльнага музея

Якуб Колас, 1953 год

Коласа Марыя Дзмітрыеўна.

За 11 гадоў Колас напісаў 352 лісты да Аляксандры Антонаўны. Вельмі радасна, што ў IV том ужо увайшлі 46 вершаў, прысвечаных Былінцы (так называў яе паэт). Якуб Колас — наш духоўны настаўнік. Постаць яго застанецца назаўсёды на небасхіле Беларусі. Наблізімся да яе. Прыгледзімся. Адкінем наноснае. Вылучым вечнае...

Дадамо, што ў дзень 125-годдзя Якуба Коласа «Звязда» закранула даволі далікатную тэму: Музы Якуба Коласа. Гаворка ішла пра жанчын, якія натхнялі паэта на задавальненне апісваў тую сустрэчу: «Своё знакомство ознаменовали мы очень солидною выпивкою» і г.д. (гл.: «Звязда» за 27 кастрычніка 2007 г.). І — уявіце сабе! — рэдакцыя атрымала «рэкламацыю». Маўляў, навошта публікаваць падобныя рэчы, гэта прыніжае аблічча класіка» і г.д.

Ну, што тут сказаць — спадчына «чалавека ў футляры» для некаторых невынішчальная...

Фота Вольгі ЛАСКІ.

Сын Я. Коласа Міхась Канстанцінавіч МІЦКЕВІЧ каля Збору твораў бацькі.

«Чаму замест сядзелкі вы не прызначылі ляжалку?!»

Якуб Колас быў зусім іншым — пра гэта і сведчыць яго сын Міхась Міцкевіч:

— У сямейным архіве ляжалі вершы на медыцынскую тэму. Мы надрукавалі іх у «Полымі», але шырокая аўдыторыя іх не чула і не чытала. А там ёсць цікавае!

Знаходзячыся на бальнічным рэжыме, безумоўна, прыходзілася думаць пра тое, як узняць настрой. Некалькі кропель «амброзію» — ну, хто мог даць? Толькі доктар! А доктар цудоўны быў — Сяргей Іосіфавіч Ліаранцэвіч. Я ведаў яго не толькі як доктара, але і як калегу-паляўнічага. Іншы раз, калі ён бачыў, што дазваляла здароўе, — ён прыносіў флакончык. І з'яўляліся просьбы...

Ну, так проста просьбы ж не даходзяць. А калі ў вершаванай форме — дык усё-такі на сэрца больш уздзейнічае... І з'явілася шмат вершаў «Святому Сергію», «Сергію прападобнаму»...

Быў выпадак, калі адначасова з Коласам ляжаў у «стацыянары» і Канстанцін Саннікаў, знакаміты рэжысёр Купалаўскага тэатра. Да яго прыходзілі артысты і прыносілі іншы раз «пасылачкі». А каб не было відаць, як гэтая «справа» адбываецца — бо нельга ж было праносіць!.. Яны ўхітрыліся ў прыёмнай пад вечка раяля класці маленькую «пасылачку». Прыходзіць артыст — занёс туды, як нікога няма... А ўжо пасля Саннікаў ціхенька пойдзе, дастане дый падзеліцца з Коласам. Ну вядома ж — як жа тут не падзяліцца?!.

І прыходзіў артыст Уладзімір Дзядзюшка. І, відаць, Колас прасіў яго таксама, каб ён «пасылачку» прынёс. Той паабяцаў, але — не прынёс. І гэтае чаканне паэта вылілася ў верш «Неспагаднасць».

Добра чуў Дзядзюшка,
Што шаптаў на вушка
Яму нехта хворы.
Дзень за днём праходзіў,
А ён, той дабродзей,
Кінуў друга ў горы!
Дзядзюшка- Дзядзюшка,
Хоць бы чацвяртушку
Простае сівухі!
Ачарсцвелі душы,
Самі п'юць Дзядзюшы,
А да хворых — глухі!

Калі не дапамагалі такія просьбы, даводзілася звяртацца і да Бога:

Утрацілі сілу малітвы.
Як ні малюся — маўчок!
І вострыя словы, як брытвы,
Ты лепей павесь на кручок.
І раптам у восеньскім ветры
Параду дае мне сам Бог:
«Не лезь ты ў дакторскія нетры,
У лес падавайся, на мох!
Ты захапі з сабой паўпляшкі —
Гарэлкі альбо каньяку...
Я грэх адпушчу табе цяжкі,
Палёгку зраблю бедаку.
Пасціў ты не мала і годзе!
Ты піў — але ў меру. Шмат лет.
Прымі дзвесце грам,
не пашкодзіць.
Бо што без гарэлкі паэт?!.»

Калі Коласу стала кепска, паклікалі на кансультацыю-кансіліум «свяціл зямлі беларускай», як гаварыў паэт. Яны вырашылі, што трэба, каб хтосьці быў побач, наглядаў за Коласам. Безумоўна, гэта абмяжоўвала магчымасці хворага — і нарадзіўся верш:

О, дактары! Замахі вашы мелкі
Да гэтага, відаць,
прывчаны вы змалку.
Чаму, чаму замест сядзелкі
Вы не прызначылі ляжалку?!

Тыраж усяго... 1,5 тысячы. На ўсю Беларусь?!

Зайшла ў «Акадэмкнігу». Уважліва аглядаю паліцы ў пошуку Збору твораў Якуба Коласа. Нідзе няма.

Звяртаюся да прадаўца, а тая тлумачыць:

— Усе выпушчаныя тамы новага Збору твораў мы ўжо прадалі. Яны імгненна разышліся.

Тэлефаную ў выдавецтва «Беларуская навука»:

— Ці не плануецца выдаць дадатковы тыраж?

— Справа ў тым, што кнігагандляры не даюць ніякіх заявак, — тлумачыць дырэктар выдавецтва Аляксандр Сташкевіч. — А выдаваць «на свой страх і рызыку» мы не можам. Хоць вы ж разумееце: чым большы тыраж, тым таннейшая кніга — гэта выгадна і выдавецтву, і пакупніку. Аднак... кнігагандаль, на жаль, зараз працуе вельмі ўжо асцярожна...

* * *

Новае знаёмства з народным паэтам Беларусі Якубам Коласам стане, безумоўна, яшчэ адным адкрыццём нашага славутага класіка — калі гандаль забяспечыць нам гэтую магчымасць...

Таццяна ПАДАЛЯК.

НЕБЯСПЕЧНА РАБІЦЬ АБАГУЛЬНЕННІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА КУЛЬТУРЫ

У Мінску адбылася прэзентацыя чарговага даклада ААН «Народанасельніцтва свету ў 2008 годзе».

Сёлета даклад прысвечаны пытанням культуры, гендарнай роўнасці і правоў чалавека. У ім, у прыватнасці, адзначаецца, што культура ўплывае на тое, як людзі будуюць сваё жыццё, як яны думаюць і дзейнічаюць, але яна не фарміруе адзінага мыслення і паводзінаў. Таму аўтары даклада лічаць, што небяспечна рабіць абагульненні ў адносінах да культуры, і асабліва небяспечна меркаваць аб адной культуры зыходзячы з нормаў і каштоўнасцяў іншай. Культурнае развіццё з'яўляецца такім жа правам, як эканамічнае ці сацыяльнае развіццё.

Разам з тым у дакладзе ўтрымліваецца папярэджанне аб тым, што ўлік культурных фактараў не азначае ўхвалення дрэнных традыцый ці дазволу парушаць правы чалавека. Аўтары даклада нагадваюць, што ніякія спасылкі на традыцыі і рэлігію не могуць выкарыстоўвацца для апраўдання такіх жудасных злачынстваў, як забойства жанчын «у абарону гонару». Увогуле жанчыны з бедных слаёў насельніцтва асабліва пакутуюць ад шкодных культурных традыцый і звычаяў, яны ў значна большай ступені рызыкуюць памерці ў час цяжарнасці, ад хваробаў і траўмаў. Часам культурныя абмежаванні больш, чым галеча, не даюць жанчынам магчымасці планаваць колькасць сям'і.

А жанчына, утрымліваецца ў дакладзе выснова, лічыцца захавальніцай культуры.

Леанід ТУГАРЫН.

Зварот у карпункт

Вяровачны канфлікт, альбо Чаго не хапае людзям на старасці?

У «Звязду» прыйшло пісьмо з в. Кавалі Ляхавіцкага раёна. На сямі старонках аўтар эмацыянальна і крыху сумбурна выклаў сваю крыўду і прасіў «...расследаваць гэтую справу да канца».

Пацярпелай была пенсіянерка Надзея Несцяровіч і ліст, быццам бы, напісаны ад яе імя, але пазней жанчына сказала, што яна сама ў рэдакцыю не звярталася, а магчыма, зрабіў гэта яе муж. Як бы там ні было, але, патэлефанаваўшы ў сельскі Савет, раённы аддзел міліцыі і жыхарам вёскі, даведаўся, што канфлікт быў, і ўсе прозвішчы, названыя ў лісце, нявыдуманыя.

У свой час у Кавалях выганялі на пашу больш за 70 кароў, але ішлі гады, людзі старэлі, і сёння ў вёсцы толькі 4 каровы. Чаргі ўжо не стала, і кожны сваю рагулю навязваў на выгане — забіваў калок у зямлю і карова пасвілася на вяроўцы. Раніцай навязвалі, а пад вечар забіралі.

Аднойчы Н. Несцяровіч прыйшла па сваю карову, а вяроўка перарэзаная. Жанчына падумала, што нехта нядобра пажартаваў, а калі перарэзалі і другі раз, то ўзнікла падазрэнне, што робіцца гэта спецыяльна.

Шкада было не толькі тых вяровак, але старому чалавеку злавіць тую карову і прывесці дамоў нялёгка. Падумалася, што шкоду робіць хтосьці з хаты, якая стаіць пры выгане. Думаць можна, але калі за руку не схапіў, то і не абвінаваціш.

Калі ж вяроўкі пачалі рэзаць яшчэ і ў С., то стала зразумелым, што ёсць у вёсцы чалавек, які мэтанакіравана вядзе барацьбу з тымі, хто трымае кароў. Па логіцы так выходзіць.

Вось такі парадокс. Калі каровы былі ва ўсіх — нікому не балела, а засталося некалькі, то гэта ўжо цяжка перажыць.

Толькі не будзем думаць, што гэта нейкая анамалія. Такое сёння не здзіўляе. У пад'ездзе шматпавярховага дома некалі амаль усе ездзілі на «Жыгулях» ды «Масквічах», і машыны суткамі стаялі перад домам. Але з часам іржа паела тыя аўтамабілі, а іх гаспадары састарэлі і тады пачалі наступаць на двух суседзяў, якія цяпер маюць іншамаркі, — закопваць трубы, ладзіць скандалы, каб машыны не стаялі насупраць пад'езда.

Вось такія мы! Усе павінны быць аднолькавымі. Але вернемся ў Кавалі.

Пацярпелыя ўжо разам пачалі падазраваць, што шкоду робіць іх аднавясковец — рэжа тыя вяроўкі сярпом, бо канцы не роўныя, а калматыя.

Каб былі людзі маладзейшыя, то зрабілі б засаду ды злавілі нягодніка. Але якое было б пакаранне за такое хуліганства? Дробязь.

Усё змянілася, калі невядома з якой прычыны С. пачаў абвінавачваць Надзею Несцяровіч. Маўляў, гэта яна робіць яму шкоду.

Несцяровіч 25 гадоў адпрацавала даяркай, неаднаразова ўзнагароджаная і не выходзіць думаць, што яна займаецца такой дыверсіяй — шкодзіць не толькі другім, але і сабе!

Хто там вінаваты, цяжка было ўстанавіць, толькі вось аднойчы Несцяровіч і С. сутыкнуліся на тым выгане.

— Навязала я карову і забралася дамоў, як тут насустрач ён ідзе. «Дакуль ты будзеш рэзаць мне вяроўкі?» — сказаў С. І, выхапіўшы нож, тут жа парэзаў на шматкі вяроўку, якую я трымала ў руках, затым прыставіў той нож да мяне і ў мяне аж мову адняло, пачаў мяне трэсці... падбег да маёй каровы і парэзаў вяроўку, на якой тая была навязана. «А цяпер можаш выклікаць міліцыю», — крыкнуў С. і пайшоў. «Я ўзялася фартухом карову прывязваць, а потым дома патэлефанавала ў міліцыю», — расказала пра той выпадак жанчына.

Як яно было насамрэч, невядома, бо сведкаў не было, але міліцыянеры прыязджалі і рабілі апытанне. І сапраўды, як сказалі ў Ляхавіцкім РАУС, на падставе гэтага факта завялі крымінальную справу.

Цяпер жанчына нічога не хоча, акрамя таго, каб даведацца: хто чалавека супраць яе падбухторыў?

Будзем лічыць, што праваахоўныя органы ва ўсім разбяруцца, але я хачу звярнуць увагу на тое, што канфлікт узнік паміж старымі людзьмі. С. ужо пад восемдзесят, і ён інвалід, і здавалася б, у такім узросце патрэбна быць больш разважлівым і стрыманым.

А разам з гэтым С. людзі хваляць ды ў пісьме напісана, што ён «... жыве на ўсю вёску — лепш за ўсіх. Трымае каня, карову, свіней, пчолаў многа пнёў». А калі так, за чалавека трэба парадавацца, бо ў такім узросце не кожны можа каня запрэгчы, а не тое каб яшчэ сена касіць.

А ці было выйсце з гэтага становішча? Можа, трэба было тых кароў навязваць на ланцуг, як гэта часта даводзілася бачыць, ці не пакідаць вяроўкі на ноч на выгане. Думаю , што такія захады неабходна было зрабіць.

З усяго гэтага канфлікту зразумела адно — людзям на старасці не хапае спакою. Жыццё вельмі кароткае, а калі ты даўно ўжо на пенсіі, то яно імгненнае — прылёг і не прыкмеціў, што душа ўжо за парогам.

І ў гэтым вяровачным канфлікце пераможцаў не будзе — прайграюць усе. Вось і павесткі ўжо прыслалі — трэба ехаць у райцэнтр...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Ляхавіцкі раён.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 23 декабря 2008 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Адрес земельного участка	Площадь	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1 ул. Алтайская	0,0563 га	50 лет	Строительство и обслуживание магазина смешанной группы товаров	740100000005003894	18 619 000	1 860 000
Лот № 2 ул. Жемчужная р-н жилых домов №№ 14, 20	0,0045 га	2 года	Установка и обслуживание павильона по продаже товаров бытовой химии	740100000002004840	627 000	62 000
Лот № 3 ул. Павлова, ост. «УЗ Могилевская Больница № 1»	0,0036 га	2 года	Установка и обслуживание павильона по продаже продовольственных товаров	740100000007004589	75 000	7 000
Лот № 4 р-н пересечения улиц Тенистой и Кленовой	0,0091 га	2 года	Установка и обслуживание торгового павильона по продаже продовольственных товаров	740100000007004588	211 000	21 000
Лот № 5 ул. Симонова (ограничения – 0,0176 га (водоохранная зона), 0,0066 га (водопровод)	0,0176 га	25 лет	Строительство и обслуживание модульно-блочной АГЗС	740100000005003906	3 056 000	305 000
Лот № 6 ул. Островского р-н жилого дома № 99	0,0057 га	2 года	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000006001974	228 000	22 000
Лот № 7 ул. Строителей, ост. «Универсам»	0,0093 га	2 года	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000003000290	602 000	60 000
Лот № 8 ул. Ангарская р-н жилого дома № 94/7	0,0014 га	2 года	Установка и обслуживание торгового киоска	740100000005001558	220 000	21 000
Лот № 9 пр-кт Шмидта, ост. «Проспект Шмидта»	0,0019 га	2 года	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005003523	90 000	8 000
Лот № 10 ул. Б. Бирули, ост. «Областная больница»	0,0068 га	2 года	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000001000165	348 000	34 000
Лот № 11 ул. Якубовского р-н жилого дома № 21	0,0062 га	2 года	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000001004487	461 000	46 000
Лот № 12 ул. Калиновского р-н жилого дома № 27а	0,0063 га	2 года	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000001004361	378 000	37 000
Лот № 13 ул. Кутепова, ост. «Магазин»	0,0034 га	2 года	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005001929	169 000	16 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

1) Копию платежного поручения, заверенную банком, о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

Индивидуальные предприниматели: паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Граждане – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметом аукциона.

3) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителю аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона. Ориентировочная сумма расходов составляет 18 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 17.12.2008 года до 15.00.

Контактный телефон в г. Могилеве: 22 11 63

Витебский областной центр маркетинга

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210025, г. Витебск, ул. «Правды», 32

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Целевое назначение	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона, руб.	Расходы, связанные с проведением аукциона, руб.	Дата, время и место проведения аукциона	Окончательный срок приема документов
1.	Земельный участок с кадастровым номером 221882206801000015, площадью 0,2140 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Малое Лосвидо	Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: 1) земли находятся в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы озера Лосвидо; 2) охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В	2 996 000	299 000 бел. руб. р/с 3600316023797 в ф-ле № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Городок, код 641, УНП 300066953, код платежа 04901, получатель платежа: Вайханский сельский исполнительный комитет	669 348	2 014 416	**30.12.2008 г. в 10.00** г. Городок, ул. Пролетарская, д. 2 в здании Городокского районного исполнительного комитета	22.12.2008 г. до 17.30
2.	Земельный участок с кадастровым номером 221882206801000016 площадью 0,1563 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Малое Лосвидо	Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земли находятся в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы озера Лосвидо	2 188 000	218 000 бел. руб. р/с 3600316023797 в ф-ле № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Городок, код 641, УНП 300066953, код платежа 04901, получатель платежа: Вайханский сельский исполнительный комитет	644 980	2 014 416	**30.12.2008 г. в 10.00** г. Городок, ул. Пролетарская, д. 2 в здании Городокского районного исполнительного комитета	22.12.2008 г. до 17.30
3.	Земельный участок с кадастровым номером 221887008601000074 площадью 0,1929 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Хоботы, ул. Озерная	Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земли находятся в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы озера Вымно	1 350 000	135 000 бел. руб. р/с 3600316083795 в ф-ле № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Городок, код 641, УНП 300066527, код платежа 04901, получатель платежа: Пальминский сельский исполнительный комитет	661 123	2 014 416	**30.12.2008 г. в 10.00** г. Городок, ул. Пролетарская, д. 2 в здании Городокского районного исполнительного комитета	22.12.2008 г. до 17.30
4.	Земельный участок с кадастровым номером 221887008601000075 площадью 0,1447 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Хоботы, ул. Озерная	Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: 1) земли находятся в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы озера Вымно; 2) охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В	1 013 000	101 000 бел. руб. р/с 3600316083795 в ф-ле № 207 ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Городок, код 641, УНП 300066527, код платежа 04901, получатель платежа: Пальминский сельский исполнительный комитет	653 456	2 014 416	**30.12.2008 г. в 10.00** г. Городок, ул. Пролетарская, д. 2 в здании Городокского районного исполнительного комитета	22.12.2008 г. до 17.30

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок; возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, и расходы по подготовке документации, необходимой для его проведения; осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него.

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 32, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане и юридические лица. Гражданин, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;
- для представителей гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер подснял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участка трижды и объявляет проданным земельный участок, а участника аукциона – победителем.

3. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на аукцион.

4. Физическое лицо, ставшее победителем аукциона, обязано представить справку налоговых органов об источниках денежных средств при совершении сделки на сумму, превышающую 2000 базовых величин.

5. Победитель аукциона обязан оплатить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, вне зависимости от дальнейшей оплаты за земельный участок в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона. В случае если Победитель аукциона в установленный срок не внес плату за земельный участок, то внесенный победителем задаток и оплата расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возврату не подлежат.

6. Контактный тел. (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz

БЕЛИНВЕСТБАНК

ЗАВЕРЕНО
Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 20 ноября 2008 г.

УТВЕРЖДЕНО
Протокол заседания Наблюдательного совета ОАО "Белинвестбанк" от 28.10.2008 № 62

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
об открытой продаже облигаций ОАО «Белинвестбанк» пятнадцатого выпуска

1. Полное и сокращенное наименование эмитента
на русском языке: полное – Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», сокращенное – ОАО «Белинвестбанк»;
на белорусском языке: полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Беларускі банк развіцця і рэканструкцыі «Белінвестбанк», сокращенное – ААТ «Белінвестбанк».

2. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего.
ОАО «Белинвестбанк» зарегистрировано постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 30.08.2001 г. № 232 за № 807000028, свидетельство о государственной регистрации от 03 сентября 2001 года.

3. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).
Место нахождения: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Машерова, 29, телефон (017) 289 35 89, факс (017) 289 36 70, e-mail: belbb@belinvestbank.by.

4. Сумма зарегистрированного уставного фонда, количество акций по категориям и типам.
Размер зарегистрированного уставного фонда Банка составляет 182 089 577 595 (сто восемьдесят два миллиарда восемьдесят девять миллионов пятьсот семьдесят семь тысяч пятьсот девяносто пять) белорусских рублей, который поделен на 984 267 987 (девятьсот восемьдесят четыре миллиона двести шестьдесят семь тысяч девятьсот восемьдесят семь) акций, в том числе 973 140 403 (девятьсот семьдесят три миллиона сто сорок тысяч четыреста три) простые (обыкновенные) акции и 11 127 584 (одиннадцать миллионов сто двадцать семь тысяч пятьсот восемьдесят четыре) привилегированные акции номинальной стоимостью 185 (сто восемьдесят пять) белорусских рублей каждая.

5. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента и сроки ее публикации.
Опубликование бухгалтерской отчетности Банка в составе, определенном законодательством, осуществляется в периодическом печатном издании «Рэспубліка» – не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.

6. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о пятнадцатом выпуске облигаций ОАО «Белинвестбанк» принято Наблюдательным советом ОАО «Белинвестбанк» 28.10.2008 г. (протокол № 62).

7. Дата и номер государственной регистрации облигаций.
Облигации пятнадцатого выпуска зарегистрированы в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь «20» ноября 2008 г., регистрационный номер 5-200-02-0209.

8. Вид, форма выпускаемых облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.
Вид, форма облигаций – именные, дисконтные, в бездокументарной форме (в виде записей на счетах), неконвертируемые.
Объем эмиссии облигаций пятнадцатого выпуска составляет 50 000 000 000 (пятьдесят миллиардов) белорусских рублей. К открытой продаже предлагаются 500 000 (пятьсот тысяч) облигаций. Облигациям присвоена серия «ОИ 15», номера «000001-500000».

9. Информация об обеспечении облигаций.
Облигации выпускаются в соответствии с п. 1.8 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».
Общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка.
Нормативный капитал Банка по состоянию на 01.10.2008 г. составляет 387 370,2 млн. белорусских рублей.

10. Номинальная стоимость облигаций.
Номинальная стоимость облигаций – 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

11. Цель выпуска облигаций.
Целью выпуска облигаций является привлечение временно свободных денежных средств юридических лиц для формирования ресурсной базы.
Владельцами облигаций могут быть юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

12. Период проведения открытой продажи облигаций.
Период проведения открытой продажи облигаций установлен с 27 ноября 2008 г. по 26 мая 2009 г.

13. Цена продажи облигаций.
Открытая продажа (размещение) облигаций производится по цене продажи, которая рассчитывается по формуле:

$$C = \frac{N \times 365(366) \times 100}{П \times К + 365(366) \times 100}, \text{ где}$$

С – цена продажи облигаций (белорусских рублей);
N – номинальная стоимость облигаций (белорусских рублей);
П – доходность, установленная при выпуске (13,5 % годовых);
К – количество дней со дня открытой продажи (размещения) облигаций до наступления срока их погашения. При этом день размещения и день погашения облигаций считаются одним днем.

14. Место и время проведения открытой продажи облигаций.
Открытая продажа облигаций пятнадцатого выпуска осуществляется в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, пр. Машерова, 29, Центральный банк):
- на внебиржевом рынке на основании договора открытой продажи (размещения) облигаций в течение рабочего времени (понедельник – четверг – с 8.30 до 17.30, пятница – с 8.30 до 16.15);
- на биржевом рынке в соответствии с регламентом торгового дня ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

15. Срок обращения облигаций.
Срок обращения облигаций пятнадцатого выпуска – 365 дней с даты начала открытой продажи облигаций до даты начала погашения.
Обращение облигаций осуществляется в установленном законодательством Республики Беларусь порядке через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» и (или) на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством.
Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 (пять) рабочих дней до даты начала погашения.

16. Размер и порядок определения размера дохода по облигациям, период начисления дохода, условия его выплаты.
Размер дохода при продаже облигаций на первичном рынке определяется исходя из доходности по облигациям, равной 13,5 (Тринадцать целых пять десятых) процентов годовых.
Доходом по облигациям является дисконт, который рассчитывается как разница между номинальной стоимостью облигации и ценой продажи облигаций.
Начисление дохода осуществляется со дня продажи облигации по 26.11.2009 включительно, исходя из фактического количества дней в году (365 или 366 в високосном году).
Выплата дохода осуществляется единовременно при погашении облигаций.

17. Дата начала погашения облигаций. Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций и порядок погашения облигаций.
Дата начала погашения облигаций – 27 ноября 2009 г.
Погашение облигаций производится на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления причитающихся денежных средств на счета владельцев облигаций в белорусских рублях в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Реестр владельцев облигаций формируется по состоянию на 20.11.2009 г.
При погашении облигаций их владельцам выплачивается номинальная стоимость облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

18. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения (выкуп).
Банк имеет право выкупить свои облигации в течение всего срока обращения облигаций по цене, определяемой по формуле:

$$Св = \frac{N \times 365(366) \times 100}{П \times К + 365(366) \times 100}, \text{ где}$$

Св – цена выкупа облигаций (белорусских рублей);
N – номинальная стоимость облигаций (100 000 белорусских рублей);
П – доходность, установленная при выпуске (13,5 % годовых);
К – количество дней, оставшихся со дня выкупа облигаций до даты наступления срока их погашения.
Для осуществления продажи банку облигаций до даты начала их погашения владелец облигаций пятнадцатого выпуска представляет в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, пр. Машерова, 29, Центральный банк) заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
полное наименование владельца облигаций;
номер выпуска и количество облигаций, предъявляемых к выкупу до даты начала их погашения;
банковские реквизиты для зачисления денежных средств от продажи облигаций;
наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, при посредничестве которого будет осуществляться продажа облигаций через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» – в случае выкупа облигаций в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа»;
согласие с условиями и порядком приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения, изложенными в зарегистрированном Проспекте эмиссии облигаций пятнадцатого выпуска;
юридический адрес и контактные телефоны заявителя;
подпись владельца облигаций (уполномоченного лица владельца облигаций).
В течение 5 дней с момента подачи клиентом заявления Банк принимает решение о досрочном выкупе облигаций. В случае положительного решения оплата за выкупленные облигации производится в течение 10 дней с момента подачи заявления клиентом на основании соответствующего договора.
Заявление может быть передано по факсу (017) 289 36 33, (017) 289 36 63 с обязательным представлением оригинала в течение 3 (Трех) дней от даты передачи заявления по факсу.
Банк имеет право осуществлять следующие операции с выкупленными облигациями:
- продажу на вторичном рынке по цене, определяемой Банком;
- досрочное погашение облигаций пятнадцатого выпуска – в случае выкупа всего объема эмиссии облигаций пятнадцатого выпуска.

19. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь или отказе эмитента от выпуска облигаций.
При отказе от выпуска облигаций, запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь денежные средства, внесенные в их оплату, возвращаются инвесторам не позднее 30 дней со дня принятия соответствующего решения с уплатой процентов за фактический срок пользования денежными средствами по процентной ставке, равной 13,5 % (тринадцать целых пять десятых) процентов годовых в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

20. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций ОАО «Белинвестбанк» пятнадцатого выпуска.
С проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в течение рабочего времени в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, пр. Машерова, 29), а также на сайте ОАО «Белинвестбанк» www.belinvestbank.by. Телефоны для справок о продаже облигаций: (8 017) 289 35 14, 239 01 36, 289 36 88.

Председатель Правления ОАО «Белинвестбанк» **А.Е. Рутковский**

Главный бухгалтер ОАО «Белинвестбанк» **А.Н. Сырокваш**

www.belinvestbank.by.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка РБ № 3 от 27.10.2006 г., УНП 807000028

У ПАРЫЖ! НА МСЦІСЛАЎШЧЫНУ...

Свой кут

У старажытным горадзе на беларуска-расійскай мяжы ёсць свае Парыж, Лондан, Рым, Эрмітаж, Версаль і Шанхай.

Парыж — гэта двухпавярховы дом з чырвонай цэглы і з вялікім балконам. У традыцыйным мсціслаўскім стылі, да гэтага месца нібыта цягнуцца гістарычныя ніці з розных эпохаў.

Насупраць Парыжа — старажытны барочны будынак іезуіцкага касцёла і калегіума, узведзены ў першай палове XVIII стагоддзя.

У самім Парыжы напрыканцы XIX стагоддзя размясціўся орган мясцовага самакіравання — павятовы дваранскі сход. Тут збіраліся самыя ўплывовыя людзі Мсціслава, каб кіраваць установамі, уладжваць саслоўныя пытанні і звяртацца з дзяржаўнымі праблемамі да губернатара, міністраў і нават самога цара!

— Менавіта ў той час і ўзнікла назва будынка, — расказаў дырэктар Мсціслаўскага раённага гісторыка-археалагічнага музея Уладзімір Шылянкоў. — Таму што другі яго паверх займаў прыватны гатэль «Парыж». У адпаведнасці з назвамі іншых мсціслаўскіх гатэляў — «Берлін», «Эрмітаж», «Новы свет», «Арол» — мсціслаўцы называлі і самі будынкі. Тады гэта было модна, давала адчуванне культурнай блізкасці да Еўропы і ўсяго свету.

У XX стагоддзі за савецкай уладай у Парыжы жылі студэнты Мсціслаўскага педагагічнага тэхнікума. Створаны ў перыяд беларусізацыі, тэхнікум меў рэпутацыю вельмі прыстойнай навучальнай установы, да якой мелі дачыненне знакамітыя беларускія пісьменнікі. Якуб Колас і Максім Гарэцкі тут чыталі лекцыі, вучыўся Аркадзь Куляшоў, Кандрат Крапіва браў удзел у стварэнні літаратурнай студыі «Маладняк». Тэхнікуму паклалі канец сталінскія рэпрэсіі.

Паводле успамінаў, свой інтэрнат студэнты тэхнікума з задавальненнем называлі Парыжам. Як і сённяшнія мсціслаўцы. Справа ў тым, што цяпер на будынку ёсць нават шыльда «Парыж». Менавіта так, паводле гістарычнай традыцыі, чатыры гады таму назвала сваю цырульню мясцовая прадпрымальніца.

— Стрыгчыся ў «Парыжы» — модна! — без сумневу заявіла майстар цырульні Таццяна Сулейка. — Так і гавораць мясцовыя: маўляў, прыбралася ў Парыжы. Ці не цікава? Наш салон карыстаецца попытам.



Мсціслаўскі Парыж — прыгожы будынак і модная цырульня

— Гэта самая добрая цырульня ў горадзе, але арыгінальная назва да гэтай высновы, на мой погляд, не мае дачынення, — выказалася клієнтка, якой старанна фарбавалі валасы ў актуальны рыжа-карычневы колер. — Тут добрыя майстрыхі, ветлівае абслугоўванне, якасная парфума. Так што я па абнаўленне знешнасці — толькі ў «Парыж».

Напрыканцы гэтага года ў мсціслаўскім «Парыжы» модная класіка: прамыя густыя грыўкі, роўныя стрыжкі, спакойныя фарбы. Цэны ў салоне мсціслаўскія прыгажуні лічаць даступнымі: жаночая стрыжка з сушкай каштуе каля 12 тысяч рублёў.

Маладым майстрыхам падабаецца назва месца працы: яны любяць шакіраваць новых знаёмых паведамленнямі пра месца працы. «Дзе ты працуеш?» — «У «Парыжы»!» — ???..

Назвамі будынкаў у Мсціславе карыстаюцца і вельмі сур'ёзныя людзі: кіраўнікі розных арганізацый і ўстаноў. Аднойчы, гавораць, дарожнікі зрабілі справаздачу: «Заасфальтавалі дарогу ад Парыжа да Лондана». Усім мсціслаўцам гэта фраза зразумелая.

Лондан — гэта назва яшчэ аднаго будынка. Мсціслаўскі Лондан месціцца на вуліцы Пралетарскай, якая калісьці насіла назву рускага імператара Аляксандра II. Да рэвалюцыі на першым паверсе была павятовая воінская ўправа, а на другім — мэбляваныя пакоі гатэля «Лондан», і гэту назву будынак захаваў да нашых дзён. Гавораць, што аднавілі не кемлівыя студэнты педтэхнікума: маладыя людзі палічылі дарэчным назваць цэнтр культурнага жыцця савецкага Мсціслава імем еўрапейскай сталіцы, дзе ёсць легендарны бульвар Капуцынаў.

— Сапраўды, у першыя гады савецкай улады тут месціўся кінатэатр «Люкс», — пацвердзіў Уладзімір Шылянкоў. — А перад самай вайной яго змяніла школа медыцынскіх сясцёр, дзе, дарэчы, вучылася мая бабуля. Пасля вайны ў Лондане была школа жывёлаводаў, потым — бухгалтараў, а яшчэ пазней — вучылішча сувязі.

Сёння Лондан рамантуецца — хутка там будуць жыць людзі. Як цяпер і большая частка плошчы Парыжа стала жылой. Гэта элітнае жыллё сучаснага Мсціслава, пасля рамонту — з усімі выгодамі.

Версаль у Мсціславе мала хто памятае. Так пасля рэвалюцыі называўся драўляны дом, у якім жылі выкладчыкі педтэхнікума. Гавораць, што гэта быў своеасаблівы жарт студэнтаў: сціплая будыніна, дзе жылі паважаныя педагогі, атрымала з іх «лёгкіх языкоў» каралеўскую назву.

Рым — назва з новай мсціслаўскай гісторыі перыяду другой паловы XX стагоддзя. І не аднаго будынка, а цэлага квартала, недзе паміж Парыжам і Лонданам. У Мсціславе гэта лічаць мясцовым гумарам: чатыры двухпавярхоўкі часоў Хрушчова з выгодамі на вуліцы называлі як Вечны горад.

Шанхай — гэта Мсціславскі раён, які калісьці быў самай ускраінай горада. У хлібных хатах сяліся бедната: у адной кватэры тулілася дзве-тры сям'і. Тут жылі людзі розных нацый і веравызнанняў, прыладжваліся адзін да аднаго і суіснавалі. Сапраўдны Шанхай.

— Гэта, безумоўна, народная назва, — патлумачыла супрацоўніца раённага музея Валянціна Цімашкова. — Яна, як і назвы іншых раёнаў і будынкаў, захавалася да нашых дзён. Няхай змест і мяняецца, але назва застаецца. Некаторыя сціраюцца з цягам часу з памяці людзей, а некаторыя застаюцца як подых жывой гісторыі.

— Па-мойму, гэта вельмі рамантычна — называць будынкі прыгожымі імёнамі культурных сталіц, — лічыць жыхар Мсціслава. — У нас старажытны горад, гэта добрая традыцыя, адметны стыль.

Дарэчы, насупраць Лондана ёсць яшчэ адзін імянны будынак. Гэта Эрмітаж, таксама паводле назвы дарэвалюцыйнага гатэля. Цяпер гэты будынак рыхтуецца да рэстаўрацыі, пасля там размесціцца школа мастацтваў. Цяпер ў Мсціславе мяркуюць: а чаму б гэтую школу афіцыйна не назваць «Эрмітажам»? Назва пасуе культурнай установе, і працягнецца яшчэ адна ніць з гісторыі ў сучаснасць прыгожага старажытнага горада.

Ілона ІВАНОВА,
г. Мсціслаў.

ДАМАВІК

Дамавік (дамавойка, хатнік, запечнік, гаспадар, батухна, кармілец) — дух і ахоўнік, і ў той жа час — крыўдзіцель хаты, яе жыхароў, гаспадаркі, свойскай жывёлы.

Нашы продкі былі перакананыя ў існаванні дамавіка. Адсутнасць дамавіка ў хаце, на іх погляд, вяло гаспадарку да заняпаду, прадказвала смерць жыхароў хаты. Казалі: «Без дамавіка хата стаяць не будзе». Дамавік звычайна ўспрымаўся як руплівы, клапатлівы гаспадар, які дапамагае працавітай і дружнай сям'і. Тых, хто дрэнна вёў гаспадарку, не турбаваўся аб чысціні і парадку, ленаваўся, ён пужаў, па-свойму шкодзіў ім.

● Дамавік ва ўсім дапамагаў сваім хатнім: уначы ахоўваў гаспадарку ад рабаўнікоў, падтрымліваў полымя ў печы, даглядаў жывёлу, сушыў зерне і г.д. У народзе пра дамавіка казалі так: «Каго палюбіць, таму і служыць так, быццам у кабалу пайшоў, а ўжо каго не ўпадабае, дык зжыве са свету».

● Калі раззлаваць дамавіка дрэннымі ўчынкамі, невыкананне некаторых рытуальных забаронаў і абмежаванняў, ён пачынаў шкодзіць жыхарам хаты: біў посуд, хаваў рэчы, не даваў спаць, напрыклад, мог скінуць кошку з печы сярод ночы, сарваць коўдру і г.д. Сярод прычын, за якія мог пакараць дамавік, былі і такія: калі хтосьці сварыўся ў хаце, хляве ці на падворку, выкарыстоўваючы мацерныя словы, калі гаспадыня спала без сподняга, калі ў хаце было нехрышчонае дзіця, калі гаспадар гасіў святло, калі жанчына выходзіла з хаты з распушчанымі валасамі, калі клаліся спаць без вячэры, калі працавалі ўначы і яшчэ шмат чаго.

● Нашы продкі меркавалі, што кожнай хаце Бог дасылае свайго дамавіка. У той жа час пры пераездзе ў новую хату гаспадар абавязкова клікаў за сабой дамавіка, з якім жыў у згодзе ў старой хаце: «Дамавік, дамавы, не заставайся тут, а ідзі разам з нашай сям'ёй». Сям'ю, якая не паклікала з сабой дамавіка, у новай хаце чакалі няшчасці і галеча. Каб дамавік перайшоў у новую хату, са старой трэба было ўзяць гаршчок з вугельчыкамі, стары лапаць, стары венік і дзяжу з цестам. А часам рабілі і так: «Трэба паскрэбсці пад парогам хаты, сабраць смецце і высыпаць яго ў новай хаце: не заўважыш, як са смеццем трапіць на новае месца і «сам гаспадар».

● У дамавіка ў кожнай хаце было сваё «месца жыхарства». Напрыклад, на печы, за комінам, на гарышчы, пад дахам, у парозе, у падполле. Лічылася, калі заняць «любімае» месца дамавіка — легчы туды самому, пакласці туды якія-небудзь рэчы, мяхі з зернем і г.д., можна захварэць і сканаць.

● Як і ўсе дэманічныя істоты і сілы, дамавік з'яўляўся ўначы. Асаблівую актыўнасць ён праяўляе ў дні ўшанавання продкаў, а таксама на Раство і Купалле.

● Па ўяўленнях нашых продкаў, 13 красавіка дамавік «гарэзуе» — не пазнае сваіх хатніх, шкодзіць, крыўдзіць хатнюю жывёлу. Таму ў гэты дзень неабходна было раней легчы спаць, перад гэтым старанна закрыўшы свойскую жывёлу і птушку.

● Асаблівае стаўленне было да дня святой Фядоры, якая ўшаноўваецца 9 чэрвеня. Народныя знахары сцвярджаюць, што той, хто напярэдадні ўвечары будзе месці падлогу, назаўсёды «змяце» са сваёй хаты «гаспадара», а хатнія захварэюць.

● На працягу года трэба было не аднойчы «задобрыць» свайго хатняга «гаспадара» — на ноч паставіць на стол гасцінцы: чарку гарэлкі, кубак малака, спецыяльна для гэтага звараную салодкую кашу, акрайчык хлеба і г.д. Калі пакідалі пачастункі, казалі: «Гаспадар — бацюхна, паберажы мой дом, маіх родных, маю скаціну, а мы табе ўдзячныя будзем». Лічылася, калі дамавік прымаў гаспадарскія падарункі, то раніцай можна было заўважыць «сляды» яго трапезы і адчуць, як змянілася атмасфера ў хаце. Сярод такіх дзён былі Калядныя дні, 26 і 28 студзеня, 10 і 16 лютага, Вялікдзень і Купалле.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Чаму большасць уладальнікаў кватэр, якія здаюцца ў арэнду, у глыбіні душы лічаць, што ўсе, хто хоча зняць кватэру, павінны быць багатымі, стэрыльнымі, бяздзетнымі, нелюдзімымі, глуханямымі, імпатэнтамі?..

☺

У камп'ютаршчыка захварэла жонка — моцны насмарк. Тэлефануе яе сяброўка:
— Дзіма, як сябе адчувае Леначка?
— Малюнак нядрэнны. Гук толькі няважны...

☺

Хочаце, каб вашы дзеці раслі здаровымі і паслухмянымі?
Педыятры рэкамендуюць даваць дзецям «Рамніш-ку».

☺

Я ганаруся сваім уменнем рабіць некалькі спраў адначасова. Вось і сёння: не толькі бялізну папрасавала, але і з сынам вершык вывучыла, і катлетак на вячэру напаліла...

☺

— Доктар, я наркаман.
— У вас з сабой?
— Як дамаўляліся.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.57	15.56	7.59
Віцебск —	7.53	15.40	7.47
Магілёў —	7.48	15.46	7.58
Гомель —	7.37	15.50	8.13
Гродна —	8.11	16.12	8.01
Брэст —	8.04	16.20	8.16

Месяц
Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны
Пр. *Германа, Івана, Нікіфара.*
К. *Катарыны, Кандрата, Леанарда, Лявона, Сільвестра.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

Варшава	+2..+4°С	Кіеў	0..+2°С	Рыга	+6..+8°С
Вільнюс	+3..+5°С	Масква	-1..+1°С	С.-Пецярбург	0..+2°С

Дзве даты

26 лістапада

1812 год — у мястэчку Стараселле (тэрыторыя сённяшняга Шклоўскага раёна) размясцілася штаб-кватэра галоўнакамандуючага рускай арміі М.І. Кутузава. Менавіта тут ён аддаў загад аб аперацыі на Бярэзіне, якая пачалася ў той жа дзень. Французская армія пацярпела сакрушальнае паражэнне ў час пераправы цераз Бярэзіну каля вёскі Студзёнка. Страціўшы каля 70 тысяч чалавек, вялікая армія Напалеона перастала існаваць як арганізаваная баявая сіла.

1939 год — урад СССР заявіў, што фінскай артылерыяй абстраляны ўчастак савецкай мяжы. Насамрэч ніякага абстрэлу з боку фінаў не было, а гэтая правакацыйная заява стала нагодай да развязвання савецка-фінскага ўзброенага канфлікту, які доўжыўся 105 дзён. У ім, паводле афіцыйных звестак, было задзейнічана больш як 500 тысяч фінскіх салдатаў (уключаючы добраахвотнікаў са Швецыі, Данії і Нарвегіі) і каля 1 млн чалавек асабовага складу Чырвонай Арміі. Абодва бакі панеслі цяжкія страты. СССР страціў на гэтай вайне (забітых, памерлых, прапаўшых без вестак) амаль 127 тысяч чалавек, а параненых, кантужаных, абмарожаных і палонных — яшчэ 271 тысячу (усяго — амаль 400 тысяч з арміі ў 1 мільён чалавек!). Страты фінскіх войскаў склалі: 48 тысяч забітых, 45 тысяч параненых і 806 чалавек палонных — усяго каля 100 тысяч чалавек, ці 20 працэнтаў ад агульнай колькасці сваіх вайскоўцаў, якія ўдзельнічалі ў канфлікце.

Цытата дня:

«Выпадковая сустрэча з добрай кніжкай можа назаўсёды змяніць лёс чалавека».

Эжэн Марсель Прэво (1862-1941), французскі пісьменнік.

ВЫКРАЛІ ТРАКТАР

21 лістапада ў Магілёўскім раёне распачата крымінальная справа супраць трох маладых мужчын — 22, 23 і 26 гадоў, якія абвінавачваюцца ў выкраданні трактара.

Паводле паведамлення міліцыі, нецвярозыя рабочыя прыватнай фірмы сярод белага дня ў вёсцы Мяжысеткі выкралі трактар МТЗ ад прыхадной прадпрыемства, якое вырабляе мяса птушкі. Выкрадальнікаў літаральна праз дзясятак хвілін спыніў вартаўнік, трактар вярнуўся гаспадарам. А маладыя людзі затрыманыя: за кароткую вандроўку на чужым трактары ім пагражае пазбаўленне волі ад 7 да 10 гадоў.

Алена КАЗЛОВА.

І НАПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА. І СЛОВА БЫЛО — БЕЛАРУСЬ

Аўтар цікавых дзіцячых і гістарычных кніг, публіцыст, крытык, перакладчык Анатоль Бутэвіч адзначыў сваё шасцідзесяцігоддзе. У Доме дружбы павіншаваць юбіляра прыйшло шмат гасцей — аднакурснікаў, калег па творчым «цэху» і проста даўніх добрых сяброў. «Звязда» віншуе Анатоля Іванавіча і жадае плённай працы на доўгія гады.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

АДДАЛІ ДАНІНУ ПАМЯЦІ

Акцёры тэатра юнага гледача Рэспублікі Саха (Якуція), удзельнікі Міжнароднага фестывалю тэатральнага мастацтва «Славянскія тэатральныя сустрэчы», пабывалі ў вёсцы Дзяражычы Лоеўскага раёна і аддалі даніну памяці свайму земляку, Герою Савецкага Саюза Фёдару Папову. Ён пахаваны тут у брацкай магіле. У кнізе «Памяць. Лоеўскі раён» можна знайсці звесткі пра якута Фёдара Папова. У верасні 1943 года ён вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Брагінскім раёне, а ў кастрычніку таго ж года загінуў. У сваім апошнім баі Фёдар Папоў уплаў пераправіўся праз Днепр, кінуўся ў варожую траншэю, з дапамогай гранат і аўтамата знішчыў 23 гітлераўцы, захапіў кулямёт і пачаў прыкрываць таварышаў. Праз некаторы час 81-я стралковая дывізія перайшла ў контрнаступленне. Фёдар Папоў загінуў ад кулі ворага.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У ФОРМЕ

Для сучаснага контрразведчыка моцнае здароўе і спартыўная падрыхтоўка — гэта не толькі два пункты ў рэгламенце службовага часу, гэта — актыўны лад жыцця, які і быў прадэманстраваны на спартыўным свяце ўдзельнікамі калектываў фізічнай культуры органаў дзяржбяспекі Рэспублікі Беларусь. У барацьбе за галоўны прыз з розных куткоў краіны сышліся прадстаўнікі шасці камандаў. 200 чалавек спаборнічалі ў «дзевяцібор'і» — гіравы спорт, настольны тэніс, шахматы, камбінаваная сямейная эстафета. Магчымасці фізічнай падрыхтоўкі прадэманстравалі байцы групы «Альфа» і калектыў «Юны дынамавец».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДЗЕЦІ ЯК ЛЮСТЭРКА БАЦЬКОЎ

Прамая лінія

На пытанні чытачоў адказвала асістэнт кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Іна ПЯТНІЦКАЯ.

(Працяг. Пачатак за 21, 22, 25 лістапада.)

☎ — Вікторыя з Брэста. Дзяўчынцы — 6,5 года. Яна ўздрыгвае ад нечаканага шуму. Мае бацькі кажуць, трэба паказаць бабулі, якая пашэпча… А што вы параіце? Ці можна дзецям прымаць заспакаяльныя прэпараты?

— Паказваць дзіця бабцы ці не — цалкам ваша асабістая справа. Наўрад ці гэта здольна нашкодзіць дзіцяці. Іншая справа, я не бачу асаблівай праблемы ў дадзеным выпадку. Уздрыгванне можа быць проста індывідуальнай рэакцыяй на нечаканыя моманты. Нічога страшнага тут няма. Што датычыцца прэпаратаў, то хімічныя звычайна дзецям не прызначаюць, а гамеапатычныя — цалкам бяспечныя для іх. Прымяняюць і фізіятэрапію. Аднак усё гэта павінен прызначыць урач-педыятр. Нават валяр'яну без рэкамендацыі ўрача я даваць не раіла б, паколькі некаторыя дзеці даюць на яе ўжыванне парадаксальны эфект — горш засынаюць, становяцца ўзрушанымі.

☎ — Святлана, Мінск. Сыну 13 гадоў. Ён захапляецца танцамі і лянуецца вучыцца. Не хоча чытаць. Кажа, што поспехі ў вучобе не вызначаюць поспехаў у далейшым жыцці… Асабіста я — выдатніца па ўсіх накірунках, усе навучальныя ўстановы заканчвала з выдатнымі адзнакамі. Сын жа спасылаецца на бацьку, які хоць і не мае вышэйшай адукацыі і наогул у школе і вучылішчы вучыўся не так добра, але ж зарабляе цяпер прыстойныя грошы… Як пераканаць сына ў неабходнасці добра вучыцца?

— Перад вашым сынам — два прыклады паспяховасці. Маці, якая мае чырвоны дыплом, але атрымлівае, як я разумею, меншы заробак, і бацька, які не можа пахваліцца выдатнымі вынікамі ў вучобе, але зарабляе асноўныя грошы для сям'і. Пазіцыю хлопчыка можна зразумець. Тым больш, што для хлопчыкаў звычайна больш аўтарытэтным з'яўляецца бацька. Таму ў першую чаргу вам неабходна пагутарыць з бацькам. Ён павінен прывесці канкрэтны прыклад. Маўляў, пры такім узроўні адукацыі я дасягнуў такога жыцця, а пры іншым было б яшчэ лепш. Наогул бессэнсоўна гаварыць дзецям, каб яны вучыліся ці паводзілі сябе лепш за нас, таму што так некаму лепш ці некаму трэба і г.д. Калі хочаш, каб дзіця цябе слухала і выконвала твае парады, пакажы прыклад адпаведных паводзінаў.

☎ — З Оршы турбуюць вас… Ірына Антонаўна. Мы з мужам разышліся, калі дачцэ было 14 гадоў… Які ўплыў мае скасаванне шлюбу на дзіця? Ці праўда, што такія дзеці больш лаяльна ставяцца да разрыву адносінаў у сваім асабістым жыцці?

— Найбольш цяжка на расстанне бацькоў рэагуюць дзеці 6-8 гадоў. Хоць, безумоўна, такая сітуацыя для дзіцяці любога ўзросту ёсць псіхатраўма, нават калі для такога раскладу падзей ёсць падставы, і дзіця займае пазіцыю мамы. Самы аптымальны варыянт, калі дзіцяці тлумачаць, што ад скасавання шлюбу яно нічога не страчвае, што ў яго застаюцца і тата, і мама. Надалей усё будзе залежаць ад таго, як будуць паводзіць сябе бацькі. Ці будзе маці абмяркоўваць былога мужа са сваімі сяброўкамі, называць яго нядобрымі словамі… Калі так, то ў дзяўчынкі намалюецца не лепшы вобраз мужчыны, і ў рэшце рэшт яна будзе ставіцца да мужчын, як маці. І знаходзіць для сябе менавіта гэткіх — не лепшых. Важна і тое, як бацька будзе падтрымліваць адносіны з дзіцем… Дзеці, сапраўды, часцей паводзяць сябе так, як паводзілі сябе іх бацькі, ідуць іх шляхам. Але бывае, калі пасля цяжка перанесенай сітуацыі чалавек дае сабе слова, што яго дзеці не пройдуць праз гэтае пекла, і імкнуцца не паўтараць бацькоўскіх «памылак». Прыкладна тое ж адбываецца і з дзецьмі асобаў, якія злоўжываюць алкаголем. Такія дзеці потым або самі співаюцца, або надзвычай варожа ставяцца да алкаголю і нават не дакранаюцца да яго наогул. Але другі варыянт сустракаецца радзей. Усё ж такі стэрэатып паводзінаў вельмі жывучы: прасцей ісці знаёмым шляхам.

— Дарэчы, а што б вы параілі жанчыне, якая жыве з мужам-алкаголікам — забыцца на яго ці трываць дзеля дзяцей?

— Скасаванне шлюбу, як мы сказалі вышэй, з'яўляецца вострай сітуацыяй і, адпаведна, псіхатраўмай для дзіцяці. Але пражыванне з бацькам-алкаголікам пад адным дахам — псіхатраўма, расцягнутая ў часе. Можна пераступіць цераз гэту сітуацыю, і забяспечыць дзіцяці больш прыстойнае існаванне. І нічога дрэннага няма ў тым, каб узорам мужнасці для дзіцяці стаў «новы» тата… Жанчына павінна вырашаць сітуацыю ў першую чаргу для сябе. Ахвяры, якія жанчыны прыносяць, як яны мяркуюць, дзеля дзяцей, насамрэч нікому не патрэбныя. Дзеці часам не толькі не цэняць гэта, але і скажуць потым, што не прасілі вас трываць, і рады былі б, каб маці прыняла рашэнне аб разводзе.

Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

КЕФІРНАЯ ЛЮБОЎ — З ПЕРШАГА ГЛЫТКА

Інфарм-укол

Паводле меркавання тайваньскіх вучоных, ужыванне кефіру зніжае верагоднасць развіцця харчовай алергіі ў дзяцей. Па іх звестках , некаторыя кампаненты гэтага малочнага напою здольныя знізіць узровень імуналабулінаў, якія правакуюць алергічныя рэакцыі — ацёкі тканак, гіперсакрэцыю слізістых залоз, раздражненне скуры.

◆ Кефір асвяжае. Спірт, вуглякіслы газ і лятучыя кіслоты фарміруюць яго злёгку востры дражджавы смак, крыху асвяжаюць, а за кошт малочнай кіслаты кефір добра спаталяе смагу.

◆ Кефір абуджае апетыт. Па частцы спрыяльнага ўплыву на страўнікава-кішачны тракт ён апярэджвае іншыя кісламалочныя прадукты, з-за наяўнасці вугальнай кіслаты змяншае раздражняльнасць слізістай абалонкі страўніка і спрыяе лепшаму ўсмоктванню ежы.

◆ «Кефір дапамагае ад сэрца», — гаварыў Панікоўскі ў фільме «Залатое цяля», і меў рацыю. Гэты напой багаты на калій.

◆ Кефір выратоўвае пры сіндроме хранічнай стомленасці. А таксама пры парушэнні сну і неўрозах, бо валодае заспакаяльным уздзеяннем. Надае бадзёрасці і нават паляпшае памяць.

◆ Кефір дапамагае падчас прастуды. Ён заспакаяльна ўздзейнічае на крывяносную і нервовую сістэмы, з-за чаго дыханне становіцца больш свабодным.

◆ Кефір уваходзіць у склад большасці дыет. Напой спрыяе імклівому вывядзенню шлакаў з арганізма. Гэта нізкакаларыйны прадукт з нізкім узроўнем утрымання вуглявадаў. Ён настолькі карысны, што яго складовыя часткі (малочны тлушч, бялок, лактоза, вітаміны, мінеральныя рэчывы і жывыя бактэрыі) дазваляюць рабіць для нашага арганізма разгрузкі. Заўважна адступае і пачуццё голаду.

◆ Кефір — пастаўшчык кальцыю і фосфару. А значыць, карысны для зубоў і касцей, і асабліва для арганізмаў, якія растуць.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в частную собственность для индивидуального жилищного строительства
Организатор аукциона — Чапаевский сельский исполнительный комитет

Номер лота	1
Адрес земельного участка (кадастровый номер)	Верхнедвинский район, д. Волесы (221089201601000002)
Площадь участка, га	0,15
Целевое назначение	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома
Условие проведения аукциона	наличие не менее двух участников
Ограничения в использовании участка	на площадь 0,15 га — водоохранная зона водного объекта (озеро Лисно, река Свольно) вне прибрежных полос
Инженерная инфраструктура	участок расположен в зоне жилой усадебной застройки, существует возможность подключения к сетям энергоснабжения
Начальная цена, рублей	35 360
Сумма задатка, рублей	3540
Расходы, связанные с организацией, проведением аукциона, рублей	486318 (кроме того, расходы по размещению настоящего извещения в СМИ)

1. Аукцион состоится **29 декабря 2008 г.** в 15 часов в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний).

2. Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) подает заявление об участии в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который желает приобрести в частную собственность, а также заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на р/с 3600313101016 в ф. 206 АСБ «Беларусбанк» г. Верхнедвинска, МФО 150801638, УНП 300062759, получатель — Чапаевский сельисполком, назначение платежа 04002, также необходимо подписать установленной формы соглашение с организатором аукциона. Кроме того, представляются: гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителям гражданина — нотариально удостоверенная доверенность, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются по рабочим дням с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по **20 декабря 2008 г.** (включительно) в Чапаевском сельисполкоме по адресу: Верхнедвинский район, п. Чапаевский. Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.45 в день аукциона по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, каб. 22.

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

5. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за выкуп земельного участка, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка, а также затраты на подготовку и проведение аукциона; в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о передаче земельного участка в частную собственность осуществить государственную регистрацию права на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью его предоставления.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

7. Контактный телефон: 8 (02151) 28975.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

на право заключения договора аренды земельного участка
Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210025, г. Витебск, ул. «Правды», 32

Витебский областной центр маркетинга

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» проводит аукцион на право заключения договора аренды земельного участка

№ лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка, его площадь	Функциональное назначение земельного участка, срок аренды	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона, руб.	Расходы, связанные с проведением аукциона, руб.	Возмещение потерь сельскохозяйственного производства, руб.	Дата, время и место проведения аукциона	Окончательный срок приема документов
1.	Земельный участок с кадастровым номером 240100000003004819, расположенный по адресу: г. Витебск, ул. Новоршанская, площадь 0,5251 га	Земельный участок для размещения объекта «Многофункциональное торгово-офисное здание по ул. Новоршанской в г. Витебске». Срок аренды 99 лет. С условием введения объекта в эксплуатацию не позднее 2-х лет со дня заключения договора аренды земельного участка	Наличие централизованного газоснабжения, водоснабжения, водоотведения, теплоснабжения, доступ улиц с твердым покрытием, земли расположены в пешеходной (5-10 мин.) доступности остановок городского и пригородного пассажирского транспорта. Ограничения: 1) земли находятся в охранной зоне канализационного коллектора, в охранной зоне линии связи и радиофикации, линии электропередачи напряжением до 1000 В, в санитарно-защитной полосе водоема	309 666 803	30 966 000 на р/с 3012000009137 в филиале № 201 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Витебск, МФО 150801259, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга»	770 511	7 831 560	—	29.12.2008 г. в 15.00	20.12.2008 г. до 17.30
1.	Земельный участок с кадастровым номером 221880418601000164, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, д. Смоловка, площадь 1,5206 га	Земельный участок под размещение объекта агроэкотуризма. Срок аренды 99 лет.	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: 1) земли находятся в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (река Овсянка); 2) охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В	706 862	70 000 на р/с 3602316001430 в ф-ле № 207 АСБ «Беларусбанк» г. Городок, МФО 150801641, УНП 300066448, код платежа 04002, получатель платежа: Городокский районный исполнительный комитет	779 686	2 310 973	9 745 930	**30.12.2008 г. в 10.00** г. Городок, ул. Пролетарская, д. 2 в здании Городокского районного исполнительного комитета	22.12.2008 г. до 17.30
2.	Земельный участок с кадастровым номером 221880417801000013, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, д. Село, площадь 1,7717 га	Земельный участок под размещение базы отдыха. Срок аренды 99 лет.	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земли находятся в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (озеро Тиосто)	823 584	82 000 на р/с 3602316001430 в ф-ле № 207 АСБ «Беларусбанк» г. Городок, МФО 150801641, УНП 300066448, код платежа 04002, получатель платежа: Городокский районный исполнительный комитет	743 460	2 310 973	85 259 250	**30.12.2008 г. в 10.00** г. Городок, ул. Пролетарская, д. 2 в здании Городокского районного исполнительного комитета	22.12.2008 г. до 17.30
3.	Земельный участок с кадастровым номером 221886201601000012, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Межанский с/с, д. Долганы, площадь 1,9427 га	Земельный участок под размещение базы отдыха. Срок аренды 99 лет.	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земли находятся в водоохраной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (озеро Сосно)	903 075	90 000 на р/с 3602316001430 в ф-ле № 207 АСБ «Беларусбанк» г. Городок, МФО 150801641, УНП 300066448, код платежа 04002, получатель платежа: Городокский районный исполнительный комитет	774 359	2 310 973	26 345 310	**30.12.2008 г. в 10.00** г. Городок, ул. Пролетарская, д. 2 в здании Городокского районного исполнительного комитета	22.12.2008 г. до 17.30
ККУП «Витебский областной центр маркетинга» проводит повторный аукцион на право заключения договора аренды земельного участка										
1.	Земельный участок с кадастровым номером 221285912601000013, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Сущево, площадь 0,0281 га	Земельный участок для размещения объекта «Остановочный павильон с торговым павильоном в деревне Сущево». Срок аренды 10 лет.	Возможность подключения электро- газоснабжения, участок примыкает к асфальтированным дорогам и улицам	19 480	1 900 бел. руб. р/с 3600314090013 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04002, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	1 917 053	2 806 830	—	17.12.2008 г. в 15.00	11.12.2008 г. до 17.30
2.	Земельный участок с кадастровым номером 221200000001000136, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Сущево, площадь 0,6985 га	Земельный участок для размещения кафе с площадкой для временной остановки автотранспорта. Срок аренды 50 лет.	Участок примыкает к асфальтированным дорогам и улицам на трассе Одесса — Санкт-Петербург	4 302 520	430 000 бел. руб. р/с 3600314090013 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04002, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	1 371 612	2 806 830	—	17.12.2008 г. в 15.00	11.12.2008 г. до 17.30
3.	Земельный участок с кадастровым номером 221287008601000033, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Комары , площадь 0,7403 га	Для размещения объекта придорожного сервиса (кафе, гостиничный двор, аптечный киоск, бильярдный зал, сауна, торговля розничная). Срок аренды 50 лет.	Расположен в восточной части д. Комары вблизи автомобильной дороги Витебск-Минск. Возможность подключения к сетям водо- электроснабжения, телефонной сети. Ограничения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В	3 000 450	300 000 бел. руб. р/с 3600314100017 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04002, получатель платежа: Новкинский сельский исполнительный комитет	2 091 842	2 806 830	—	17.12.2008 г. в 15.00	11.12.2008 г. до 17.30
4.	Земельный участок с кадастровым номером 221200000001000137, площадью 0,7095 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, площадь 0,7095 га	Для размещения складских помещений и гаража. Срок аренды 50 лет.	Возможность подключения электроснабжения, доступность автодорог международного и республиканского значения. Ограничения: земли находятся в водоохранной зоне и прибрежной полосе водоема	3 565 220	356 000 бел. руб. р/с 3600314110010 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04002, получатель платежа: Октябрьский сельский исполнительный комитет	1 531 649	2 806 830	—	17.12.2008 г. в 15.00	11.12.2008 г. до 17.30

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за земельный участок; возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, и расходы по подготовке документации, необходимой для его проведения; заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; получить в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок не превышающий 2-х лет; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. Местный исполнительный комитет не позднее 2-х рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за земельный участок, возмещения расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, с возмещением расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, заключает с ним договор аренды земельного участка.

Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды подлежат государственной регистрации.

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 32, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо должны подать заявление установленной формы об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования
- для представителей гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участка трижды и объявляет проданным земельный участок, а участника аукциона – победителем.

4. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на аукцион. Организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков, желающими принять участие в аукционе.

5. Победитель аукциона обязан оплатить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона и расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона вне зависимости от дальнейшей оплаты за земельный участок в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка. В случае если Победитель аукциона в установленный срок не внес плату за земельный участок, то внесенный победителем задаток и оплата расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возврату не подлежат.

6. Физическое лицо, ставшее победителем аукциона обязано представить справку налоговых органов об источниках денежных средств при совершении сделки на сумму, превышающую 2000 базовых величин.

7. Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» проводит 15-й открытый аукцион объектов республиканской собственности 30 декабря 2008 г.

Лот	Наименование объекта (местонахождение объекта, общая площадь (кв.м)	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Площадь отчуждаемого участка (га)
2	Здание казармы с крыльцами, военный городок № 65, г. Гомель (канализация, кабельная линия, тепловая сеть, водопровод, пристройка). Инв. № 65/1,1956 г.п., 719 кв.м	480 000 000	48 000 000	0,5021
6	Здание кафе с подвалом, военный городок № 76а, д. Новая Гожа Гродненского р-на, (асфальтобетонное покрытие, бортовой камень). Инв. № 76а/29, 1981 г.п. 638,2 кв.м	73 000 000	7 300 000	0,0847
9	Здание поликлиники, военный городок № 1 «Крепость» г. Бобруйск. Инв. № 1/39, 1840/1993 г.п. 652 кв.м.	1 406 220 000	140 622 000	0,2368
10	Здание контрольно-технического пункта, в т.ч. мастерские с асфальтовым мощением. Военный городок № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск. Инв. № 5/306, 177 кв.м	83 500 000	8 350 000	0,0386
11	Здание не отапливаемого гаража, в/г № 5 «Авиагородок» г. Бобруйск, (асфальтовое мощение). Инв. № 5/305, 1196 кв.м	160 000 000	16 000 000	0,2692
12	Здания: КПП (инв. № 1), АЗС (инв. № 6), склада ГСМ (инв. № 7), ограждение железобетонное (инв. № 8), асфальтобетонное покрытие (инв. № 9), ограждение деревянное на деревянных столбах (инв. № 10), ограждение деревянное на железобетонных столбах (инв. № 11), место для хранения угля (инв. № 12), кабельные линии электропередач в пласт. оболоч. (инв. № 13), наружные сети водопровода стл. (инв. № 14а), наружные сети водопровода чугун. (инв. № 14б), наружные сети связи в грунте (инв. № 15а), наружные сети связи в канализации (инв. № 15б), наружные сети канализ. чугун. (инв. № 18а), наружные сети канализ. керамические (инв. № 18б) в в/г № 96 «Чепино» г. Витебск	102 000 000	10 200 000	2,2441
1	Грузовой КАМАЗ-4310 ш. 0058463 дв. 44445, год выпуска – 1989, пробег – 99537 км, место нахождения – в/ч 06752, г. Минск, в/г Мачулищи	14 000 000	1 400 000	
3	Грузовой Краз-255Б1 ш. МО 712363 дв. 650545, год выпуска – 1991, пробег – 37 552 км, место нахождения – в/ч 48668 г. Ст. Дороги	19 100 000	1 910 000	
5	Грузовой КАМАЗ-43106 ш. 0006916 дв. 0783883, год выпуска – 1991, пробег – 102994 км, место нахождения – в/ч 48668, г. Ст. Дороги	12 000 000	1 200 000	
7	Автошасси КАМАЗ-43101 ш. 013459, дв. 0595774, 1989 г. выпуска, 54160 км пробега, войсковая часть 41780, г. Гродно	20 000 000	2 000 000	

Тип помещений: отдельно стоящие. Здания в аренде не находятся.

Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

15-й аукцион состоится в 11.00 **30 декабря 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 **24 декабря 2008 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 30 декабря 2008 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом до 10 января 2009 г., а недвижимого имущества до 30 января 2009 г. со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

По ранее проведенным торгам извещения публиковались в газете «Звязда» 1 и 20 декабря 2007 года, 26 июня, 6 августа, 12 сентября, 18 октября, 21 октября и 11 ноября 2008 года.

По ранее опубликованным извещениям в газете «Звязда» внести следующие изменения и дополнения:

Газета «Звязда» от 11 ноября 2008 г. (№ 212) **Победитель аукциона обязан п. 2 изложить в следующей редакции:**

2. Произвести оплату стоимости предмета аукциона (объекта) до 25 декабря 2008 г. и до 11 января 2009 г.

Суммы платежей определить по соглашению сторон.

Газета «Звязда» от 20 ноября 2008 г. (№ 219) после слов военного городка № 21 дополнить: г. Орша, ул. 2-я Шкловская.

Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05, 224 54 15.
Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.333 Індэкс 63850. Зак. № 6522. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Прыемна вабіць сваімі дагледжанымі фасадамі дамоў, акуратнымі агароджамі, а безумоўна, у першую чаргу сваімі аб'ектамі сацыяльнага прызначэння пасёлак Гарадзея, які месціцца на Нясвіжчыне. Ну зайдзіце, напрыклад, у мясцовы гатэль «Гарадзейскі фальварак»: па камфартабельнасці, па наборы паслуг, якія прапаноўваюцца тут, не саступіць ён многім сталічным гатэлям, нават самым тытулаваным. Тут вам і традыцыйныя кафэ з барам, і такія задавальненні, як саўна з більярдам, і паркінг, і інтэрнэт і да т.п. У Гарадзеі расказалі: сёлета ў Беларусі працавалі расійскія кіношнікі — дык вось, яны цалкам арандавалі «Гарадзейскі фальварак» цэлы месяц. Ды наказалі напаследак, што абавязкова прыедуць сюды і на наступны год. За многім з таго, што ёсць цікавага і прыгожага ў Гарадзеі, а можа — і ўвогуле за ўсім гэтым, стаіць Гарадзейскі цукровы камбінат.

1.

ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат»

КАБ ЗРАБІЦЬ НАША ЖЫЦЦЁ САЛАДЗЕЙШЫМ...

Аднак сёй-той пры гэтых словах можа здзівіцца: ды як быццам беларускія цукраварыя, у тым ліку, вядома, і гарадзейскія, некалькі гадоў таму амаль што загадалі доўга жыць... Гісторыя добра вядомая: нашы цукравары (усе разам, з чатырох існуючых у нас заводаў) навучыліся добра задавальняць апетыты айчыннага рынку (гэтыя апетыты складаюць прыкладна 350 тысяч тон цукру ў год), а «лішні» цукар адпраўлялі на экспарт, прычым пераважна на прыярытэтны для нас расійскі рынак.

Беларускі цукар стаў займаць на ім немалую долю, аднак не ўсім спадабалася гэта ў самой Расіі. Там наладзілі спецыяльнае расследаванне, а ў выніку, згодна з міжурадавым пагадненнем, устанавілі для нашых цукраваряў моцна ўрэзаныя, у параўнанні з ранейшымі экспартнымі пастаўкамі, так званыя квоты. Адпаведна, нашы цукравары пачалі катастрафічна затаварвацца... «А ўсё з-за таго, што складвалі ўсе яйкі ў адзін кошык», — больш дакладна абмаляваў усю гэту сітуацыю адзін са спецыялістаў Гарадзейскага камбіната.

Вось такая гісторыя. Як адчуваюць сябе на Гарадзейскім цукровым камбінаце цяпер (дарэчы, на яго долю прыпадае 30 працэнтаў усяго цукру, які вырабляецца ў Беларусі)? Звернемся да некаторых вынікаў работы прадпрыемства за апошні перыяд.

За 10 месяцаў гэтага года тэмпы росту аб'ёмаў прамысловай прадукцыі на Гарадзейскім камбінаце склалі 110,3 працэнта, прычым каля 80 працэнтаў сваёй прадукцыі гарадзейцы менавіта экспартавалі, зарабілі на экспарце (за 9 месяцаў) 54 мільёны долараў... Аднак вось які нечаканы паварот: менавіта той жа экспарт, па сутнасці, стаў асновай сённяшняга дабрабыту гарадзейскіх цукраваряў...

Зразумела ўжо, не ў адзін расійскі кошык складваюць цяпер яйкі на камбінаце. У пераліку яго цяперашніх замежных партнёраў — новыя партнёры з цэлага шэрагу краін: Казахстана, Узбекістана, Кыргызстана, Грузіі, Украіны... Многім у гэтых краінах даспадобы прыйшоўся беларускі цукар, і ў прыватнасці — гарадзейскі.

— Ужо трэці год працуем на рынках гэтых краін, і цэны там нармальныя, — зазначае намеснік дырэктара Гарадзейскага цукровага камбіната Вячаслаў Карпач. — Вялікую дапамогу ў выхадзе на рынкі гэтых краін аказалі супрацоўнікі нашага Міністэрства замежных спраў...

Што яшчэ маюць сёння ў сваім актыве гарадзейцы?

Асобнае месца ў паказчыках цукраваряў займаюць паказчыкі вытворчасці цукру з цукровых буракоў, або з уласнай сыравіны. Тут жа нагадаем: поўны пераход на выраб цукру з уласнай сыравіны (а яшчэ яго вырабляюць з завозімага ў краіну цукру-сырцу) абазначаны ў якасці стратэгічнай задачы ў Дзяржаўнай праграме «Цукар». За апошнія гады на камбінаце істотна нарасцілі выраб цукру менавіта з цукровых буракоў, прычым пачалі перапрацоўваць іх за сезон каля аднаго мільёна тон. У мінулым годзе гарадзейцы вырабілі цукру з цукровых буракоў каля 140 тысяч тон. Не меншымі чакаюцца вынікі і сёлета. Прычым сёлета ўжо другі год запар у Гарадзеі сезон перапрацоўкі адкрываюць з самага пачатку верасня, або на паўтара месяца раней, чым адкрывалі да гэтага...

— А як жа інакш, калі сельгасвытворцы гэтак падпіраюць, — гаварылі ў Гарадзеі.

Сапраўды — падпіраюць. Перад уездам на тэрыторыю камбіната доўжылася чарга машын, на самой тэрыторыі — шматлікія вялізныя бурты цукровых буракоў, або так званыя кагаты.

— Як справіцеся з гэтым валам? — пытаемся ў намесніка дырэктара Аляксандра Марчанкі, нашага гіда па прадпрыемстве.

— Ды тут яшчэ не так шмат, недзе 200 тысяч тон. А ўсіх буракоў мы павінны сёлета прыняць, а значыць — і перапрацаваць, не менш за мільён тон (дарэчы, сёлета сельгасвытворцы рэспублікі атрымалі адзін з самых рэкордных ураджаяў — больш за 3700 тысяч тон).

На камбінаце пры ўсім гэтым таксама зазначаюць: сельгасвытворцы краіны добра навучыліся вырошчваць цукровыя буракі, маюць у сябе ўсю неабходную высокапрадукцыйную тэхніку — трэба за імі паспяваць...

Варта ў сувязі з гэтым дадаць: на тыя ж цяперашнія багатыя ўраджаі цукровых буракоў няблага папрацавалі (працуюць і цяпер) і на самім камбінаце. Тут ёсць агранамічная служба, якая курыруе кожны раён, дзе вырошчваюць цукровыя буракі. Усяго ж у сыравінную зону камбіната ўваходзяць больш за 160 гаспадарак, размешчаных у розных раёнах і абласцях рэспублікі; асноўнымі пастаўшчыкамі цукровых буракоў, безумоўна, з'яўляюцца гаспадаркі Нясвіжскага раёна.

Звернемся яшчэ да некаторых лічбаў. Магутнасці цукровых камбінатаў вызначаюцца іх здольнасцю перапрацаваць пэўную колькасць цукровых буракоў за пэўны час, пры гэтым за пункт адліку звычайна бяруцца суткі. На пачатку сваёй дзейнасці Гарадзейскі камбінат перапрацоўваў за суткі 1,5 тысячы тон буракоў, сёлета тут перапрацоўваюць за суткі больш чым па 7 тысяч тон, у перспектыве ж задача — выйсці на 8 тысяч тон, у прыватнасці — да 2010 года.

* * *

Зразумела, такія магчымасці з'явіліся невыпадкова. Яны ў першую чаргу звязаны з маштабным тэхнічным абнаўленнем камбіната, якое зроблена на пачатку гэтага стагоддзя. Тут, у прыватнасці, уведзены новае мыйнае аддзяленне і новы прадуктовы цэх (як адзначаюць на камбінаце, гэта былі дзве самыя сур'ёзныя новабудоўлі), а таксама новае сокаачышчальнае, новае цукрасушыльнае аддзяленні...

Тэхнічнае абнаўленне, па сутнасці, закранула ўсе тэхналагічныя працэсы. Пры гэтым тут уведзена і зусім новая вытворчасць — па вырабе сухіх жамерынаў, якія з задавальненнем бяруць замежныя пакупнікі... Пра вынікі гэтага абнаўлення даволі красамоўна сведчыць такі факт: у цэхах камбіната практычна нельга ўбачыць людзей, іх можна сустрэць толькі на цэнтралізаваных пунктах кіравання ў якасці аднаго-двух аператараў. Зразумела, кантроль за ўсімі працэсамі ўзяла на сябе аўтаматыка. Яна прыйшла і ў сучасныя, належным чынам абсталяваныя лабараторыі камбіната, у якіх дакладна вызначаецца якасць сыравіны і ў першую чаргу яе цукрыстасць, а таксама якасць гатовага прадукту. Дарэчы, вызначэнне цукрыстасці буракоў — гэта, можа, адзін з самых напружаных момантаў ва ўзаемаадносінах перапрацоўшчыка і здатчыка сыравіны (ва ўсякім разе, так здалося нам), ад цукрыстасці ж залежыць цана гэтай самай сыравіны... «Ніякіх напружанняў — кожны можа сам праверыць «сваю» пробу», — адказалі на гэта ў сыравіннай лабараторыі.

Чарговы, адзін з буйнейшых аб'ектаў указанай рэканструкцыі ўвялі на камбінаце летась. Гэта — сілоса, разлічаная для бястарнага захоўвання 50 тысяч тон цукру. З яе ўводам гарадзейцы знялі з сябе нямала праблем. Да гэтага яны захоўвалі свой цукар, і асабліва падчас крызісу са збытам, практычна па ўсёй Беларусі, выдаткоўвалі на гэта немалыя грошы, а цяпер пакрысе вызваляюць чужыя склады.

2.

3.

Рэканструкцыя, па сутнасці, не закончылася тут і цяпер. Тыя, хто праязджаюць побач з камбінатам, безумоўна, не могуць не звярнуць увагі на прыгожае свежапафарбаванае збудаванне, якое размясцілася на яго «тылах».

— Гэта цяпер такое прыгожае, а было ў вельмі непрывабным выглядзе, па сутнасці развальвалася, пуставала нямала гадоў, — зазначыў Вячаслаў Карпач. — Гэта — збудаванне ранейшага насеннага завода, які некалі размяшчаўся тут. Але завода не стала, а яго збудаванне пакрысе і прыйшло ў заняпад. У канцы мінулага года перадалі яго нам, і мы поўнасцю аднавілі яго, а цяпер паскоранымі тэмпамі рыхтуем да эксплуатацыі. Тут ужо вельмі хутка, у канцы наступнага месяца, з'явіцца лінія па выпуску прасаванага цукру. (Варта ўдакладніць: цяпер на прадпрыемстве выпускаюць цукарпясок, які фасуецца ў 50-кілаграмовыя поліпрапіленавыя мяхі і аднакілаграмовыя папяровыя пакеты.) Тут таксама размесціцца наш маркетынг, а яшчэ мяркуем каля 12 тысяч тон цукру лажыць тут для захоўвання...

4.

5.

6.

На камбінаце таксама ўзводзяцца складскія памяшканні для цукру-сырцу на 25—30 тысяч тон з магчымым далейшым выкарыстаннем іх для захоўвання гатовай прадукцыі...

Такім чынам, з добрым аптымізмам глядзяць гарадзейскія цукраварыя ў перспектыву. Застаецца дапоўніць гэты раздзел яшчэ некаторымі фактамі. Яшчэ ў 2005 годзе сістэма менеджменту якасці прадпрыемства была атэставана на яе адпаведнасць патрабаванням стандартаў СТБ ISO 9001-2001, цяпер жа тут рыхтуюцца да атэстацыі па сістэме ХАСП, якая мае на ўвазе кіраванне бяспекай харчовых прадуктаў на аснове аналізу рызыкі і крытычных кантрольных кропак. «Гэта трэба рабіць у абавязковым парадку. Сёння мы трохі ізаляваныя ад рынку ЕС, але ж так працягвацца не будзе, у хуткім часе будуць падзвіжкі і ў яго бок. На гэтым жа рынку выкананне адпаведных патрабаванняў, якія гарантуюць харчовую бяспеку прадукту, — абавязковае», — падкрэсліваюць на прадпрыемстве... На Гарадзейскім камбінаце апошнім часам атэставана сістэма кіравання аховай працы, тут рыхтуюцца да атэстацыі па стандартах ISO серыі 14000, якія датычацца аховы навакольнага асяроддзя.

* * *

Дырэктар камбіната Міхаіл Крыштаповіч (дарэчы, сёлета ён стаў членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу) яшчэ падчас адной з ранейшых сустрэч, расказваючы пра гарадзейскае прадпрыемства, немалую ўвагу засяроджваў на сацыяльных аспектах, што звязаны з дзейнасцю такіх прадпрыемстваў. І асабліва тых, што размешчаны ў невялікіх населеных пунктах — такіх, як Гарадзея. У прыватнасці, размова датычылася з'яўлення так званых вольных людзей, або людзей, пазбаўленых магчымасці нармальна працаўладкавацца, адпачыць і г.д. «Там, дзе з'яўляюцца «вольныя людзі», з'яўляецца і спрыяльная глеба для крадзяжоў, крымінальных разборак, п'янства. І асабліва ў такіх малых пасёлках, як наш. Гэтага нельга дапускаць. Пры гэтым варта зусім пазбаўляць такіх людзей вольнага часу. Нават працуючых...»

І гэта з поспехам робяць у Гарадзеі. Ужо сам камбінат — для многіх добрае месца працы, свайго роду крыніца сямейнага дабрабыту (згодна са статыстыкай, кожны чацвёрты жыхар пасёлка працуе тут). Акрамя таго, на плошчах камбіната размясцілася заснаванае ім СП «Еўратарэкс», на якім займаюцца вытворчасцю поліпрапіленавых мяхоў. Гэтых мяхоў вырабляецца каля 20 мільёнаў у год, імі забяспечваюцца ўсе цукровыя камбінаты краіны, а разам з тым немалая частка прадаецца іншым прадпрыемствам. Але, хутчэй, галоўнае не гэта. Галоўнае ў тым, што ў выніку ў Гарадзеі забяспечылі дадатковымі працоўнымі месцамі каля 160 чалавек.

Яшчэ адна цікавая вытворчасць з'явілася на базе камбіната не так даўно. Гэта амаль што роднаснае ААТ «Валжан», у якім наладжана вытворчасць джэмаў, павідла, канфіцюраў і іншай кансерваванай прадукцыі. ААТ «Валжан» ужо вельмі хутка заявіла пра сябе сваёй «смачнай» прадукцыяй, завявала з ёй шэраг узнагарод з розных конкурсаў, пераважную частку яе экспартуе. А для самога камбіната, між іншым, выгадна ўжо тое, што адзін са спажыўцоў яго цукру — прама пад бокам. Аднак зноў-такі асобна вылучым тое, што на «Валжане» знайшлі для сябе працу каля 90 чалавек.

Пры камбінаце створана таксама фірма «АгроДело», якая аказвае паслугі гаспадаркам Нясвіжчыны ў вырошчванні цукровых буракоў, пераважна — паслугі па іх тэхнічным абслугоўванні. Дарэчы, камбінат прылажыў руку і да ўкамплектавання гэтай фірмы неабходнай тэхнікай...

«Пазбавіць вольнага часу нават працуючых»... Гэтай мэце добра служыць сацыяльная сфера, якая захавана на камбінаце практычна поўнасцю і фактычна знаходзіцца на яго ўтрыманні. Нас пазнаёмілі з аб'ектамі гэтай сферы намеснік дырэктара камбіната Аляксандр Марчанка і дырэктар Дома культуры прадпрыемства Вольга Захарэц.

Такім чынам, у распараджэнні як работнікаў камбіната, так і ўсіх гарадзейцаў — выдатны Дом культуры, стадыён, вялізная спартыўная зала, асобны пакой са спартыўнымі трэнажорамі, два плавальныя басейны (для дарослых і для дзяцей), сауны, зала з трыма більярднымі сталамі (і гэта яшчэ не ўсё), а таксама разнастайныя гурткі і секцыі, прычым нават секцыя па ўсходніх адзінаборствах. А футбольная каманда «Гарадзея», якая заснавана на базе камбіната, выступае нават на першынстве рэспублікі, у другой лізе... Не пустуюць спартыўныя залы

Намеснік дырэктара камбіната Аляксандр МАРЧАНКА: «Сацыяльнаму развіццю на прадпрыемстве ўдзяляецца не меншая ўвага, чым вытворчай дзейнасці».

з басейнамі, не пустуе Дом культуры, у якім работнікі камбіната і мясцовыя жыхары адзначаюць усе святы, нават Ілью з Купаллем (тым больш і мастацкая самадзейнасць — свая ж), а ў хуткім часе побач з гэтымі аб'ектамі павінен з'явіцца Дом урачыстасцяў (месца для яго ўжо адведзена, і там ідуць адпаведныя работы). Вышэй ужо гаварылася пра мэту такога сацыяльнага прапанавання — на камбінаце разам з тым маюць на ўвазе яшчэ адну мэту: затрымаць у пасёлку моладзь, якая можа з'ехаць у Мінск, мець тут добрую базу для папаўнення прадпрыемства рабочымі кадрамі. Шчыра кажучы, што датычыцца нас (пасля таго, што мы ўбачылі і пачулі ў Гарадзеі), нам хацелася б з'ехаць у яе. З Мінска.

* * *

Тое, што сельгасвытворцы добра навучыліся вырошчваць цукровыя буракі, здымаюць у апошнія гады выдатныя ўраджаі, вядома, радуе цукраваряў краіны, а разам з тым дастаўляе дадатковы клопат. Нават пры цяперашніх магутнасцях Гарадзейскага камбіната не паспявае ён пры перапрацоўцы цукровых буракоў укладвацца ў аптымальныя тэрміны. А гэтыя аптымальныя тэрміны, зазначалі на прадпрыемстве, складаюць каля 100 дзён, не болей, прычым у Еўропе сваю сыравіну перапрацоўваюць за 80—85 і нават меней дзён, у Расіі за 95, у Гарадзеі ж — больш чым за 100 дзён. Перавышэнне ж аптымальных тэрмінаў прыводзіць да зніжэння якасці сыравіны, развіцця ў ёй працэсаў дысбактэрыёзу, асабліва пры рэзкіх перападах плюсавых і мінусавых тэмператур, і ў канчатковым выніку да зніжэння выхаду з яе цукру, словам — да страт. У гэтых адносінах на камбінаце асабліва нядобрым словам прыгадваюць пазалеташні год, калі ўжо ў лістападзе прыйшлі моцныя маразы, а потым слупок тэрмометра пераскокнуў на плюс...

Намеснік дырэктара камбіната Вячаслаў КАРПАЧ: «Галоўнае — не спыняцца ў развіцці, тады будуць і дасягненні».

На Гарадзейскім камбінаце звярнуліся па адпаведную дапамогу да навукі. Якраз падчас нашага візіту сюды тут праходзіла нарада з удзелам замежных вучоных і прадстаўнікоў цукровых прадпрыемстваў рэспублікі на тэму: «Вопыт прымянення ў ЕС і краінах СНД адаптаваных нана- і электрамагнітных тэхналогій у харчовай перапрацоўчай прамысловасці і сельгасвытворчасці». Зрэшты, справа на Гарадзейскім камбінаце не абмяжоўваецца толькі размовай: тут, з удзелам спецыялізаванага нямецка-расійскага інстытута, з якім заключаны адпаведны дагавор, пайшлі на эксперыментальную апрацоўку сваіх кагатаў з буракамі магнітным полем. Калі гэта дасць вынік, адпаведны вопыт распаўсюдзяць і на астатнія цукровыя камбінаты. «Вядома, гэта цягне за сабой дадатковыя выдаткі, але яны цалкам апраўданыя. Няхай мы атрымаем і адмоўны вопыт, але ж любы вопыт вучыць», — зазначаюць у Гарадзеі.

Застаецца толькі пажадаць гарадзейскім цукраварам удачы, а яшчэ лепш — пазбегнуць непрыемных кліматычных выпрабаванняў. Да месца будзе сказаць тут, што сёлета па колькасці перапрацаванай сыравіны ў адносінах да мінулага года ў Гарадзеі амаль на 100 тысяч тон плюсуюць.

Яшчэ адна з праблем, якую тут называлі, — засмечанасць сыравіны каменнем. Пра тое, што пытанне тут, так сказаць, ёсць, гаспадаркам — здатчыкам сыравіны вельмі лёгка перакананца: на тэрыторыі камбіната амаль побач з тымі ж бураковымі кагатамі — кучы каменя, якое было вывуджана з тэхналагічнага патоку сыравіны, падчас падачы яе на перапрацоўку, з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў (дарэчы, тут аднойчы «вывудзілі» і снарад). Ну, а каменне, вядома ж, не лепшым чынам садзейнічае нармальнаму праходжанню тэхпрацэсу. Што рабіць гаспадаркам? Не перамацваць жа ўсе буракі запар... Напэўна, варта зрабіць так, як зрабілі ў гаспадарцы «1 Мая» Нясвіжскага раёна, дзе купілі спецыяльную каменеўборачную машыну, з дапамогай якой і пачалі прыбіраць цяпер свае палі.

* * *

Безупынна працуе сёння Гарадзейскі цукровы канвеер. Каб атрымаць той жа бялюткі цукар (а менавіта такі ў Гарадзеі і атрымліваюць, прычым ступенню белізны і вызначаецца якасць цукру, і ў першую чаргу якасць яго ачысткі), сыравіна павінна прайсці даволі доўгі і складаны шлях — мыйку, здрабненне, выцісканне соку, выпарванне і г.д. У Гарадзеі пры гэтым гавораць: «Мы ведаем, як зрабіць ваша жыццё саладзейшым».

І няблага робяць гэта.

Іван БАРАНОЎСКІ.

УНП 600031529

7.

8.

9.

На здымках:

1. Кагатныя палі прадпрыемства.

2. Аператар мыйнага аддзялення Аляксей БУЯН.

3. У мыйным аддзяленні камбіната.

4. Няспынна працуе цукровы канвеер камбіната.

5. Вядучы інжынер-тэхнолаг Ірына МЛЯВАЯ.

6. На складзе гатовай прадукцыі.

7. Вытворчасць па выпуску поліпрапіленавых мяхоў.

8. Дырэктар Дома культуры Гарадзейскага камбіната Вольга ЗАХАРЭЦ.

9. Заўсёды адкрыты для гасцей «Гарадзейскі фальварак».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.